# 1917

# 1941

## НА КРУТЫМ ПАВАРОЦЕ ГІСТОРЫІ

### Устанаўленне савецкай улады

У пачатку XX ст. у Расіі адбыліся тры рэвалюцыі: 1905—1907 гг., Лютаўская і Кастрычніцкая 1917 г. Першая толькі хістанула царскі трон, другая — яго наогул ліквідавала, а ў выніку трэцяй — утварылася новая дзяржава з новай уладай. Вядома ж, ні адна з гэтых рэвалюцый не прайшла без удзелу слаўгарадчан, хаця гэты ўдзел не быў аднолькавым. Калі падзеі 1-й расійскай рэвалюцыі закранулі ў асноўным Слаўгарад і яшчэ некалькі вёсак, а актыўных рэвалюцыянераў можна было пералічыць на пальцах, то абедзве наступныя ўскалыхнулі самыя шырокія пласты працоўных і сялян. Рэвалюцыі вылучылі з народнага асяроддзя шмат бальшавіцкіх прыхільнікаў, якія хутка і самі стануць у рады ленінскай партыі, рашуча выступяць супраць самадзяржаўя, а пасля яго звяржэння ўзначаляць барацьбу за ўсталяванне савецкай улады на месцах.

Гэта іх намаганнямі, а ў шэрагу выпадкаў і жыццём, усталёўвалася на Слаўгарадчыне ўлада працоўных і сялян. Як вядома з гістарычных крыніц, зроблена гэта было пазней, чым у іншых месцах Магілёўшчыны. Гэта тлумачыцца знаходжаннем у Магілёве Стаўкі Вярхоўнага галоўнакамандуючага царскай арміі, а ў Быхаве пад вартай сядзелі былы галоўкаверх Л.Г.Карнілаў і яго іншыя паплечнікі па жнівеньскаму (1917) контррэвалюцыйнаму мяцяжу, якія потым уцяклі з-пад варты. У дадатак да ўсяго са жніўня 1917 г. у Быхаве была раскватаравана 1-я дывізія польскага корпуса генерала Ю.Р.Доўбар-Мусніцкага.

Усё гэта з'ўлялася вельмі значнымі перашкодамі на шляху ўсталявання савецкай улады ў нашых мясцінах. Але дзякуючы намаганням працоўных, сялян і рэвалюцыйна настроеных салдат яны былі паспяхова пераадолены.

20 лістапада 1917 г. рэвалюцыйныя атрады ліквідавалі ваенную стаўку ў Магілёве, а яе галоўнакамандуючы — царскі генерал М.М.Духонін, змяніўшы на гэтай пасадзе генерала Л.Г.Карнілава, быў узяты пад варту. У той жа дзень у Магілёў з Быхава прыйшла тэрміновая тэлеграма, у якой начальнік гарнізона генерал Астаповіч паведаміў, што ў мінулую ноч з быхаўскай турмы ўцяклі генералы Карнілаў, Дзянікін і іх паплечнікі па мяцяжы і разам з Тэкінскім палком, які вартаваў арыш-

таваных, накіраваліся на поўдзень. Як толькі стала вядома аб гэтым, раз'юшаны натоўп салдат напаў на вагон, у якім утрымліваўся пад вартай Духонін, і жорстка расправіўся з генералам.

Праз тры дні пасля гэтых падзей выканком Магілёўскага губернскага Савета запатрабаваў вывесці з тэрыторыі Быхаўскага павета польскія войскі. 24 лістапада з Магілёва ў Быхаў прыбыў з браняпоездам прадстаўнік рэвалюцыйнай стаўкі бальшавік С.І.Марозаў. Ён распусціў земскую ўправу, стварыў рэўком і ўзначаліў яго. Пад кіраўніцтвам рэўкома ў валасцях праходзілі перавыбары сялянскіх камітэтаў, арганізоўваліся мясцовыя Саветы. У студзені 1918 г. Магілёўскі губвыканком паведаміў у Петраград, што «ёсць Саветы ва ўсіх паветах і мястэчках». У Слаўгарадзе, які адміністрацыйна ўваходзіў у склад Магілёўскай губерні як валасць Быхаўскага павета, савецкая ўлада ўсталявалася ў канцы лістапада 1917 г. і адразу моцна стала на ногі. Паводле ўспамінаў С.Ц.Сарокіна, тут акрамя валаснога выканкома, старшынёй якога стаў А.Ц.Шэкаў, былі створаны два сельскія Саветы — на Зароўскай і Кухарскай частках мястэчка. Першы ўзначаліў Ілья Рыцікаў, другі — Аўхім Шуміла. Дзейнічалі і іншыя мясцовыя Саветы. У мястэчку і вёсках пачаліся першыя сацыялістычныя пераўтварэнні.

У лютым 1918 г. войскі кайзераўскай Германіі і польскія часці Ю.Р.Доўбар-Мусніцкага зноў пайшлі ў наступленне. Перад пагрозай акупацыі камітэт РСДРП(б) і рэўком Быхаўскага павета аб'явілі горад на ваеннаасадным становішчы і звярнуліся да насельніцтва з заклікам уступаць у чырвонагвардзейскія атрады, абараняць ад ворага маладую Рэспубліку Саветаў.

На гэты заклік адгукнуліся і слаўгарадчане. Першымі з іх у арганізаваныя павятовым ваенкаматам атрады запісаліся Васіль Авечкін, Лазар Буракоў, Ілья Гаўрылаў, Ягор Лісіцын, Змітрок і Ілья Макаравы, Фёдар Няміленцаў і іншыя. Ваенна-масавая работа актывізавалася ў Слаўгарадзе і вёсках воласці, калі ў пачатку сакавіка 1918 г. у мястэчка пераехаў з Быхава рэўком на чале з С.І.Марозавым. У гэты час паводле загаду рэвалюцыйнай стаўкі Марозаў узна-



Камандны склад 6-й прапойскай роты.

чаліў губернскі штаб аб'яднаных чырвонагвардзейскіх атрадаў. А старшынёй рэўкома становіцца А.Ц.Шэкаў. Як толькі ўсталяваліся на новым месцы, рэўком сумесна з павятовым ваенным камісарыятам прадоўжыў фарміраванне ўзброеных атрадаў. Іх касцяком станавіліся былыя салдаты царскай арміі.

Паводле загаду № 1 па ваеннаму аддзелу Быхаўскага павятовага выканкома, толькі за перыяд з 7 красавіка па 13 мая 1918 г. добраахвотна пайшлі служыць у такія атрады 90 нашых землякоў. Фарміраванне і ўзбраенне чырвонагвардзейскіх атрадаў лічылася адной з галоўных задач павятовага рэўкома. І яна паспяхова выконвалася. Толькі ў ліпені — жніўні 1918 г. са Слаўгарада былі накіраваны на Усходні фронт грамадзянскай вайны 2 атрады — звыш 300 чалавек, а ў верасні — на Паўднёва-Заходні фронт маршавая рота ў складзе 200 байцоў.

Шмат папрацавалі рэўкомаўцы, каб летам 1918 г. сарваць план нямецкіх захопнікаў, распрацаваны імі разам з украінскімі нацыяналістамі, па прымусовым адрыве неакупіраванай часткі Магілёўшчыны ад Беларусі і яе далучэнні да гетманскай Украіны. Члены рэўкома арганізавалі і правялі ў вёсках Прапойскай, Баханскай і іншых валасцей павета мітынгі пратэсту, на якіх сяляне выказваліся супраць нямецка-украінскіх намераў і заяўлялі, што прызнаюць толькі ўладу рабочых і сялян у асобе Расійскай Федэратыўнай Рэспублікі.

Падобным чынам выказалі свае адносіны да варожых дамаганняў жыхары вёсак Завад-Віравая, Рудня, Васькавічы, Бахань, Новая Слабада і іншых. Многія з сялян на гэтых мітынгах выказвалі намер добраахвотна ісці ў рады Чырвонай Арміі і са зброяй у руках змагацца з унутраным і знешнім ворагам Савецкай Рэспублікі.

Паўсядзённы клопат павятовы рэўком праяўляў аб дзейнасці падпольных груп, што засталіся на правабярэжжы. А ў пачатку жніўня 1918 г. на партыйнай канферэнцыі падполь-




Святкаванне 1-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Прапойску. 8 лістапада 1918 г.

ных арганізацый акупіраванай часткі павета з мэтай паляпшэння кіраўніцтва падпольнай работай быў створаны падраённы камітэт РКП(б). Актыўны ўдзел у яго працы прымаў і слаўгарадчанін В.І.Лагуцёнак. Шэраг нашых землякоў сталі байцамі партызанскіх атрадаў, якія дзейнічалі ў варожым тыле.

Пасля адводу нямецкім камандаваннем сваіх войскаў з Быхава і правабярэжнай часткі павета 3 лістапада сюды ўвайшлі 152-і і 153-і чырвоныя палкі 17-й дывізіі. У сувязі з гэтым у Быхаве адбыўся мітынг з удзелам прадстаўніка Паўночна-Заходняга абласнога камітэта РКП(б) А.С.Славінскага і старшыні павятовага рэўкома А.Ц.Шэкава.

На адбыўшымся праз два дні пасяджэнні было неадкладна разгледжана пытанне аб аб'яднанні Быхаўскіх павятовага і падраённага партыйных камітэтаў. Павятовы камітэт РКП(б) узначаліў Петравіцкі, а райком — Шэкаў. Акрамя яго ў склад райкома ўвайшлі яшчэ 10 чалавек, у тым ліку нашы землякі С.Сарокін, В.Лагуцёнак і І.Феакцістаў. Рэўком загадам № 1 ад 5 лістапада 1918 г. абвясціў сябе (да склікання павятовага з'езда Саветаў) вярхоўнай уладай у павеце і намеціў меры па падтрыманні рэвалюцыйнага парадку ў горадзе і павеце.

Перад камітэтам РКП(б) і рэўкомам паўсталі задачы — як не дапусціць у павеце голаду, забяспечыць харчаваннем Чырвоную Армію, як перажыць зіму, падрыхтавацца да веснавой сяўбы і іншыя. Яны выраціліся на 1-й Быхаўскай павятовай партыйнай канферэнцыі, якая адбылася 18 снежня 1918 г. Канферэнцыя звярнула ўвагу на павышэнне ролі партыі ў справе ўмацавання ў павеце савецкай улады. У сувязі з гэтым былі пастаўлены задачы стварэння на месцах партыйных ячэек, павышэння актыўнасці валасных і вясковых камбедаў, дзе яны былі, і іх арганізацыі там, дзе яны яшчэ адсутнічалі. Канферэнцыя выбрала пастаянны партыйны камітэт, які ўзначаліў А.Ц.Шэкаў, і дэлегатаў на VI Паўночна-Заходнюю абласную партканферэнцыю. Яна адбылася ў апошнія дні 1918 г. у Смаленску і абвясціла сябе I з'ездам Кампартыі Беларусі. З'езд вырашыў пытанні аб стварэнні БССР і Кампартыі Беларусі, звярнуўся да працоўных, батракоў, сялян і салдат Чырвонай Арміі Беларусі з заклікам умацоўваць эканоміку рэспублікі, абараняць савецкую ўладу.

Выконваючы гэты заклік, Слаўгарадскі валасны і сельскія Саветы сумесна з камітэтамі беднаты бралі на ўлік памешчыцкія і панскія землі, гаспадарчы інвентар, вызначалі парадак іх раздзелу. У складаных умовах прыйшлося дзейнічаць Свенскаму камбеду на чале з былым вартаўніком памешчыцкага маёнтка Ф.Д.Сталівоненкам. Тут памешчык меў падтрымку вясковых кулакоў, пагражала камбедаўцам і банда, якая з'явілася ў навакольных лясах. Але, нягледзячы на ўсё гэта, камбед зрабіў сваю справу: маёмасць памешчыка, раскрадзеная кулакамі, была вернута назад і падзелена паміж беднатой. Рашуча дзейнічалі Баханскі, Чарнякоўскі і іншыя камбеды, але хутка ўсе яны спынілі сваё самастойнае існаванне і зліліся з мясцовымі Саветамі, выбары якіх праводзіліся ў перыяд падрыхтоўкі да I павятовага з'езда Саветаў. Гэты з'езд адбыўся 19 студзеня 1919 г. У яго рабоце ўдзельнічалі 110 дэлегатаў, 79 з іх прадстаўлялі ўсе 10 валасцей павета, астатнія 31 — рэўком, партячэйкі, прафсаюз, прамысловыя прадпрыемствы. З'езд ад імя ўсяго насельніцтва павета вітаў стварэнне БССР і выказаў падтрымку кіраўніцтву рэспублікі. Пасля гэтага дэлегаты разгледзелі шэраг неадкладных пытанняў і абралі вы-

канком з 15 чалавек. У яго ўвайшлі А.Шэкаў, А.Старасценка, Падольскі, С.Сарокін, Я.Красоўскі, Раманоўскі, В.Кавалёў, П.Кавалёў, Г.Кулакоў, К.Манжураў, І.Сакалоў, Сцефаненка, К.Дзем'яновіч, А.Салановіч, Ц.Сарокін. Абраны з'ездам выканком узяў на сябе ўсю паўнату адказнасці за стан спраў і жыцця павета.

Адразу ж пасля павятовага з'езда Саветаў яго дэлегаты ад Слаўгарадчыны С.Сарокін, І.Рыцікаў, А.Шуміла і іншыя наведалі прамысловыя прадпрыемствы, сельскагаспадарчыя камуны і арцелі, многія вёскі. Яны заклікалі насельніцтва накіраваць свае сілы на падрыхтоўку да веснавой сяўбы, умацаванне Чырвонай Арміі і савецкай улады. А навокал зноў збіраліся цёмныя сілы, каб яе задушыць, знішчыць маладую Рэспубліку Саветаў.

Карыстаючыся тым, што галоўныя сілы Чырвонай Арміі вялі гераічную барацьбу на Усходнім фронце супраць Калчака, а заходнія рубяжы Савецкай дзяржавы былі аслаблены, польскія войскі ў канцы лютага 1919 г. перайшлі да актыўных баявых дзеянняў і да сярэдзіны сакавіка захапілі Слонім, Пінск, Баранавічы, набліжаліся да Мінска. Адначасова з іншаземнымі інтэрвентамі выступіла і ўнутраная контррэвалюцыя. У Гомелі ўзняўся мяцеж, арганізатарам якога з'явіўся былы штабс-капітан эсэр Стракапытаў. Раніцай 24 сакавіка 1919 г. мяцежнікі абяззброілі гарадскую міліцыю, захапілі пошту, тэлеграф, друкарню. Стракапытаў абвясціў сябе «камандуючым 1-й арміяй Рускай Народнай рэспублікі». Пад яго камандаваннем было некалькі тысяч добра ўзброеных чалавек, якія ўяўлялі сабой вялікую пагрозу справе рэвалюцыі. Па ўказанні У.І.Леніна з Масквы на разгром стракапытаўцаў быў накіраваны бранепоезд і часці Бранскага і Смаленскага гарнізонаў. На дапамогу працоўным Гомеля ішлі таксама чырвоныя атрады з іншых месцаў, быў у іх ліку і атрад са Слаўгарада. Як успамінаў адзін з байцоў гэтага атрада А.В.Кавалёў, спатрэбіўся амаль тыдзень, каб падавіць мяцежнікаў у Гомелі. А тут, падбадзёраная стракапытаўцамі, ажывілася контррэвалюцыя ў Рагачове, Быхаве, Чавусах, ды і ў Слаўгарадзе было не вельмі спакойна. Узнялі галаву ўсе контррэвалюцыйныя элементы, якія з дня на дзень чакалі прыходу палякаў. Але яны не дачакаліся гэтага, у пачатку жніўня палякі былі спынены на лініі р. Бярэзіна.

26 красавіка 1919 г. у сувязі са скасаваннем Магілёўскай губерні Быхаўскі павет увайшоў у Гомельскую губерню, якая ў той час уваходзіла ў склад РСФСР. Такім чынам, разам з Быхаўшчынай у склад Расіі ўвайшла і Прапойская воласць. Хаця і адбыўся пераход павета ў другую рэспубліку, тым не менш ён зноў апынуўся ў прыфрантавой паласе. На гэты раз цалкам. Жыхароў Слаўгарадчыны часам да адчаю даводзілі мабілізацыі на фронт: то камуністаў, то камсамольцаў (арганізацыі і тых і другіх толькі пачалі паяўляцца ў воласці), то ўсіх, хто мог трымаць у руках зброю.

А чаго каштавалі мясцоваму насельніцтву рэквізіцыі! Вёскі, асабліва такія, як Папоўка, Лебядзёўка, Свенск, Рэкта і іншыя, якія знаходзіліся на бойкіх дарогах ці побач з імі, засталіся амаль без коней. Шмат пазабіралі ў іх і іншай жывёлы, гусей, курэй. Цяжка было і з хлебам: што самі людзі пааддавалі чырвонаармейцам, а тое, што зберагалася для сябе, часта забіралася пад маркай рэквізіцыі ці канфіскацыі хлебных лішкаў. Нярэдка «лішкамі» лічылася і насенне, якое селянін не чапаў нават тады, калі сям'я галадала. А яму казалі: «Вайна ўсё спіша». Але ж вайна не засее поле. Гэта добра ведаў мужык.

Восенню 1919 г. паявіліся на Слаўгарадчыне першая працоўная камуна ў Рэкце і арцель «Прапойская». Верагодна, тут адыгрывала сваю ролю і тое, што калектыўным гаспадаркам нават у цяжкіх умовах грамадзянскай вайны дапамагала дзяржава і насеннем, і тэхнікай, а аднаасобнікі часцей за ўсё заставаліся сам-насам. У пошуках выйсця адны з іх прыглядаліся да камун — як у іх пойдзе справа, другія звярталіся за парадай і дапамогай да кулакоў. У тых жа былі свае дарадчыкі. Яны ўсім раілі крыху пачакаць і рыхтавацца да расправы з Саветамі. А пакуль што адмаўляць у дапамозе Чырвонай Арміі, не ўдзельнічаць у камуністычных суботніках і іншых мерапрыемствах.

І тыя, у каго савецкая ўлада была косткай у горле, гэтак і рабілі. У 1920—1921 гг. у Баханскай, Прапойскай і іншых суседніх валасцях пракацілася хваля контррэвалюцыйных мяцяжоў. На барацьбу з імі былі кінуты партыйныя і савецкія актывісты валасцей, ахоўныя чырвонаармейскія роты, атрад на чале з селянінам з в. Ржаўка К.Я.Кураленкам. Пры падаўленні гэтых контррэвалюцыйных выступленняў загінулі мясцовыя актывісты Р.І.Нікіцін, А.П.Старасценка, І.І.Феакцістаў, П.А.Шмаянкоў.

На месца загінуўшых прыходзілі іншыя патрыёты і яшчэ з большай самаадданасцю вялі барацьбу за лепшую долю. Пасля заканчэння грамадзянскай вайны і ваеннай інтэрвенцыі жыхары Слаўгарадчыны актыўна ўключыліся ў будаўніцтва новага жыцця.

*П.С.Ерашэнка.*

## Гудзела плошча...

У адзін з апошніх дзён лістапада 1917 г. у Слаўгарадзе, на месцы, дзе цяпер разбіты гарадскі сквер, адбыўся мнагалюдны мітынг. З прамовамі выступалі бальшавікі — чырвонагвардзейцы, прыехаўшыя па заданні партыі ўстанаўліваць савецкую ўладу, рэвалюцыйныя маракі Балтыйскага флоту, нашы землякі Аляксандр Шэкаў, Кірыла Манжураў, Яўхім Халееў і іншыя. Яны заклікалі працоўных воласці браць уладу ў свае рукі, адчуваць сябе гаспадарамі зямлі.

Плошча гудзела. Адусюль нясліся крыкі: «Ура!», «Уладу — Саветам!», «Няхай жыве Ленін!».

Пасля мітынгу дэманстранты з плака-



Мітынг у Прапойску. 1918 г.

тамі і чырвонымі сцягамі прайшлі па вуліцах Слаўгарада. Земскі начальнік фон Бардзеліус, валасны старшына Іван Мажэй, урраднік Якаў Чарняўскі добраахвотна адмовіліся ад улады.

А яшчэ праз тыдзень пачалося стварэнне валаснога выканаўчага камітэта, партячэйкі, харчкома, а крыху пазней — камітэтаў беднаты. Першым старшынёй Слаўгарадскага валаснога выканаўчага камітэта быў абраны Аляксандр Шэкаў, сакратаром партячэйкі —Яўген Давыдаў. Харчком узначаліў Кірыла Манжураў, а пракурорам стаў Яўхім Халееў.

Паўсюдна арганізоўваліся сельскія Саветы. Галоўная іх увага сканцэнтроўвалася на ўмацаванні савецкай улады на месцах, на арганізацыі гандлю, забеспячэнні гарадоў і ў першую чаргу Чырвонай Арміі прадуктамі харчавання.

Неацэнную паслугу гэтай справе зрабілі ў той час камітэты беднаты і харчком.

У той жа час ствараліся спецатрады па барацьбе з бандытызмам. Адзін такі атрад узначальваў падпаручнік царскай арміі Міхаіл Гарэлікаў, які адразу перайшоў на бок рэвалюцыі.

Усюды праходзілі сходы працоўных, на якіх бальшавікі растлумачвалі палітыку партыі і савецкай улады, заклікалі падтрымліваць рэвалюцыю і рашуча выступаць супраць сабатажнікаў і іншых падрыўных элементаў.

Крок за крокам усё станавілася на сваё месца. Нягледзячы на грамадзянскую вайну, сяляне імкнуліся лепш выкарыстаць зямлю, адабраную ў памешчыкаў, паступова пачалі ўступаць у строй нацыяналізаваныя прадпрыемствы мясцовай прамысловасці.

Працоўныя станавіліся гаспадарамі свайго лёсу.

*Ф.Ф.Старахазяеў.*

## Вярнуліся франтавікі

### З успамінаў Я.І.Драйчука

У канцы 1917 г. з Піцера ў в. Ржаўка вярнуліся нашы землякі-матросы Рыгор Лахтычкін, Архіп Каржоў, Іўка Бурдзіла, Ягор Прачкін. Вярнуліся франтавікі з іншых родаў войскаў.

Многія з іх прымалі ўдзел у Кастрычніцкай рэвалюцыі, яны выступалі супраць царызму. Ім даводзілася чуць прамовы і заклікі бальшавікоў. Таму адразу былыя франтавікі пачалі растлумачваць аднавяскоўцам, хто такія У.І.Ленін і бальшавікі, чаго яны хочуць для бедных сялян. Асабліва актыўнымі агітатарамі за савецкую ўладу сталі матросы. У вёсцы ў той час збіраліся сходы, на якіх прысутнічалі старыя бальшавікі. Часта прыязджаў да нас І.І.Феакцістаў — вядомы змагар за савецкую ўладу на Слаўгарадчыне. Мне запомнілася выступленне на адным са сходаў матроса Рыгора Лахтычкіна.

— Таварышы! Скончыўся час прыгнёту! Мы цяпер гаспадары ўсяго: і нашай зямлі, якую палівалі потам, і гэтага лесу, куды не дазваляў нам заходзіць памешчык Брадніцкі, і гэтага лугу. Усё наша, — гаварыў ён і заклікаў неадкладна браць усё ў свае рукі.

У пачатку 1918 г. быў створаны Ржаўскі сельскі Савет. Яго першым старшынёй абралі былога франтавіка Данілу Якаўлевіча Каржова. Шмат было работы першым Саветам. Тут і зямельныя пытанні, і барацьба з варожымі элементамі. Адной з важных задач была арганізацыя чырвонагвардзейскіх атрадаў з мясцовых жыхароў.

Як і ў іншых вёсках, у Ржаўцы падзялілі памешчыцкую зямлю паміж беднымі сялянамі. Жыццё стала наладжвацца. Была адкрыта ў вёсцы школа, у якой сталі вучыцца ўсе дзеці школьнага ўзросту. Пачалося новае жыццё.

## Зямля — сялянам

На тэрыторыі Быхаўскага павета канфіскацыя памешчыцкіх зямель была пачата адразу ж пасля перамогі Кастрычніка. 29 лістапада 1917 г. Магілёўскі ваенна-рэвалюцыйны камітэт выдаў загад аб перадачы ў распараджэнне зямельных камітэтаў памешчыцкіх маёнткаў, указваў на неабходнасць арганізаваць улік жывога і мёртвага інвентару. Быхаўскі зямельны камітэт распачаў вопіс і раздзел маёнт-

каў. Аднак эсэры, якія вяршылі справы ў зямкоме, па сутнасці праводзілі фіктыўную канфіскацыю, фактычна пакідаючы маёнткі ў руках іх былых уладальнікаў. Працоўнае сялянства Быхаўскага павета рашуча змагалася супраць такой «канфіскацыі». Па патрабаванні сялян Журавіцкі зямельны камітэт нанава правёў улік і вопіс памешчыцкай маёмасці маёнтка Хатоўня, якая была перададзена новаму ўпраўляючаму са згоды сялян навакольных вёсак. Для аховы маёнтка былі прызначаны два кантралёры.

Канфіскацыя маёнткаў звычайна пачыналася са склікання агульнаваласных сялянскіх сходаў. Сходы стваралі спецыяльныя ўліковыя камісіі, і тыя праводзілі вопіс памешчыцкай маёмасці, вызначалі парадак раздзелу зямлі. Так, сходы прадстаўнікоў вёсак Студзёнка, Гарадзец, Залатва і Лубянка прапанавалі вызначыць у кожнай вёсцы колькасць беззямельных сялян, якіх неабходна ў першую чаргу надзяліць зямлёй з маёнткаў Славінскага і Рубанава. Пры размеркаванні зямлі і ўсіх угоддзяў была ўстаноўлена норма 2,5 дзесяціны на рабочую душу і 1 дзесяціна на нерабочую. Усяго вясной 1918 г. у Быхаўскім павеце на неакупіраванай тэрыторыі было раздзелена больш як 30 тысяч дзесяцін зямлі.

Адначасова з пытаннем размеркавання зямлі бальшавіцкія арганізацыі займаліся забеспячэннем беднякоў інвентаром. Для вясковай беднаты гэта пытанне было вельмі важнае, таму што большасць сялян уласнага інвентару не мела, а значыць, зноў магла трапіць у кулацкую кабалу.

Каб лепш забяспечыць бяднейшае сялянства інвентаром, у павеце стварылі 10 пракатных і 4 зернеачышчальныя пункты, куды было сабрана 120 сельскагаспадарчых машын і прылад. Пункты абслугоўвалі ў першую чаргу калектыўныя і бядняцкія гаспадаркі. Адначасова ішло размеркаванне жывёлы з панскіх маёнткаў, ствараліся племянныя расаднікі. У павеце к вясне 1918 г. было арганізавана 5 расаднікаў. Для правядзення сяўбы бяднейшаму сялянству выдавалася насенне. Былыя панскія маёнткі, што яшчэ нядаўна былі цэнтрамі эксплуатацыі і прыгнечання сялян, ва ўмовах пралетарскай дзяржавы ператвараліся ў апорныя пункты калектыўнага гаспадарання і культурнай рэвалюцыі ў вёсцы. У маёнтках адкрываліся школы, народныя дамы, бібліятэкі.

1918 г. быў годам пачатку арганізацыі калектыўных гаспадарак — першых парасткаў сацыялізму. У архіве збярогся пратакол нарады зямельных работнікаў ад 1 верасня 1918 г., дзе запісана рашэнне: «Даручыць павятоваму зямельнаму аддзелу ўвайсці з хадайніцтвам у аддзел земляробства Заходняй Камуны аб камандзіраванні ў павет інструктара-камуніста для арганізацыі ў межах павета камуністычнай гаспадаркі» (Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці. Ф. 79. Воп. 1. Спр. 4. Л. 7). Спачатку калектыўныя гаспадаркі ствараліся на левабярэжнай частцы павета, а ў канцы года, пасля выгнання нямецка-польскіх акупантаў, і на правабярэжжы.

Працоўнае сялянства на ўласным вопыце пераконвалася ў неабходнасці пераходу ад дробных гаспадарак да буйной грамадскай вытворчасці. У вёсцы нараджаліся новыя, нябачаныя ў гісторыі грамадства формы гаспадаркі — саўгасы, камуны, арцелі, таварыствы па сумеснай апрацоўцы зямлі і іншыя кааператыўныя аб'яднанні сялян. Да правядзення веснавой пасяўной кампаніі 1919 г. у Быхаўскім павеце рыхтаваліся 12 саўгасаў, арцелей і камун...

Для ажыццяўлення прынятых рашэнняў павятовы партыйны камітэт паслаў у вёску бальшавікоў-арганізатараў. Вось што запісана ў адным з рашэнняў: «Камандзіраваць у павет інструктара-камуніста для арганізацыі ў межах павета камунальных гаспадарак, бо насельніцтва павета, ідучы насустрач, само не ў сілах іх арганізаваць». (Тамсама. Ф. 79. Воп. 1. Спр. 4. Л. 7.) У Даўгамошскую воласць былі пасланы бальшавікі Іосіф Агапеевіч Марозаў, былы член палкавога камітэта, і Архіп Уласавіч Гваздзёў. Апошні ў 1917 г. з'яўляўся членам Петраградскага Савета...

Арганізацыя, станаўленне і работа калектыўных гаспадарак праходзілі пад увагай павятовага зямельнага аддзела. Улічваючы неабходнасць каардынацыі ўсёй работы пры павятовым земаддзеле, быў створаны камунальны пададдзел, які ўзначалілі Цімафей Іванавіч Сарокін і

Аляксандр Мацвеевіч Шылкоў. Пададдзел і яго кіраўнікі праводзілі вялікую арганізацыйную, растлумачальную і агітацыйную работу...

Перад пачаткам палявых работ 1919 г. у г. Ромны быў накіраваны член калегіі павятовага земаддзела Т.Ф.Цімашкоў, якому было даручана закупіць і даставіць у Быхаўскі павет коней для савецкіх гаспадарак. Для закупкі коней, насення гародніны ў Палтаўскую губерню быў камандзіраваны Ц.І.Сарокін. 25 тыс. руб. на закупку на Украіне насення было асігнавана Быхаўскаму павятоваму ўпраўляючаму савецкімі гаспадаркамі Н.Н.Буйноўскаму.

Калектыўныя гаспадаркі паспяхова правялі сельскагаспадарчую кампанію, дамагліся добрых вынікаў. Напрыклад, калі ў сялянскіх гаспадарках павета ўраджайнасць збожжавых склала 50 пудоў з дзесяціны, то ў калектыўных — звыш 100 пудоў. Прыклады самаадданай працы ў камунах і арцелях паказвалі камуністы.

У канцы 1919 г. былі створаны працоўная камуна імя Свярдлова ў маёнтку Іскань і працоўная камуна ў маёнтку Рэкта, працоўныя арцелі «Зара» ў в. Кузькавічы, «Араты» ў мястэчку Журавічы, «Прасвета» ў Новым Быхаве, арцелі «Прапойская», «Прамень», «Праца» ў Грудзінаўскай воласці.

Для лепшага кіраўніцтва саўгасамі павета ў лістападзе 1919 г. была створана калегія райсаўгаса, у якую ўвайшлі У.Е.Кавалёў (старшыня), С.А.Мышкевіч (тэхнічны кіраўнік), Нікіцін і Марозаў (члены ад павятовага земаддзела). Інструктарам па саўгасах была прызначана Ганна Нікіціна. Зямельнаму аддзелу было прапанавана перадаць райсаўгасу ўсе машынапракатныя станцыі і зернеачышчальныя пункты з усёй іх маёмасцю...

Ажыццяўленне Дэкрэта аб зямлі, арганізацыя першых калектыўных гаспадарак далі пачатак будаўніцтву сацыялізму ў вёсцы.

*Друкуецца са скарачэннямі па кн.: Памяць. Быхаўскі раён. Мн., 1990. С. 95—97.*

## Дакументы сведчаць

### З ЗАГАДУ № 1 ПА ВАЕННАМУ АДДЗЕЛУ БЫХАЎСКАГА ПАВЯТОВАГА ВЫКАНКОМА

**13 мая 1918 г.**
**м. Прапойск**

Солдат, поименованных в прилагаемом списке в числе 90 человек, явившихся в течение времени от 7 апреля по 14 мая сего года добровольно служить в рядах Советского отряда, зачислить на провиантское и приварочное довольствие и на денежное довольствие со дня поступления в отряд.

Список

1. Тихон Анищенко, 2. Федор Авраменко, 3. Федосий Боженков, 4. Герасим Берзов, 5. Мирон Бондарев, 6. Иван Басс, 7. Денис Бозылев, 8. Иван Ботовкин, 9. Федор Бураков, 10. Тимофей Борисенко, 11. Захар Бельченко, 12. Никита Воловик, 13. Кузьма Васильков, 14. Григорий Власевич, 15. Григорий Грасенков, 16. Кузьма Голущенков, 17. Александр Гращенков, 18. Иван Грапов, 19. Тимофей Гуторов, 20. Николай Дроздов, 21. Григорий Гранщиков, 22. Афанасий Дмитрочков, 23. Василий Доненков, 24. Сигизмунд Доминиковский ... 31. Федор Исаенко, 32. Степан Исаенко, 33. Иван Исаенко, 34. Антон Иванцев, 35. Михаил Ковалев, 36. Василий Котов, 37. Борис Кипиц, 38. Захар Косьяненко, 39. Петр Крепкин, 40. Викентий Кобушко, 41. Вениамин Лисичкин, 42. Иосиф Логутенков, 43. Тимофей Луферов, 44. Аким Марченко, 45. Григорий Манжуров, 46. Сергей Малиновский, 47. Петр Мельников, 48. Петр Максаков, 49. Максим Мажугов, 50. Игнатий Мушиц, 51. Дмитрий Макаренко, 52. Петр Мельников, 53. Давид Муштуков, 54. Федор Пундер...

**Ад рэдактара-складальніка.** Першыя дзевяноста былі толькі першымі. Папаўненне чырвонаармейскіх радоў працягвалася і ў чэрвені, ліпені і нават у жніўні, калі ў сялян самая гарачая пара. Напрыклад, у загадзе ад 26.8.1918 г. былі імёны яшчэ 7 чалавек, якія выказалі жаданне служыць у Чырвонай Арміі. Гэта Доўгушаў Якаў, Дзмітрачкоў Павел, Луфераў Антон, Каршукоў Гаўрыла, Шмітуленка Андрэй, Ісаеў Стафан, Баглоў Фама. Яны, гэтыя першыя дзесяткі

і сотні чырвонаармейцаў, з'явіліся касцяком, асновай той рашучай сілы, якая адыграла асноўную ролю ва ўстанаўленні савецкай улады на Слаўгарадчыне.

## ПРАТЭСТ ГРАМАДЗЯН ВЁСКІ ВІРАВАЯ ПРАПОЙСКАЙ ВОЛАСЦІ БЫХАЎСКАГА ПАВЕТА СУПРАЦЬ СПРОБ ДАЛУЧЭННЯ НЯМЕЦКІМІ ІМПЕРЫЯЛІСТАМІ МАГІЛЁЎСКАЙ ГУБЕРНІ ДА ГЕТМАНСКАЙ УКРАІНЫ[1]

**9 чэрвеня 1918 г.**

Обсудив вопрос о притязании на насильственное отторжение немецко-украинскими империалистическими властями прифронтовых частей нашей Могилевской губ., единогласно постановили: протестовать против присоединения к Украине, по воле немцев получившей самодержавный образ правления, ненавистный нам.

Мы всегда готовы идти рука об руку с трудовыми братьями-украинцами при замене ныне существующего государственного строя в Украине чисто демократическим правлением крестьян и рабочих.

Заявляем, что мы поддерживаем и признаем только власть рабочих и крестьян в лице Российской Советской Федеративной Республики.

Да здравствует Советская власть!

Да здравствует социалистическая революция!

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 59. Спр. 3. Л. 13.*

## ПАВЕДАМЛЕННЕ ГАЗЕТЫ АБ БАРАЦЬБЕ СЯЛЯН БЫХАЎСКАГА ПАВЕТА З ГЕРМАНСКІМІ АКУПАНТАМІ І МЕРАПРЫЕМСТВАХ ПА АДНАЎЛЕННІ САВЕЦКАЙ УЛАДЫ Ў ПАВЕЦЕ

Под властью поляков и немцев. Террор. Контрибуция и обложение. Восстание крестьян. Очищение левой стороны Днепра. Соединенный уезд. Расстроенное хозяйство. Уцелевшее добро. Борьба со спекуляцией.

Территория нашего Быховского у. с начала января и до половины марта переходила два раза к полякам и немцам. Длительное хозяйничанье польских легионов и немецких банд совершенно расстроило хозяйственную и политическую жизнь уезда и привело к полнейшему обнищанию.

Все ценное, как бывших помещичьих имений, так и крестьянских хозяйств, главным образом продовольствие и фураж, было увезено польскими легионерами. С помощью помещиков и «социал-предателей», до покорения края прикрывавшихся социализмом, прочно утвердившаяся в уезде советская власть была разогнана: советские и партийные деятели (большевики и левые эсеры) арестовывались и подвергались смертным казням, жестоким избиениям шомполами, приговаривались временно-полевыми судами к долгосрочной каторге и тюремным заключениям. По отношению к остальному трудовому населению был установлен страшный террор: расстреливались и сжигались целиком отдельные селения с людьми, независимо от пола и возраста, и их имуществом. Царили поголовное избиение и непомерные обложения. На крестьянское население была наложена контрибуция. В течение трех дней каждая волость обязана была внести польским властям под страхом избиения, двойного обложения и штрафа в 5 тыс. рублей — 5 тыс.п.ржи, 3 тыс.п.овса, 1 тыс.п.ячменя, 4 тыс.п.гречихи, 5 тыс.п.картофеля, 1 тыс.п.сена, 4 тыс.штук яиц, а также представить 7 лошадей, 40 коров и 3 гуся. Свиное сало совершенно отнималось. Кроме того, установился налог на окна, двери, кур, собак, кошек и прочий домашний скот. Введена была барщина: крестьяне в восстановленных помещичьих имениях должны были бесплатно два дня в неделю выполнять хозяйственные работы.

На защиту от польского и немецкого хозяйничанья и гнета возмущенное крестьянское население поднялось поголовно. Навстречу наступавшим польским регулярным отрядам выступило не только взрослое население, но даже дети, наспех формировались партизанские отряды, из соседних неоккупированных уездов прибыли отряды Красной Армии. И, наконец, к началу апреля по левую сторону р. Днепра половина Быховского и Рогачевского у. была очищена от непрошеных гостей, правый же берег реки остался и до настоящего времени оккупированным.

---

[1]Падобныя рэзалюцыі былі прыняты на сходах грамадзян вёсак Рудня, Васькавічы, Новая Слабада і іншых.

Немцами польские легионы разоружены, но установившиеся от начала оккупации вражеские порядки там остались неизменными и по сие время. Исстрадавшееся оккупированное население в любой час готово подняться и выступить на защиту своих попранных прав и ждет не дождется прихода на помощь Красной Армии изнутри республики.

…Освободившись от насильников, крестьянское население левого берега Днепра, 10 волостей Быховского и Рогачевского у. образовало у себя один соединенный уезд, именуя его Быховским, и 26 апреля в спешном порядке сконструировало уездный Совет крестьянских, рабочих и солдатских депутатов с установлением административного центра в м. Пропойск.

Приняв власть в соединенном уезде и ведя беспощадную борьбу с контрреволюционными элементами, самочинными реквизициями, конфискациями и грабежами, Совет стал приводить расстроенное хозяйство в порядок, налаживать политический строй и подводить итоги наличности всего того, что осталось после произвольного хозяйничанья немецко-польских банд и разбойничьих шаек. Хаос, неразбериха царствовали повсюду: как хищные вороны выползали контрреволюционеры и вносили смуту и разлад между населением и партизанскими отрядами, восстанавливая как тех, так и других против Советов и Советского правительства.

В первое время строительства, в трудные дни смуты, разрухи и разложения в населении нам, немногим защитникам революции и ее завоеваний, принявшим власть в свои руки, некогда было думать о материальном положении края, а потому все силы были направлены главным образом к восстановлению революционных завоеваний и советского строя.

Наладив с этой стороны жизнь уезда созданием волостных Советов и затем подведя итоги всему уцелевшему от разграбления народному имуществу, Советы нашли, что в уезде не все еще расхищено. Оказалось уцелевшим до 15 тыс.п.льняного семени и до 12 тыс.п.пеньки. Часть этого товара, закупленного спекулянтами, но вовремя задержанного Советами, не имея на месте сбыта, подвергается порче; местные же торговцы порываются вывезти его за пределы демаркационной линии и для сбыта в Германию, соблазняя население обещаниями дать ему взамен сельскохозяйственные орудия и машины и другие предметы массового потребления, которых в крае полное отсутствие.

Имея нужду в этих предметах, население склонно привести в исполнение предложение спекулянтов, и только несогласие и решительное запрещение уездного Совета на время остановило сбыт означенного сырья за пределы республики. Наряду с запрещением сбыта пеньки в пределы Германии Совет находит целесообразным вывоз их в центр республики.

*Известия исполнительного комитета Советов Западной области и Смоленского Совета рабочих, солдатских и крестьянских депутатов. 1918. 25 авг.*

## З ПАСЯДЖЭННЯ БЫХАЎСКАГА ПАВЯТОВАГА ВАЕНРЭЎКОМА

**2 ліпеня 1918 г.**

Присутствовали: председатель Увоенревкома тов. Пакетчиков, члены Е.Сорокин, Галкин.

Председательствует тов. Пакетчиков, секретарь тов. Галкин.

Слушали:

1. Телеграмму Пропойского предволкома от 30 июня за № 105 о появлении в районе Пропойской, Долгомохской, Баханской волостей бандитов, которые начинают… открыто терроризировать население…

Постановили:

1. Для ликвидации бандитизма и дезертирства в уезде 2 июля организовать отряд в 100 человек, выделив лучших тов. с отрядов Упродкомиссара, у милиции, комдеза, тербата и Коменданта 12 Этапа. Оперативную часть ликвидации бандитизма и дезертирства возложить на Увоенкома тов. Галкина и Комтербата. Командиром отряда назначить тов. Бритова, помощником его тов. Козлова. Отряд сформировать поручается тов. Галкину с Комтербатом, о количестве отряда и его выступлении дать точные сведения Увоенревкому, каковые продолжать давать ежедневно после выступления с отрядом на уезд. Просить Уком выделить немедленно не менее 10-ти человек коммунистов для влития таковых в отряд. Отряду выехать в район Пропойской, Долгомохской и Баханской волостей. Выяснить численность и боеспособность частей, находящихся в Уезде, и донести Увоенревкому. Отряд снабдить продуктами на 10 суток…

*Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці. Ф. 394. Воп. 35. Спр. 1. Л. 364.*

### ЗАГАД № 1 БЫХАЎСКАГА ПАВЯТОВАГА ВАЕННА-РЭВАЛЮЦЫЙНАГА КАМІТЭТА

**5 лістапада 1918 г.**

1. На основании постановления Могилевского губернского военревкома Быховский уездный военно-революционный комитет в составе тт. Шекова, Логутенка, Ковалева, С.Сорокина, Вераксо, Феактистова, М.Сорокина, Романова, Т.Сорокина, Е.Сорокина, Демьянова и Н.Француза объявляет себя временно (до созыва уездного съезда Советов) верховной властью уезда.

2. Все распоряжения и декреты центральной и местных советских властей объявляются законом, неисполнение которых влечет за собой предание военно-революционному суду вплоть до расстрела.

3. Уезд объявляется на военном положении. Гуляние разрешается до 18 часов (до 6 часов вечера). После означенного времени появляющиеся на улицах будут арестовываться и подвергаться штрафу.

Торговля как на рынке, так и в закрытых помещениях разрешается с 8 до 16 часов (до 4 час. вечера).

4. Торговля спиртными напитками безусловно воспрещается, тайное винокурение карается расстрелом.

5. Собрания без разрешения военревкома воспрещаются.

6. Всякие попытки контрреволюционных банд к выступлению, откуда бы они ни сходили, будут подавляться в корне.

7. Обыски, аресты и реквизиции производятся только по ордерам военревкома, всякие самочинные будут караться расстрелом.

8. В течение трех дней со дня опубликования сего приказа сдать всякое оружие и вещи, как-то: пулеметы, пулеметные ленты, бомбометы, бомбы, винтовки, патроны, шашки, револьверы, бинокли и седла военного образца волостным и уездным военревкомам.

Настоящий приказ входит в силу со дня его опубликования.

Быховский уездный военно-революционный комитет.

*Фотакопія загаду захоўваецца ў Быхаўскім гісторыка-краязнаўчым музеі.*

## Першы старшыня валвыканкома

Аляксандр Шэкаў ішоў на службу ў царскую армію. Праводзілі Сашу, як і многіх яго сяброў-слабадчан, родныя, знаёмыя. А потым пачалося цяжкае матроскае жыццё. І вось тут, на караблі, Аляксандр неяк па-іншаму зразумеў усё тое, што гаварыў яму дома «бунтаўнік» (так называлі ў вёсцы былога матроса Гарасіма Ніканавіча Чухарава, які некалькі гадоў адбываў катаргу, сядзеў у турме за ўдзел у рэвалюцыйным руху).



А.Ц.Шэкаў.

Было гэта пасля рэвалюцыі 1905 г. І хоць рэвалюцыйны рух быў падаўлены царскім самадзяржаўем, усё ж бунтарскі настрой панаваў, асабліва сярод маракоў. Аляксандр далучыўся да рэвалюцыйна настроеных маракоў і хутка заваяваў сярод іх павагу і давер'е.

Прайшлі тры гады матроскай службы. Аляксандр у форме марака прыехаў на пабыўку ў родную вёску Слабада. Кожны вечар збіраліся аднавяскоўцы ў хату да Шэкавых, каб паслухаць марака.

А ён расказваў аб тым, што перамога цара ў 1905 г. — гэта часовая перамога. Што трэба змагацца за лепшую долю, што толькі бальшавікі змогуць дапамагчы сялянам адабраць зямлю ў памешчыкаў і даць волю.

Чуткі аб тым, што марак прапагандуе ідэі бальшавікоў, дайшлі да мясцовых улад. Неўзабаве ў Слабаду з'явіўся ўраднік. Ён доўга дапытваўся ў жыхароў аб матросе, але аднавяскоўцы не выдалі земляка.

Зноў з'явіўся Аляксандр Шэкаў у Быхаўскім павеце пасля гістарычнага выстралу «Аўроры». Яго, бальшавіка, удзельніка рэвалюцыі, накіравала партыя сюды для ўстанаўлення савецкай улады. Неўзабаве ён становіцца старшынёй першага Прапойскага валаснога выканаўчага камітэта, а летам 1918 г. узначальвае Быхаўскі павятовы ваенна-рэвалюцыйны камітэт, які з-за акупацыі Быхава кайзераўскімі і польскімі войскамі размяшчаўся ў Слаўгарадзе.

З лістапада 1918 г. у Быхаве адбылося аб'яднанае пасяджэнне пераехаўшага са Слаўгарада Быхаўскага павятовага рэвалюцыйнага камітэта з падпольным паўстанцкім падрыхтаваным камітэтам. Ствараецца павятовы рэўком. Узначальвае яго Аляксандр Цярэнцьевіч Шэкаў. 5 лістапада ваенна-рэвалюцыйны камітэт выдаў загад № 1 аб тым, што ўся ўлада ў павеце пераходзіць у рукі народа.

Цяжкі гэта быў час. Побач з устанаўленнем савецкай улады трэба было арганізоўваць яе абарону. Вораг не драмаў, на кожным кроку стараўся нашкодзіць. Пад кіраўніцтвам Аляксандра Цярэнцьевіча Шэкава ваенрэўком дапамагаў Чырвонай Арміі, дзяліў памешчыцкую зямлю паміж беднякамі, ствараў першыя калектыўныя гаспадаркі, наладжваў гандаль, адкрываў бальніцы, школы, накіроўваў жыццё людзей у новае рэчышча.

*У.І.Шкірманкоў.*

## У бацькі былі надзейныя сябры

**З успамінаў Вольгі Аляксандраўны Шэкавай, дачкі А.Ц.Шэкава**

Мой отец Шеков Александр Терентьевич родился в 1883 г. в Белоруссии в селе Березовка (теперь называется Новая Слобода). Военную службу проходил в Финляндии в г. Хельсинки (Гельсенфорс). Служил моряком. Там же вступил в РСДРП.

В первую мировую войну активно участвовал в выдаче оружия для охраны порта (работал в порту слесарем).

В 1917 г. вступил в Компартию. Появился на родине. В 1918 г. при наступлении белых армий пришлось эвакуироваться, так как ему грозила смерть за его революционную работу. С 1918 г. по 1920 г. работал председателем Быховского уездного ревкома. Затем его перевели в Пропойск (Славгород) в районный комитет партии. Проработал там он года два. Последняя его работа в Белоруссии — председатель сельсовета. Знаю, что деревня та была рядом с д. Завад-Вировая. (Предполагается, что он был председателем Рабовичского сельсовета).

В 1925 г. переехал в Ленинград на жительство, где и умер в голодный блокадный год от инсульта в возрасте 58 лет.

* * *

Вольга Аляксандраўна ўспамінае і блізкіх сяброў свайго бацькі па барацьбе. Дае аб іх кароткія звесткі, успамінае тое, што захавала дзіцячая памяць. Гэта Кірыл Манжураў, аднавяскоўец Шэкава. Кірыл служыў у Хельсінкі, быў мараком. Удзельнік рэвалюцыйных падзей 1917 г., грамадзянскай вайны.

У канцы 20-х гадоў выехаў з сям'ёй на жыхарства ў Башкірыю.

Памятае і Мікалая Старасценку, таксама сябра свайго бацькі.

Успамінае і Карпа Кузьміча Лагуцёнка, марака, служыўшага ў Фінляндыі разам з Шэкавым. У 1918 г. вярнуліся на Радзіму. Перад вайной пражывалі ў Ленінградзе, жылі дружна, сябравалі не толькі самі, але і сем'ямі. Лагуцёнак працаваў на заводзе і ў блакаду памёр ад цынгі.

Пётр Юр'евіч Булаўкін родам са Слаўгарада, як піша Вольга Аляксандраўна, «личность весьма уважаемая. Человек с волевым характером, бесстрашный, смелый, умный, очень образованный.

Окончил институт и Военно-морскую академию. Начитан. По его рассказу (мне): он в детстве сбежал из дому на пароход и прошел всю лестницу от юнги до высшего эшелона военной специальности. В первую мировую войну был на фронте, попал в плен, бежал. Учился, работал до второй мировой войны. В 1941 г. послан в Кронштадт (он инженер). В Отечественную войну дошел до Германии. После войны жил в Москве. Умер в 1968 г.»

## Жыццё, аддадзенае рэвалюцыі

Раман Іванавіч Нікіцін (Котаў) нарадзіўся ў 1886 г. у Слаўгарадзе. Хлапчуком Раман бачыў, як яго бацька шукаў выпадковую працу па рамонце печаў, комінаў у дамах мясцовых багацеяў. З дзяцінства Раман стаў працаваць на кафельным заводзе Ганчарова на розных дапаможных работах, зарабляў 8—15 капеек за 12-гадзінны рабочы дзень. Потым працаваў фармоўшчыкам на кафельным заводзе ў Кіеве. Беднасць і работа па найме з дзіцячых гадоў не далі магчымасці вучыцца. У сувязі з крывавай расправай 9 студзеня 1905 г. у Пецярбургу і ўспыхнуўшай рэвалюцыяй, што ахапіла ўсю Расію, рабочыя кафельнага завода, якіх у той час было звыш 70 чалавек, прынялі актыўны ўдзел у рэвалюцыйных падзеях у Кіеве. Яны ўдзельнічалі ў мітынгах, масавых дэманстрацыях, спявалі рэвалюцыйныя песні.

За ўдзел у рэвалюцыі 1905—1907 гг. Р.І.Нікіцін быў арыштаваны і сасланы на 5 гадоў у Сібір. Пасля адбыцця ссылкі яго мабілізавалі ў царскую армію. У жніўні 1917 г. ён быў салдацкім дэпутатам 136-га запаснога палка ў г. Рослаўль.

Пасля вяртання з арміі вясной 1918 г. у Слаўгарад прымаў удзел у выгнанні палякаў, у арганізацыі савецкай улады ў многіх вёсках Прапойскай воласці. Выступаў на мітынгах, сходах, арганізоўваў камітэты беднаты і сельскія Саветы.

Р.І.Нікіцін быў членам РСДРП(б). У ліпені 1918 г. ён з'яўляўся дэлегатам V Усерасійскага з'езда Саветаў. Разам з іншымі дэлегатамі з'езда Р.І.Нікіцін удзельнічаў у ліквідацыі мяцяжу левых эсэраў у Маскве. Вярнуўшыся са з'езда, вёў растлумачальную работу сярод насельніцтва, расказваў аб арганізацыі Чырвонай Арміі, 1-й Канстытуцыі Савецкай дзяржавы, прынятай з'ездам. У студзені 1919 г. як член рэўкома Раман Іванавіч удзельнічаў у рабоце Быхаўскага павятовага з'езда Саветаў.

Вясной 1920 г. з пачаткам новага этапу грамадзянскай вайны на тэрыторыі прыфрантавога Быхаўскага павета контррэвалюцыйныя элементы арганізавалі мяцеж у Баханскай, Бычанскай, Прапойскай і Даўгамохскай валасцях. Як член Быхаўскага павятовага выканкома і член калегіі павятовага зямельнага аддзела Нікіцін у гэты час знаходзіўся ў Даўгамохскай воласці, дзе праводзіў работу па падрыхтоўцы да веснавой сяўбы. Тут ён быў схоплены кулакамі, па-зверску забіты і кінуты пад лёд у рэчку Раста. Гэта здарылася 20 мая 1920 г. Імем Р.І.Нікіціна названы вуліца і завулак у Быхаве.

## Верны сын Радзімы

Ілья Ільіч Феакцістаў нарадзіўся ў 1895 г. у Слаўгарадзе. З ранняга дзяцінства прывучыўся ён да цяжкай сялянскай працы, бачыў і разумеў гаротнае становішча працоўных. Яго юнацкае сэрца поўнілася нянавісцю да самадзяржаўя, да ўсіх тых, хто жыў чужой працай.

Восенню 1915 г. Феакцістаў датэрмінова прызываецца ў армію. Ішла першая сусветная вайна. Аднак Ілья Ільіч нядоўга заставаўся на фронце. Праз год яго дэмабілізавалі па стане здароўя.

Год акопаў не прайшоў дарэмна. Ён стаў для салдата добрай палітычнай школай, адкрыў вочы на многія з'явы. Але самы моцны ўплыў на фарміраванне светапогляду І.І.Феакцістава зрабіў яго старэйшы брат Дзмітрый, які ўступіў у партыю бальшавікоў яшчэ ў 1908 г.

Працаваў Дзмітрый у Петраградзе. Ён дапамог і брату ўладкавацца на адно з прадпрыемстваў. Там жа, у Петраградзе, у ліпені 1917 г. Ілья Ільіч становіцца членам РСДРП(б), прымае ўдзел у падрыхтоўцы Кастрычніцкага ўзброенага паўстання. Пасля перамогі бальшавікоў працуе ў Вышэйшым савеце народнай гаспадаркі.

У красавіку 1918 г. Ілья Ільіч па заданні партыі прыехаў у Беларусь у якасці агітатара і трапіў у свой родны кут. Першым яго крокам было ўстанаўленне сувязей з мясцовымі камуністамі. З іх дапамогай ён арганізоўвае партызанскія атрады на Быхаўшчыне для барацьбы з палякамі, якія акупіравалі ўсё левабярэжжа Дняпра. Пешшу Ілья Ільіч абыходзіць дзесяткі вёсак Прапойскай і Баханскай

валасцей, выступае на мітынгах і сходах сялян. Пры яго непасрэдным удзеле праводзіліся выбары дэлегатаў на валасныя і павятовыя з'езды Саветаў.

Цяжкі гэта быў перыяд. Частка Быхаўскага павета па-ранейшаму была акупіравана палякамі, паўсюдна паявіліся банды, узнялі галовы кулакі. У такіх умовах у Прапойску адбыўся агульны сход камуністаў Быхаўскага павета. На гэтым сходзе быў створаны павятовы камітэт партыі. У склад яго ўвайшоў і Ілья Ільіч Феакцістаў.


І.І.Феакцістаў.

Неўзабаве ў Слаўгарадзе адбыўся павятовы з'езд Саветаў. На з'ездзе Феакцістаў выбіраецца членам павятовага выканкома і прызначаецца намеснікам старшыні павятовай надзвычайнай камісіі. Разам са старшынёй гэтай камісіі А.П.Старасценкам ён праводзіць вялікую работу па выгнанні з мясцовых органаў савецкай улады эсэраў, меншавікоў, па барацьбе з контррэвалюцыйнымі элементамі.

І.І.Феакцістаў і член павятовага камітэта РКП(б) П.П.Лагуцёнак двойчы (у верасні і кастрычніку 1918 г.) пабывалі на акупіраванай частцы павета, дзе наладжвалі сувязі з падпольнымі арганізацыямі камуністаў, аказвалі ім практычную дапамогу.

Пры актыўным удзеле І.І.Феакцістава арганізоўваецца Быхаўскі ваенна-рэвалюцыйны камітэт. Як член гэтага камітэта Ілья Ільіч праводзіць работу па арганізацыі савецкай улады на вызваленай тэрыторыі. Ён з'яўляўся дэлегатам першага Быхаўскага аб'яднанага з'езда Саветаў, які адбыўся 10 студзеня 1919 г., выбіраўся членам павятовага выканкома, працаваў членам калегіі Быхаўскай павятовай асобай харчовай камісіі.

У гэты час маладая Савецкая Рэспубліка вяла цяжкую барацьбу супраць унутраных і знешніх ворагаў. Большасць камуністаў Быхаўскай павятовай партыйнай арганізацыі пайшлі ў Чырвоную Армію і былі накіраваны на Заходні фронт. Нягледзячы на дрэнны стан здароўя, пайшоў на фронт і Феакцістаў. Ён быў палітработнікам 47-й стралковай дывізіі Заходняга фронту.

У студзені 1920 г. Ілья Ільіч захварэў на тыф. Пасля лячэння ў шпіталі атрымаў дадатковы водпуск і прыехаў у Слаўгарад. Загінуў 11 сакавіка 1920 г. у час падаўлення кулацкага мяцяжу ў Быхаўскім павеце.

## Матрос з «Багатыра»

У Данілы Максімавіча і Марыі Сафронаўны Шпакавых, сялян з в. Віравая, было шмат дзяцей. Кірыла — самы старэйшы, — нарадзіўся ў 1895 г. З самага дзяцінства некалі яму было любавацца навакольнай прыгажосцю, трэба было рабіць нароўні са старэйшымі ў полі, каб сям'я магла зводзіць, як кажуць, канцы з канцамі. Ды ўсё адно не меў спакою хлопец. У вольную хвіліну выбягаў на Проню, а там ужо нібы і забываўся пра ўсё, гледзячы, як гоняць лес плытагоны, як не-не ды пратрубіць які-небудзь рэдкі параходзік маладым, нібы неакрэплым голасам.

Аднойчы не вытрымаў і заявіў бацькам: «Паеду ў Быхаў, на параход уладкуюся». Хоць і цяжка было адпускаць сына, але ж хто з бацькоў не хоча, каб дзеці пабачылі свету, пабылі «на людзях», тым больш што ў Шпакавых падніманіся меншыя і падмогі па гаспадарцы большала.

Так стаў Кірыла матросам парахода. Ніхто ўжо зараз не раскажа, куды хадзіў ён на параходзе, ці бачыў мора. Можна толькі адно думаць: службу нёс спраўна.

З архіўнай даведкі:

«Призван на военную службу Быховским по воинской повинности присутствием Могилевской губернии 18 мая 1915 г.; 10 сентября 1915 г. прибыл на Балтийский флот и зачислен 19 сентября 1915 г. в 1-й Балтийский флотский экипаж с прикомандированием на период строевого обучения 2-му Балтийскому флотско-



К.Д.Шпакаў.

му экипажу, откуда в ноябре 1915 г. назначен в артиллерию Приморского фронта Морской крепости императора Петра Великого (Ревель); 10 октября 1917 г. зачислен в Морскую стрелковую команду БФ как прибывший из 47-й батареи Моазундской укрепленной позиции; 11 ноября направлен в распоряжение командира крейсера «Богатырь» БФ, где проходил службу до марта 1918 г. матросом».

... Крэйсер «Багатыр» — адзін з крэйсераў рэвалюцыі. Ён удзельнічаў у лядовым паходзе караблёў Балтыйскага флоту з Рэвеля ў Гельсінгфорс 25—27 лютага 1918 г. і з Шальсінгфорса ў Кранштат 12—17 сакавіка 1918 г.

Мэта паходу была рэвалюцыйная. 28 студзеня 1918 г. у Фінляндыі пачалася рабочая рэвалюцыя. Рэвалюцыйны ўрад перадаў зямлю сялянам, нацыяналізаваў банкі. 1 сакавіка таго ж года быў заключаны дагавор паміж Савецкай Расіяй і Фінляндскай сацыялістычнай рабочай рэспублікай аб дружбе.

На дапамогу маладой рэспубліцы і прыйшла новая Расія, хоць і самой было горача ад унутраных і знешніх ворагаў.

Але фінская контррэвалюцыя з дапамогай германскіх войскаў задушыла рабочую рэвалюцыю, якая праіснавала ўсяго некалькі месяцаў.

Пасля цяжкіх марскіх баёў крэйсер «Багатыр» вярнуўся ў Кранштат.

У другой палове сакавіка 1918 г. матрос Кірыла Шпакаў звольніўся ў запас, прыехаў у родную вёску.

З успамінаў яго брата Цімафея Данілавіча Шпакава.

— Калі вярнуўся ў вёску Кірыла, мне не было яшчэ і дзесяці гадоў, але ўжо сёетое разумеў. Помню, з якой радасцю насіў падораную мне бесказырку з лентай, на якой было напісана «Багатыр». Запомнілася, як цягнуліся да яго аднавяскоўцы, колькі было розных роспытаў. Сходкі праходзілі то ў нашай хаце ледзь не да дасвецця пры вялікай гамане, то ў чыёй другой, а часцей на вуліцы. І ўсё абмяркоўвалі, якім будзе новае жыццё, якія даброты прыйдуць да людзей. Брат больш гаварыў аб тым, што новай уладзе патрэбны людзі мужныя, стойкія, што само па сабе ўсё не прыйдзе, што за зямлю, хлеб трэба змагацца ўсім разам, што не трэба шкадаваць жыцця, каб не самім, дык дзецям жылося вольна і хораша.

Смела аб усім гаварыў, не баяўся, што навокал было нямала бандытаў, розных непрымянцаў савецкай улады. Пабыў дома няшмат, а потым зноў паехаў. Куды? Толькі спагадзя, мабыць, праз год даведаліся, калі атрымалі дакументы, адзенне, грошы. Загінуў наш Кірыла.

...А Кірыла Данілавіч Шпакаў 19 жніўня пайшоў на добраахвотную ваенную службу і быў, як сведчыць архіўная даведка, «залічаны ў Марскі атрад пераходзячых камандаў Балтыйскага флоту; 20 кастрычніка 1920 г. прызначаны на форт Краснафлоцкі, дзе значыўся па 8 сакавіка 1921 г. на пасадзе палітрука 4-й батарэі».

Сакавік 1921 г. у гісторыі вядомы Кранштацкім паўстаннем. Тады частка гарнізона і крэпасці, экіпажы караблёў Балтыйскага флоту выступілі супраць палітыкі «ваеннага камунізму» пад лозунгамі: «Уся ўлада Саветам, а не камуністам!», «Саветы без камуністаў!» У падаўленні гэтага паўстання і загінуў К.Д.Шпакаў.

З даведкі Цэнтральнага Дзяржархіва ВМФ СССР: «...Шпакаў Кірыла Данілавіч на лістапад 1920 г. значыцца ў спісах камуністаў. Партбілет № 893834 (дата ўступлення ў партыю не значыцца)».

*К.Кудлаеў.*

## Дзям'янка-ардэнаносец

Так, ён застаўся Дзям'янкам да апошняга свайго дня. Дзям'янкам клікалі, калі быў хлапчуком, Дзям'янкам звалі, калі стаў дарослым, ажаніўся і нажыў вялікую сям'ю. Відаць, тое ласкавае матчына слова, што так добра дапасавалася да яго асобы, прыйшлося да спадобы людзям і спадарожнічала яму ўсё жыццё. І хоць Дзям'ян Макаравіч Емяльянаў чалавек сур'ёзны і паважаны ў вёсцы, але па бацьку яго называлі толькі, можа, у афіцыйных абставінах.

Нарадзіўся Дзям'ян Макаравіч Емяль-

янаў у вёсцы Ляцягі ў 1891 г. у бядняцкай сям'і. Па мерках таго часу вяскоўцы лічылі яго грамацеем. А яшчэ Дзям'яна Макаравіча адрознівала ад іншых тое, што быў ён у вёсцы адзіным ардэнаносцам. Людзі з павагай і нават з добрай зайздрасцю глядзелі на гэтага чалавека: ідзе Дзям'янка-ардэнаносец. Ён жа нешта на вайне зрабіў такое, што вызначыла яго з ліку іншых!

Цікава было даведацца, як і за што ён атрымаў узнагароду. Чалавека гэтага я асабіста ведаў, бачыў яго часта. Мне асабліва падабалася глядзець на фатаграфію, якая вісела ў рамцы на сцяне. На ёй Дз.М.Емяльянаў быў зняты з ордэнам на лацкане пінжака. Я лавіў з дзіцячай цікавасцю кожнае слова пра гэтага чалавека, яго ордэн. А расказвалі вось што.

Гэта было ў грамадзянскую вайну. Войскі Чырвонай Арміі гналі польскіх акупантаў на захад, былі ўжо недалёка ад Варшавы. У гэтых баях удзельнічаў і Дзям'ян Емяльянаў, які прайшоў ужо дарогамі першай сусветнай вайны. Быў ён кулямётчыкам. У час аднаго з баёў чырвонаармейцы пярэдняга краю не вытрымалі націску праціўніка, пачалі адступаць. Некаторыя ў паніцы пабеглі. Емяльянаў жа з кулямётам застаўся адзін на пазіцыі. Яна была даволі выгадная, добра замаскіраваная. І Дзям'янка рызыкнуў уступіць у бой з наступаючым праціўнікам. Патронаў было дастаткова, вопыт меў таксама вялікі. А вораг, вырашыўшы, што перад ім няма ніякай сілы, смела рушыў у наступленне. Дзям'янка падпусціў ланцуг праціўніка на блізкую адлегласць. І тут «загаварыў» яго «максім». Вораг адступіў.

Калі падышлі байцы, то засталі Дзям'янку жывым і здаровым. Выціраючы рукавом пот з ілба, ён падняўся паглядзець на сваю «работу». Подступы да пазіцыі былі ўсланы трупамі.

Пра подзвіг Дз.М.Емяльянава сведчыць вось такі дакумент:

«Архивная справка № 54128 от 14.07.59 г.

В приказе РВС за № 353 от 31 декабря 1921 года указано, что награжден орденом Красного Знамени помощник командира пулеметного взвода тов. Емельянов Демьян Макарович за выдающуюся стойкость и доблесть, проявленную им в период наступательных боев за Варшаву и в последующих затем арьергардных боях».

Закончылася грамадзянская вайна. Дзям'ян Емяльянаў зноў у родных мясцінах. Адвечная сялянская цяга да працы, да зямлі клікала брацца за справу. І ён з маладой энергіяй бярэцца за справу. З вернай сяброўкай, спадарожніцай жыцця — жонкай Кацярынай Раманаўнай — дзеліць і радасць і гора. Яна стала яго памочніцай, надзеяй і апорай. Ішоў час. Нараджаліся і раслі дзеці. Па прыкладзе сваіх бацькаў яны былі працавітыя, ведалі цану кавалку хлеба, вучыліся любіць народ, працу, Радзіму.

Як толькі ў трыццатыя гады ў вёсцы арганізаваўся калгас «Чырвоны ўдарнік», Дзям'ян Макаравіч становіцца яго старшынёй. Ён неаднаразова выбіраўся дэпутатам Целяшоўскага сельскага Савета, а ў 1936 г. — Магілёўскага абласнога Савета.

У 1956 г. трагічна загінуў у роднай вёсцы.

*В.А.Драздоў.*

## Вогненныя гады

### З успамінаў Сяргея Лаўрэнцьевіча Сарокіна, былога сакратара Быхаўскага павятовага камітэта РКП(б), дэлегата I з'езда КП(б)Б

У студзені 1918 г. польскі корпус генерала Ю.Р.Доўбар-Мусніцкага аб'явіў вайну Савецкай Рэспубліцы. Апынуўся пад акупацыяй і наш Быхаўскі павет. Польскія легіянеры пачалі аднаўляць старыя парадкі, рабавалі насельніцтва, расстрэльвалі непакорных.

Камуністы, маракі і салдаты, вярнуўшыся з фронту, пры актыўным удзеле мясцовых жыхароў арганізоўваліся ў партызанскія атрады, разганялі і знішчалі конныя канвоі акупантаў, якія суправаджалі абозы з нарабаваным дабром.

У сакавіку — красавіку 1918 г. чырвонагвардзейскія атрады выгналі легіянераў з занятай імі левабярэжнай часткі Быхаўскага павета, і на гэтай тэрыторыі была адноўлена савецкая ўлада. Былі выбраны камітэты беднаты, сельсаветы, валасныя выканкомы ў Прапойскай, Даўгамохскай, Грудзінаўскай, Баханскай, Бычанскай, Журавіцкай валасцях. Выбраны таксама



С.Л.Сарокін.

Быхаўскі павятовы выканком, цэнтр якога знаходзіўся ў Слаўгарадзе, бо Быхаў быў заняты палякамі, а потым немцамі. Пачаў сваю дзейнасць Быхаўскі павятовы ваенны камісарыят.

Камуністы Аляксандр Шэкаў, Кірыла Манжураў, Ілья Феакцістаў, Пётр Лагуцёнак, Аляксей Старасценка, Раман Нікіцін, Пётр Булаўкін і іншыя на сходах і мітынгах у Слаўгарадзе і ў вёсках заклікалі працоўных уступаць у рады Чырвонай Арміі. У маі — чэрвені 1918 г. звыш 500 чалавек, у асноўным былых матросаў і салдат, добраахвотна пайшлі ў Чырвоную Армію. У арганізаваныя пры павятовым ваенкамаце атрады аднымі з першых добраахвотна ўступілі Яфім Шумілаў, Змітрок і Ілья Макаравы, Кузьма Старахазяеў, Піліп Гарэлікаў, Андрэй Шэдаў, Павел Сакалоў, Васіль Лагуцёнак, Лазар Буракоў, Фёдар Няміленцаў, Васіль Авечкін, Ягор Лісіцын, Фёдар Рыцікаў, Ілья Гаўрылаў, Яфім Халееў і іншыя.

Камплектаваннем добраахвотных атрадаў Чырвонай гвардыі, а пазней узводаў і рот Чырвонай Арміі ў павеце займаліся першы ваенны камісар Быхаўскага павета Якаў Красоўскі з сяла Бычы і ваенрук Міхаіл Гарэлікаў са Слаўгарада.

З добраахвотнікамі-чырвонаармейцамі праводзілася агітацыйна-масавая работа: раздавалася шмат газет, лістовак, адозваў, плакатаў і брашур на палітычныя тэмы, якія прывозіліся са Смаленска і Масквы. Амаль штодзённа ў памяшканні Быхаўскага павятовага камітэта РКП(б) у былым доме лесапрамыслоўца Цывіна (на тым месцы цяпер у Слаўгарадзе кінатэатр) праводзіліся мітынгі, лекцыі, гутаркі, калектыўныя чыткі газет, развучванне рэвалюцыйных песень «Смело товарищи в ногу», «Вихри враждебные», «Интернационал». Чырвонаармейцы гарнізона ў любы момант гатовы былі пайсці на фронт і са зброяй у руках абараняць Савецкую Рэспубліку. Толькі ў ліпені — верасні 1918 г. былі накіраваны на Усходні і Паўднёва-Заходні франты 2 атрады і маршавая рота агульнай колькасцю звыш 500 добраахвотнікаў-чырвонаармейцаў. Рота аховы, якая засталася ў Слаўгарадзе, а таксама новаарганізаваныя атрады добраахвотнікаў разам з партызанскімі атрадамі Кулікова (Абідавічы), Карпава (Ніканавічы), Дзергачова (Следзюкі), Ксяндзова (Сідаравічы) ахоўвалі граніцу па рацэ Днярпо і шашы Доўск — Магілёў ад набегаў польскіх і нямецкіх захопнікаў.

Той баявой восенню 1918 г. мне выпала шчасце быць дэлегатам VI Усерасійскага Надзвычайнага з'езда Саветаў ад Быхаўскага павета. Тады ўпершыню я бачыў Ільіча і чуў чатыры яго прамовы.

Вярнуўшыся з Масквы, я расказаў сваім таварышам аб выніках работы з'езда Саветаў, выступаў з дакладамі аб незабыўных сустрэчах у часцях Чырвонай Арміі і на мітынгах працоўных.

У другой дэкадзе лістапада 1918 г. мы прагналі акупантаў і з астатняй часткі павета. У Быхаве арганізавалі павятовы ваенна-рэвалюцыйны камітэт у складзе 12 членаў. Камітэт абвясціў сябе часова (да склікання павятовага з'езда Саветаў) вярхоўнай уладай у павеце.

Цяжка перадаць словамі, з якой энергіяй мы ўзяліся тады за арганізацыю савецкай улады ў павеце. Былі праведзены выбары сельскіх і валасных Саветаў. 10 студзеня 1919 г. у Быхаве адбыўся 1-ы аб'яднаны павятовы з'езд Саветаў.

* * *

Канец 1918 г. Доўга і цяжка дабіраўся я да Смаленска ў брудных цяплушках, у ледзяных тамбурах перапоўненых вагонаў. Там, у завейным Смаленску, у халоднай няўтульнай зале з ярка-чырвонымі плакатамі пачала работу VI Паўночна-Заходняя абласная канферэнцыя РКП(б), якая абвясціла сябе потым I з'ездам Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі. Памятаю нястрымную, акрыляючую радасць і буру апладысментаў, калі

было абвешчана: «З цяперашняга дня Беларусь — Савецкая Рэспубліка — становіцца рэспублікай працоўнага народа, рабочых, сялянскай беднаты і чырвонаармейцаў Беларусі». З'езд выбраў Цэнтральнае Бюро КП(б)Б. Тады ж быў утвораны і Часовы рабоча-сялянскі Савецкі ўрад Беларусі. У першы дзень 1919 г. мы раз'язджаліся са Смаленска. Дома нас чакалі вялікія неадкладныя справы, цяжкая барацьба. Маімі паплечнікамі былі незвычайныя людзі, смелыя, мужныя рэвалюцыянеры (прозвішчы іх я называў упачатку). Усе яны толькі нядаўна вярнуліся з фронту, усе былі перапоўнены жаданнем перабудаваць жыццё, разграміць контррэвалюцыянераў і інтэрвентаў. Па вёсках і хутарах прыталіліся кулакі і іншыя праціўнікі народнай улады. Праз два гады яны ўзнімуць паўстанне і жорстка расправяцца з бальшавікамі і актывістамі. У той час загінуць страшнай смерцю расстраляныя, распятыя, пасечаныя на кавалкі мае сябры Ілья Феакцістаў, Раман Нікіцін, Аляксей Старасценка. А ў тыя напружаныя дні 1918 — пачатку 1919 г. мы разумелі, што мала абвясціць Беларускую Савецкую Сацыялістычную Рэспубліку. Трэба было ўмацаваць яе, абараніць ад ворагаў, вырваць з учэпістых лап невуцтва, адсталасці, галечы. Адной з першачарговых задач нашага павяткома было ўмацаванне і папаўненне Чырвонай Арміі. Вялікія цяжкасці даводзілася нам пераадольваць. Але і вялікая энергія была ў нашых сэрцах.

## Дакументы сведчаць

### ПРАТАКОЛ ПАСЯДЖЭННЯ БЫХАЎСКАГА ПАВЯТОВАГА КАМІТЭТА РКП(б) АБ МАБІЛІЗАЦЫІ КАМУНІСТАЎ НА ФРОНТ

**14 кастрычніка 1919 г.**

Слушали: 1. Предложение губкома о мобилизации минимума 10 процентов коммунистов.

Постановили: Принимая во внимание, что в первую мобилизацию комитетом мобилизовано вместо пяти процентов пятьдесят процентов (63—31), что в настоящее время в организации насчитывается только 42 человека, постановили мобилизовать лишь 10 процентов из наличного числа.

При обсуждении кандидатов к мобилизации признали возможным мобилизовать следующих товарищей, уход которых не отразится на работе организации и кои принесут максимальную пользу фронту: Якименко Герасима, Савченко Андрея, Феоктистова Илью и Стефаненко Антона.

Ввиду отъезда председателя и секретаря на пленум губкома, выполнение сего постановления поручить делопроизводителю укома и военкому.

Председатель ЧК Старостенко. Члены: Кротов, Логутенок. Секретарь Ковалев

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 24. Л. 15.*

## ЧК дзейнічала рашуча

В начале июня 1920 года жители белорусского местечка Пропойск (ныне город Славгород Могилевской области) обратились к В.И.Ленину с телеграммой, в которой ставили главу Советского правительства в известность, что в окрестностях Пропойска орудуют банды мародеров и погромщиков, которые грабят население, и просили принять срочные меры по ликвидации бандитов. Эта телеграмма была немедленно направлена Ф.Э.Дзержинскому из Москвы в Харьков, где в это время находился его штаб. Получив ее, Феликс Эдмундович тотчас же по телеграфу отдал следующий приказ Гомельской губчека, начальнику западного сектора частей ВОХР и комбригу этих частей, расположенных в Гомеле: «Гор. Пропойск окружается бандитами и дезертирами, занимающимися избиением населения и погромами. Приказываю в 24 часа прекратить это безобразие, перестрелять бандитов. Исполнение мне донести». Приказ Ф.Э.Дзержинского был выполнен, и банды в окрестностях Пропойска и других районах Белоруссии были ликвидированы.

*Друкуецца па кн.: Хацкевич А.Ф. Солдат великих боев. Мн., 1982. С. 300.*

## Дэлегат V Усерасійскага з'езда Саветаў

Аляксей Пятровіч Старасценка нарадзіўся ў 1886 г. у сялянскай сям'і. У 1918 г. разам з іншымі салдатамі і матросамі змагаўся супраць польскіх і германскіх акупантаў на тэрыторыі Быхаўскага і Чэрыкаўскага паветаў. Быў дэлегатам V Усерасійскага з'езда Саветаў, які праходзіў у ліпені 1918 г. у Маскве. Разам з дэлегатамі-бальшавікамі прымаў удзел у ліквідацыі мяцяжу левых эсэраў у час работы з'езда.

Пасля выгнання польскіх інтэрвентаў з Быхаўшчыны Аляксей Пятровіч уключыўся ў работу па аднаўленні савецкай улады ў краі. У многіх населеных пунктах Бычанскай, Баханскай і Прапойскай валасцей ён выступаў на мітынгах, сходах, арганізоўваў камітэты беднаты, першыя сельскія Саветы. Пешшу пабываў у самых аддаленых вёсках, дзе агітаваў сялян за новае жыццё.

А.П.Старасценка быў членам Быхаўскага павятовага камітэта РКП(б), старшынёй Быхаўскай павятовай надзвычайнай камісіі, намеснікам старшыні Быхаўскага ваенна-рэвалюцыйнага камітэта. У студзені 1919 г. на 1-м аб'яднаным павятовым з'ездзе Саветаў выбраны намеснікам старшыні з'езда і членам павятовага выканкома.

Ворагі савецкай улады не раз замахваліся на яго жыццё. У ліпені 1920 г. бандыты захапілі хворага Аляксея Пятровіча і забілі яго каля в. Хляўно.

*В.Аляксандраў.*

## Веставы Пархоменкі

У хаце Рыгора Парфенавіча Самусева з в. Лапацічы ў рамцы вісіць партрэт героя грамадзянскай вайны Аляксандра Пархоменкі. Як дарагую рэліквію захоўвае былы чырвонаармеец партрэт свайго любімага камандзіра, старэйшага таварыша.

Вялікі Кастрычнік салдат Рыгор Самусеў сустрэў на турэцкім фронце. З першага дня 1-й сусветнай вайны ён знаходзіўся ў акопах, праліваў кроў «за веру, цара і бацькаўшчыну». За тры гады знаходжання пад кулямі заслужыў два Георгіеўскія крыжы.

Выбралі салдаты Рыгора сваім узводным, пагрузіліся ў вагоны і накіраваліся на радзіму. Але не давялося Самусеву тады дабрацца дамоў. У Гомелі эшалон спынілі, сказалі — трэба ваяваць.

Зноў узяў у рукі трохлінейку, зноў пайшоў на фронт. На гэты раз ваяваў за сваё шчасце, абараняў маладую Савецкую Рэспубліку. Куды толькі не закідвалі яго ваенныя дарогі грамадзянскай вайны. Нарэшце лёс звёў з Аляксандрам Пархоменкам.

Спадабаўся камандзіру дывізіі чарнявы беларус, яго разварот, кемлівасць, храбрасць. Выклікаў да сябе, прапанаваў:

— Маім пасыльным будзеш?

Як вялікую ўзнагароду ўспрыняў Рыгор такое давер'е легендарнага камандзіра. Хто ж адмовіцца быць памочнікам у Пархоменкі!

З таго часу і знаходзіўся Рыгор Самусеў пры Пархоменку. З даручэннямі камандзіра скакаў у роты, батальёны, перадаваў загады. Усялякае было. Не раз трапляў у такія пераплёты, што, здавалася, ніякага выйсця не было. Але, відаць, Рыгор Самусеў нарадзіўся пад шчаслівай зоркай. Не кранулі яго нямецкія кулі, не трапіў на мушку белагвардзейскай ці бандыцкай вінтоўкі.

Пасля грамадзянскай вайны Рыгор Парфенавіч вярнуўся ў родныя Лапацічы, ажаніўся, арганізоўваў калгас, быў першым кавалём, а ў гады Вялікай Айчыннай вайны зноў узяў у рукі зброю і сустрэў перамогу ў Чэхаславакіі.

*У.Макарэвіч.*

## Праўдалюб

Праўдалюб — гэта адзін з літаратурных псеўданімаў нашага земляка Аляксандра Цімафеевіча Вазілы. З яго імем былі звязаны шмат якія падзеі, што адбываліся на Слаўгарадчыне і наогул у краіне напярэдадні Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. і некаторы час пасля яе.

Нарадзіўся Аляксандр Цімафеевіч 9

верасня 1888 г. у Слаўгарадзе. На стромкіх берагах Сожа і Проні прайшло яго дзяцінства, фарміраваўся характар, развіваўся талент паэта, публіцыста, грамадскага дзеяча. Тут ён атрымаў першую адукацыю ў Слаўгарадскім 4-класным гарадскім вучылішчы, тут нараджаліся задумкі яго першых вершаў, апавяданняў, публіцыстычных артыкулаў, напісаных пад уплывам падзей рэвалюцыі 1905—1907 гг. Яе ідэі хутка становяцца жыццёвымі поглядамі самога А.Ц.Вазілы.

Паводле ўспамінаў ленінградскага прафесара Я.С.Канчара, добра ведаўшага Вазілу, Аляксандр Цімафеевіч за ўдзел у беларускім рэвалюцыйным руху прыкладна ў 1907 г. быў зняволены ў кіеўскую палітычную турму, адкуль потым трапіў у Сібір. Наконт 1907 г. Яўсей Сцяпанавіч, відаць, памыляецца, бо ёсць яшчэ звесткі пра тое, што А.Ц.Вазіла быў слухачом Вышэйшых курсаў Лесгафта ў Пецярбургу, з якіх яго выключылі ў 1908 г. менавіта за ўдзел у рэвалюцыйным руху. Хутчэй за ўсё арышт і ссылка Вазілы толькі не ў Сібір, а на Урал адбыліся не ў 1907, а ў 1908 г. Само ж яго знаходжанне як у Кіеве, так і на Урале бясспрэчна. Аб тым, што Аляксандр Цімафеевіч прайшоў праз казематы кіеўскай палітычнай турмы, сведчыць верш «Лампы», які мае падзаголовак «Из ужасов Киевского Косого Копанира» (пад такой назвай была вядома гэта турма. — *Аўтар*). Апісаць дэталёва здзекі і катаванні, якія ўчыняліся над рэвалюцыянерамі ў засценках «Косого Копанира», можна было, толькі ўбачыўшы ўсё сваімі вачамі. А вершам «Лампы» пачынаецца паэтычны зборнік А.Ц.Вазілы «Хвалі», выдадзены ў 1914 г. у г. Златаусце.

Як сцвярджаюць бібліёграфы А.В.Блюм і Д.Г.Кузьміч, зборнік «Хвалі» — адзіная кніга белетрыстычнага зместу, выдадзеная ў дакастрычніцкі час на Паўднёвым Урале. Але, на жаль, яна не ўбачыла свет. Зборнік быў «арыштаваны» прама ў друкарні. Да нас дайшлі толькі адзінкавыя яго экземпляры, два з якіх знаходзяцца ў Расійскай нацыянальнай бібліятэцы ў Санкт-Пецярбургу. На адным з гэтых экземпляраў ёсць, верагодна, зроблены цэнзарам ці супрацоўнікамі бібліятэкі надпіс — «Книга запрещена», а ў другім — усе лісты прашыты белым шаўковым шнуром і змацаваны сургучнай пячаткай са штампам Галоўнага ўпраўлення па справах друку. Ніжэй пячаткі надпіс, які мы прыводзім цалкам, зберагаючы стыль і арфаграфію: «Итого в сем зборнике припечатано шестьдесят (60) страниц в чем и свидетельствую своим подписам. Владелец типографии Федор Селезнев». Верагодна, гэтая кніжка праходзіла на судзе супраць аўтара як рэчавы доказ яго «крамольнасці».

Несумненна, што ў час падрыхтоўкі і выдання кнігі А.Ц.Вазіла знаходзіўся на Урале. 14 ліпеня 1914 г. уфімскі віцэ-губернатар даносіў у Галоўнае ўпраўленне па справах друку аб тым, што ён выдаў «свидетельство крестьянину села Крестовского Шадринского уезда Пермской губернии С.М.Кацу о разрешении ему издавать в г. Златоусте под ответственность редактора крестьянина села Пропойск Быховского уезда Могилевской губернии Александра Тимофеевича Вазило еженедельную газету под названием «Уральские искры».

Пачаўшы сваю дзейнасць не з газеты, а з выдання асабістага зборніка, рэдактар такім чынам вырашыў лёс газеты і прыцягнуў увагу да сябе. Царская ахранка распачала «Дело по поводу издания в г. Златоусте Уфимской губ. брошюры Александра Вазило «Волны».

У 1916—1917 гг. А.Ц.Вазіла зноў у Петраградзе. Ён дамогся таго, што быў прыняты на курсы кааперацыі. Тут і застала яго Кастрычніцкая рэвалюцыя, якую ён успрыняў усім сэрцам і цалкам аддаўся справе служэння народу, застаючыся пры гэтым на пазіцыях сацыял-дэмакратаў-інтэрнацыяналістаў. У канцы 1917 г. А.Ц.Вазіла вярнуўся ў родны край, дзе адразу ўзначаліў Быхаўскую павятовую земскую ўправу. У снежні 1917 г. ён удзельнічае ў рабоце Усебеларускага з'езда ў Мінску. Яго арганізатары дамагаліся абвяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі і аддзялення яе ад Савецкай Расіі. Па гэтым пытанні разгарэліся бурныя спрэчкі, якія падзялілі прысутных у зале на два процілеглыя бакі. Як сведчаць відавочцы, «был критический момент: правая сторона, подымаясь и подбрасывая шапки, кричала: «Ура! Да здравствует




Вокладка кнігі А.Вазілы «Хвалі», выдадзенай у Златаусце ў 1914 г.

независимая Белорусская Республика!» Левая сторона подавленная, не понимая, что совершается вокруг, сидела молча, затаив дыхание. Такой момент был готов, когда только правая часть, незалежники, не считаясь с голосом крестьянства, сделали попытку отделения от России Белорусского края и, следовательно, непризнание Советской власти».

Вось тут і выйшаў на трыбуну наш зямляк. Яго яркая эмацыянальная прамова кранула сэрцы ўсіх, хто разгубіўся і не ведаў, як быць. А заклік «не отрывать Беларусь от живого тела России» знайшоў сваіх прыхільнікаў нават сярод некаторай часткі тых, хто толькі што кідаў шапкі ўгару за незалежнасць. І работа з'езда пайшла па іншым рэчышчы.

Гэтая прамова А.Ц.Вазілы была выдадзена ў 1918 г. у Петраградзе асобнай брашурай, якая сёння лічыцца вялікай бібліяграфічнай рэдкасцю. У сваёй прадмове да выдання Я.С.Канчар характарызуе А.Ц.Вазілу як лепшага сына рэвалюцыі і беларускай зямлі.

У 1918 г. Аляксандра Цімафеевіча Вазілу прызначаюць загадчыкам агітацыйна-выдавецкага пададдзела Беларускага аддзела Камісарыята па справах нацыянальнасцей Саюза камун Паўночнай вобласці. У гэты ж час ён рэдагуе часопіс «Чырвоны шлях», які выходзіў у Петраградзе, працягвае актыўна выступаць у перыядычным друку. Пасля заканчэння грамадзянскай вайны ён вяртаецца на Слаўгарадчыну, актыўна змагаецца за перабудову вёскі, але лічыць, што шлях калектывізацыі не самы лепшы ў гэтай справе. Вакол А.Ц.Вазілы збіраюцца аднадумцы. Свае погляды яны пераўтвараюць у рэальныя справы, арганізоўваюць земляробчыя кааперативы. А гэта не супадае з генеральнай лініяй партыі. Прыйдзе час: усе гэтыя людзі будуць аб'яўлены «ворагамі народа». А.Ц.Вазіла адбівае адну атаку за адной. Яго неаднойчы спрабуюць арыштаваць. Пагроза апынуцца ў Сібіры становіцца ўсё больш рэальнай. І Аляксандр Цімафеевіч кудысьці знікае. Пасля 1937 г. аб ім ніхто нічога не ведаў і не чуў. Мясцовыя старажылы пагаворвалі, што нібыта ён з'ехаў у Казахстан, адкуль толькі аднойчы ўжо пасля вызвалення Слаўгарада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і наведаў родныя мясціны. Але ні з кім, акрамя вельмі блізкіх, ён не сустракаўся, ні аб чым не расказваў. Паводле іншых звестак, А.Ц.Вазіла загінуў у палітізалятары г. Уладзімір (Расія), верагодна, у 1943 г.

*В.П.Ерашэнка.*

## У дваццаць першым...

Адгрымелі баі грамадзянскай вайны. У павеце пачалося аднаўленне народнай гаспадаркі. Толькі мірнаму будаўніцтву перашкаджалі варожыя элементы. Нахабна дзейнічалі банды Багдановіча і Вярбіцкага. Яны тэрарызавалі насельніцтва, распраўляліся з актывістамі. У адным з баёў банда Багдановіча была разгромлена.

Павятовы камітэт партыі і выканаўчы камітэт патрабавалі ад павятовага палітбюро (ЧК) і ваенкамата хутчэй ліквідаваць і банду Вярбіцкага. Было вырашана накіраваць паручэнца пры ваенкоме чырвонага камандзіра Берзіна за Дняпро, каб разведаць дыслакацыю банды і распачаць з ёй перагаворы. Неўзабаве яму ўдалося натрапіць на яе след. Адбылася сустрэча. Берзін выклаў умовы здачы і дадаў: «Справа ваша гіблая. Чырвонаармейцы і атрады ЧОНа ідуць па вашых слядах. Не здасцеся — будзеце знішчаны. Літасці потым не прасіце».

Вечарам 18 верасня 1921 г. сямёра бандытаў прыехалі ў Быхаў і адразу накіраваліся ў павятовы ваенкамат. Іх сустрэў ваенком Лявонаў, загадаў здаць зброю. Па той паспешлівасці, з якой бандыты кінулі вінтоўкі, ваенком западозрыў нядобрае. Праз некаторы час кожнаму, хто прыйшоў здавацца, былі выпісаны дакументы. Лявонаў заявіў, што паколькі яны знаходзіліся ў бандзе, падпісаць пасведчанні павінен старшыня ЧК, ён жа і выдасць іх, а пакуль трэба ісці спаць, час ужо позні.

Ноччу ў адзін з пакояў двухпавярховага дома, дзе размяшчалася ЧК, ваенком скрытна правёў групу курсантаў, якія павінны былі затрымаць бандытаў, як толькі тыя ўвойдуць у будынак. Аднак усё здарылася інакш...

Раніцай 19 верасня Берзін узяў выпісаныя часовыя пасведчанні і павёў бандытаў у ЧК. Ці то курсанты спазніліся, ці то Берзін прывёў бандытаў раней, але так ці інакш усе яны прайшлі ў пакой на другім паверсе, дзе знаходзіліся старшыня павятовай ЧК Навум Француз, яго памочнік Хаськін і сакратар Георгій Дорахаў[1]. Берзін паклаў на подпіс Французу дакументы. Бандыты стаялі перад сталом купкай, уперадзе — Вярбіцкі.



Г.Я.Дорахаў.



Дз.П.Саладухін.

Падпісваючы яго пасведчанне, Француз узняў вочы і спыніў погляд на Вярбіцкім. Вельмі не спадабаўся яму насцярожаны твар бандыта. Чырвонаармейцаў усё не было. Француз унутрана захваляваўся, але віду не падаў. Падпісаўшы апошні дакумент, ён раптам ускочыў з-за стала і крыкнуў бандытам: «Рукі ўгору!», — спадзеючыся, што яго пачуюць курсанты. Вярбіцкі тут жа выхапіў рэвальвер. Стрэл, яшчэ два... Некалькі бандытаў кінуліся разбіваць вокны, астатнія пачалі страляць па дзвярах, не даючы магчымасці нікому ўвайсці. Потым саскочылі з другога паверха і кінуліся да Дняпра...

Калі курсанты ўварваліся ў пакой, яны ўбачылі забітых Француза, Дорахава і параненага Хаськіна. Але не ўдалося ўцячы і бандытам. Іх дагналі чырвонаармейскія кулі.

Пахаваны Г.Я.Дорахаў і Н.Л.Француз у Быхаве на Кастрычніцкай плошчы ў брацкай магіле барацьбітоў за савецкую ўладу, савецкіх воінаў і партызан. Іх імёнамі названы вуліцы ў Быхаве.

*І.Дрыгант.*

*Друкуецца па кн.: Памяць. Быхаўскі раён. Мн., 1990. С. 128—129.*

## Дакументы сведчаць

### ЗАГАД БЫХАЎСКАЙ ПАВЯТОВАЙ КАМІСІІ АБ БАРАЦЬБЕ З БАНДЫТЫЗМАМ

**16 верасня 1921 г.**

На основании распоряжения Предгубкомбанда все находящиеся на территории Быховского уезда бандиты в течение двухнедельного срока должны добровольно явиться к местным властям, начальникам отрядов для сдачи. Являющиеся бандиты ни в коем случае не

[1]Георгій Яўменавіч Дорахаў нарадзіўся 19.6.1897 г. у в. Старынка Слаўгарадскага раёна. Працаваў на кардоннай фабрыцы, памочнікам пісара ў Баханскім валасным праўленні. Пасля службы ў Чырвонай Арміі працаваў у павятовым ваенкамаце, сакратаром павятовага выканкома, Быхаўскай павятовай ЧК.

должны иметь при себе оружие и только после сдачи они должны указать, где таковое находится.

Все добровольно явившиеся бандиты проходят через суд Революционного Трибунала, причем им будет дано снисхождение.

Семьи бандитов, не явившихся в течение семи дней со дня издания настоящего приказа, будут взяты заложниками и в случае неявки бандитов в двухнедельный срок будут высланы из пределов Гомельской губернии, и имущество их будет конфисковано. Никакие переговоры как с бандами, так и с отдельными бандитами вестись не будут, а бандиты, которые придут сдаваться, имея при себе оружие, будут расстреливаться на месте.

Борьба с бандами и отдельными бандитами будет вестись самая жестокая и снисхождение будет оказано только добровольно явившимся.

Настоящий приказ подлежит широкому оглашению на всех сельских сходах и должен быть вывешен на видных местах в каждом селении под личную ответственность предволисполкома и предсельсовета.

Уездной милиции приказывается наблюсти за широким распространением настоящего приказа.

Приказ входит в силу с 18 сентября сего 1921 года.

Лица, срывающие настоящий приказ, будут арестовываться и предаваться суду.

Быховская Уездная Комиссия по борьбе с бандитизмом

*Фотакопія загаду захоўваецца ў Быхаўскім гісторыка-краязнаўчым музеі.*

**ПАВЕДАМЛЕННЕ ГАЗЕТЫ «ИЗВЕСТИЯ БЫХОВСКОГО РЕВКОМА»**

**4 студзеня 1919 г.**

Быховский Комитет Российской Коммунистической партии (большевиков) кандидатами в члены Быховского исполкома выставляет тт.:

1. Шекова А. 2. Старостенко А. 3. Лагутенка П. 4. Манжурова К. 5. Красовского Я. 6. Тимошкова. 7. Сорокина Марка. 8. Соколова И. 9. Абрамовича П. 10. Стефаненко М. 11. Сорокина Т. 12. Эйтина. 13. Демьяновича. 14. Француза. 15. Кулакова Г.

Кандидатура Ковалева ввиду назначения его секретарем комитета партии (с 10 января 1919 г.) согласно постановлению комитета не выдвигается. Уездный съезд Советов назначается на 10 января 1919 г.

Быховский комитет РКП

## Было мне тады 16

### З успамінаў былога чонаўца Дзмітрыя Пятровіча Саладухіна

Мне было тады 16. Стаяў кастрычнік: хмуры, даждлівы. Якраз заканчваўся пашавы сезон. Я радаваўся, што мой гаспадар скора паставіць жывёлу ў хлеў. Можна будзе, нарэшце, адпачыць ад цяжкай працы пастуха. «Паеду ў сваю родную вёску Устаннае», — думаў я.

Але адпачыць не давялося. Неяк адвячоркам сустрэў мяне знаёмы бальшавік. Працаваў ён у Быхаўскім павятовым камітэце партыі і часта прыязджаў у вёску, дзе я пасвіў жывёлу. Дык вось ён і кажа:

— Чаму гэта ты, ЗміТрок, у камсамол не ўступаеш? Батрак, чужую жывёлу пасвіш. Тваё месца там.

Памаўчаў, а на развітанне сказаў:

— Прыходзь заўтра ў Быхаў, я буду рэкамендаваць цябе ў камсамол. Згодзен?

— Чаму ж, згодзен, — адказаў я.

З той пары мінула шмат гадоў. Але і сёння жыва ўяўляю той дзень: як ішоў, як хваляваўся, як вучылі пісаць заяву. Затым быў прыём. Задавалі шмат розных пытанняў, распытвалі, дзе працую, ці жадаю вучыцца. Нарэшце аб'явілі:

— Прыняты, лічы сябе камсамольцам.

Неўзабаве выдалі членскі білет — чырвоную кніжачку, з якой я не разлучаўся цэлых сем гадоў.

Да свайго гаспадара я больш не вярнуўся. Мяне пакінулі працаваць у Быхаве. Горад толькі што вызвалілі ад польскіх легіянераў, і для барацьбы з контррэвалюцыяй стварылі спецыяльныя атрады ЧОН. У адзін з іх мяне і накіравалі.

У студзені 1921 г. паклікалі ў партыйны камітэт, сказалі:

— Ёсць думка накіраваць цябе ў савецка-партыйную школу.

У Гомелі я правучыўся да мая, пасля чаго мяне накіравалі ў родную вёску. Ні

ва Устанным, ні ў валасным цэнтры Доўгі Мох не было камсамольскіх ячэек. Па-ранейшаму стаяў на ўліку ў Быхаве. Туды хадзіў на камсамольскія сходы, на палітзаняткі. Не памятаю ніводнага выпадку, каб хто не з'явіўся або спазніўся. Дысцыпліна ў камсамоле была жалезная.

Аднойчы ў воласці сустрэўся з камсамольцам Дагурам.

— Дык нас цяпер аж тры, — радасна ўскрыкнуў ён. — Будзем ствараць сваю ячэйку.

Так, у 1922 г. узнікла Даўгамохаўская камсамольская арганізацыя. Яна хутка расла. Праз год на ўліку было ўжо звыш 20 камсамольцаў. У верасні 1924 г. было праведзена раянаванне. Лапаціцкі сельскі Савет увайшоў у склад Слаўгарадскага раёна. Маючы нейкі практычны вопыт, я пачаў ствараць камсамольскую ячэйку ў в. Лапацічы, быў яе першым сакратаром. Вось мае сябры тых гадоў: Парфен Сомаў, Іван Далькоў, браты Чымганковы, Іван Цімашкоў, Іван Ільянкоў і многія іншыя. За тры гады, на працягу якіх я працаваў у ячэйцы, у камсамол было прынята больш за 100 юнакоў і дзяўчат.

Баявыя, смелыя і мужныя былі яны. За любое заданне браліся дружна і выконвалі. Чым толькі не займаліся камсамольцы: і палаткі збіралі, і нядзельнікі арганізоўвалі, і палітычную работу вялі сярод насельніцтва. Старшыня Лапаціцкага сельсавета Дземідзенка быў задаволены такімі памочнікамі. Дарэчы, мы і яго справаздачы заслухоўвалі на сваіх сходах. У 1926 г. камсамольская арганізацыя рэкамендавала мяне ў партыю, спачатку ў кандыдаты, праз год у члены. Аднак я не парываў сувязі з моладдзю. У 1927 г. мы стварылі ў в. Устаннае камуну. Яе першымі камунарамі былі дваццаць сем'яў камсамольцаў, у тым ліку Івана Ільянкова, Антона Кузьмянкова, Ціхана Кузьмянкова. Шкада, што не давялося ім дажыць да нашых дзён. У 1941 г. як былых камсамольцаў і камунараў іх расстралялі фашысты.

Кулакі ненавідзелі камсамольцаў і ўсяляк спрабавалі ім помсціць: стралялі з-за вугла, запалохвалі, падкідваючы ананімныя пісьмы. Былі выпадкі, калі ў час калектывізацыі ворагі савецкай улады зрывалі сходы сялян.

Аднойчы пад вечар некалькі камсамольцаў пайшлі ў в. Хварасцяны да Данілы Гулавы, які актыўна выступаў супраць Саветаў.

Гаспадара дома не аказалася. Вырашылі пачакаць. А таго не ведалі, што Гулаў бачыў нас. І вырашыў расправіцца з намі. Пачаў збіраць падмогу з верных яму людзей. Калі стала цёмна, кулакі акружылі хату і пачалі кідаць каменне ў вокны, пагражалі забіць нас. Сілы былі няроўныя.

— Што будзем рабіць? — пытаюцца ў мяне як у старэйшага хлопцы.

А што рабіць на самай справе? Праўда ў мяне ў кішэні ляжаў наган, ды толькі ў барабане адзін патрон. Але трэба неяк прарвацца, пакуль не позна. Я паціху адчыніў дзверы і выстраліў у паветра. На нейкі момант кулакі разгубіліся і адступілі. Выкарыстаўшы зручны момант, мы кінуліся ў агарод...

Такіх выпадкаў было шмат, бо ішла ўпартая барацьба старога з новым. Але ж перамогу атрымала апошняе.

## Удзельнікі Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны[1]

### БАХАНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

**КАВАЛЁЎ Ульян,** н. у в. Бахань, восенню 1918 быў накіраваны Быхаўскім павятовым камітэтам РКП(б) у родную вёску для арганізацыі камітэта беднаты і мясцовай улады.

**КУХАРАЎ Раман,** першы старшыня Баханскага валаснога Савета.

**СІКСТАЎ Мікіта Ісакавіч,** н. у 1897 у в. Бахань, з 15.2.1918 па 15.5.1922 знаходзіўся ў радах дзеючай Чырвонай Арміі, памёр.

**СЯМЁНАЎ Андрэй Якаўлевіч,** н. у 1894 у в. Бахань.

**СЯМЁНАЎ Міхаіл Андрэевіч,** н. у 1900 у в. М.Зімніца, з мая 1920 па лістапад 1922 на франтах грамадзянскай вайны ў складзе 148-га стралковага пал-

[1]Пры падрыхтоўцы спіса выкарыстаны часткова матэрыялы даследчыка з Санкт-Пецярбурга, былога музейнага работніка І.Я.Краўцова, які, працуючы ў расійскіх архівах, збіраў звесткі пра сваіх землякоў-беларусаў, што служылі на флоце, флатыліях ці ў пяхотных часцях Чырвонай Арміі.



С.І.Ерашэнка.

ка, з ліпеня 1941 удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

**ХАЛАДЦОЎ Дзяніс Уласавіч,** н. у 1893 у в. Бахань, удзельнік 1-й сусветнай вайны, Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, матрос эскадраных мінаносцаў Балтыйскага флоту.

**ШМАЯНКОЎ Палікарп Аляксеевіч,** н. у 1898 у в. Прудок, удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі, адзін з першых чырвонаармейцаў, у 1920 па рэкамендацыі Быхаўскага рэўкома абраны старшынёй Баханскай воласці, загінуў у 1920 у баі з бандытамі каля в. Кулікоўка.

**ШУБАДЗЕЕЎ Нічыпар Якаўлевіч,** н. у 1896 на хутары Рагожа Баханскай воласці, удзельнік 1-й сусветнай вайны, Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, радыётэлеграфіст Балтыйскага флоту.

**ВАСЬКАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ**

**АГЕЕНКА Мацвей Мікітавіч,** н. у 1893 у в. Бязуевічы, удзельнік 1-й сусветнай вайны, Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, у складзе Дняпроўскай ваеннай флатыліі ваяваў супраць палякаў на рэках Палесся і Украіны.

**АГЕЕНКАЎ Пётр Іванавіч,** н. у 1897 у в. Бязуевічы, удзельнік 1-й сусветнай вайны і Кастрычніцкай рэвалюцыі, качагар эсмінца «Уладзімір» («Свабода»), загінуў 21.10.1919 (гл. артыкул «Абставіны гібелі трох эсмінцаў»).

**АРЛОЎ Павел Ульянавіч,** н. у 1882 у в. Цераховка, удзельнік 1-й сусветнай вайны, Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны.

**АЎРАМЕНКА Антон Ягоравіч,** н. у 1895 у в. Васькавічы, удзельнік трох войнаў, памёр.

**АЎРАМЕНКА Іван Макаравіч,** н. у 1893 у в. Васькавічы, удзельнік 1-й сусветнай, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, актывіст калгаснага руху, памёр у 1981.

**ВАСІЛЬКОЎ Нічыпар Ермалаевіч,** н. у в. Гайшын, удзельнік грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, першы старшыня калгаса ў в. Гайшын, узнагароджаны ордэнамі і медалямі, пасля вайны працаваў намеснікам старшыні райвыканкома па будаўніцтве, памёр у 1967.

**ГУТАРАЎ Міхаіл Ільіч,** н. у 1888 у в. Васькавічы, памёр у 1967.

**ЕРАШЭНКА Іван Іванавіч,** н. у 1884 у в. Васькавічы, пасля грамадзянскай вайны жыў у г. Сімферопаль, памёр у 1959.

**ЕРАШЭНКА Сафрон Іванавіч,** н. у 1888 у в. Васькавічы, удзельнік 1-й сусветнай і грамадзянскай войнаў, з фронту вярнуўся пакалечаны, працаваў у калгасе, памёр у 1960.

**ЕРМАЛЕНКА Герасім Кірылавіч,** н. у в. Васькавічы.

**ІВАНЧАНКА Аляксей Захаравіч,** н. у 1890 у в. Васькавічы, удзельнік 1-й сусветнай і грамадзянскай войнаў, памёр у 1934.

**ІВАНЧАНКА Сямён Кандратавіч,** н. у 1900 у в. Васькавічы, у 1919—1922 у Чырвонай Арміі, ваяваў супраць бандаў Марусі, Махно, з польскімі акупантамі, актывіст калектывізацыі, шмат гадоў узначальваў паляводчую брыгаду ў калгасе «Васькавічы», у Вялікую Айчынную вайну дайшоў да Кёнігсберга, памёр у 1972.

**КОРШЫКАЎ Нічыпар Ціханавіч,** н. у в. Рудня Васькавіцкага сельсавета, удзельнік 1-й сусветнай і грамадзянскай войнаў, з фронту вярнуўся пакалечаны.

**КРУГЛІКАЎ Анісім Панасавіч,** н. у в. Васькавічы, з грамадзянскай вайны вярнуўся дадому з канём, з-за чаго быў забіты аднавяскоўцам.

**ЛУКАШКОЎ Лаўрэнцій Усцінавіч,** н. у 1898 у в. Перагон, у грамадзянскую вайну з 1918 па 1921 на Паўднёвым фронце, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, пасля працаваў у калгасе, памёр.

**ЛЫСЕНКА Влас Іванавіч,** н. у 1896 у в. Папоўка, удзельнік 1-й сусветнай вайны, Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны.

**ЛЫСЯНКОЎ Юрый Арцёмавіч,** н. у 1888 у в. Папоўка, удзельнік 1-й сусветнай і грамадзянскай войнаў, жыў у Маскве, памёр у 1938.

**МАЙСЕЕНКАЎ Апанас Якаўлевіч,** н. у 1896 у в. Гайшын, удзельнік 1-й сусветнай вайны і Кастрычніцкай рэвалюцыі, рулявы эсмінца «Уладзімір» («Свабода»), загінуў у час грамадзянскай вайны 21.10.1919 (гл. артыкул «Абставіны гібелі трох эсмінцаў»).

**МЕЛЬНІКАЎ Кузьма Іванавіч,** н. у 1890 у в. Шаламы, удзельнік грамадзянскай, савецка-фінляндскай і Вялікай Айчыннай войнаў, кавалер ордэна Славы III ступені, медалёў «За адвагу», «За баявыя заслугі», «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.» і іншых.

**НЕПЛАШОЎ Кірыла Аляксандравіч,** н. у 1896 у в. Ганчароўка.

**НЯМІЛЕНЦАЎ Фёдар Усцінавіч,** н. у 1893 у в. Рудня Васькавіцкага сельсавета, адзін з першых руднянцаў, якія добраахвотна перайшлі на бок Чырвонай Арміі, загінуў у Вялікую Айчынную вайну.

**ПАГОДЗІН Фядот Ціханавіч,** н. у 1888 у в. Васькавічы, памёр у 1965.

**ХАРЫТОНЕНКА Дзмітрый Харытонавіч,** н. у 1900 у в. Папоўка, у 1919—1922 у Чырвонай Арміі, памёр.

**ЦВЯРДОЎСКІ Андрэй Пятровіч,** н. у 1881 у в. Папоўка, удзельнік 1-й сусветнай і грамадзянскай войнаў, штабс-капітан, поўны Георгіеўскі кавалер, другі камісар Прапойскай воласці ў 1918, камандзір чырвонагвардзейскага палка ў Быхаве, памёр.

## ГІЖЭНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

**БАЛУКОЎ Цімафей Аляксеевіч,** н. у 1901 у в. Бярозаўка, у складзе арміі М.М.Тухачэўскага ваяваў з польскімі акупантамі, у канцы 1920 — пачатку 1930-х гадоў працаваў сакратаром Целяшоўскага сельсавета, настаўнічаў, у Вялікую Айчынную вайну член падпольнай арганізацыі, потым партызан атрада № 42, пасля вайны загадчык райфінаддзела, старшыня калгаса, памёр у 1982.

**БРЫТКІН Іван Мікітавіч,** н. у в. Ляцягі, кавалер ордэна Георгіеўскага крыжа, працаваў у калгасе, у Вялікую Айчынную вайну дапамагаў партызанам, памёр.

**ВАРАНЦОЎ Аксён Вавілавіч,** н. у в. Бярозаўка, арганізатар і камандзір партызанскага атрада, які дзейнічаў у былой Даўжанскай воласці Чэрыкаўскага павета і змагаўся з польскімі акупантамі, памёр.

**ВІТАЛЁЎ Піліп Барысавіч,** н. у в. Бярозаўка, удзельнік грамадзянскай вайны.

**ВОРАНАЎ Лазар Міхайлавіч,** н. у 1893 у в. Бярозаўка, ваяваў на розных франтах грамадзянскай вайны, у 1930 рэпрэсіраваны як кулак, потым рэабілітаваны, працаваў у калгасе, памёр у 1984.

**ДЗЯТЛАЎ Мікіта Сямёнавіч,** н. у 1900 у в. Ляцягі, у грамадзянскую вайну з 1919 па 1921 на фронце, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, памёр у 1989.

**ДРАЗДОЎ Сямён Фёдаравіч,** н. у 1896 у в. Бярозаўка, ваяваў на розных франтах грамадзянскай вайны, прайшоў усю Вялікую Айчынную вайну, працаваў у калгасе «Радзіма», памёр у 1973.

**ЕРАФЕЕЎ Мікіта Пятровіч,** н. у 1899 у в. Ходараў, служыў у 2-й Коннай арміі, быў некалькі разоў паранены, у Вялікую Айчынную вайну падпольшчык, партызан, пасля вайны працаваў старшынёй сельсавета, памёр.

**КАЛУЖЭНКА Дзмітрый Ягоравіч,** н. у 1901 у в. Любаны.

**КЕГЕЛЕЎ Ахрэм Юр'евіч,** н. у 1898 у в. Трасліўка, удзельнік грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, памёр у 1988.

**КЕГЕЛЕЎ Рыгор Юр'евіч,** н. у 1893, у 1918—1919 ваяваў на розных франтах грамадзянскай вайны, калгаснік, памёр у 1983.

**МАЛАХАЎ Якаў Сцяпанавіч,** н. у в. Целяшы, удзельнік 1-й сусветнай вайны, Георгіеўскі кавалер, у грамадзянскую вайну камандаваў палком, памёр у 1975.

**МАМЕКІН Еўдакім Атрохавіч,** н. у 1896 у в. Бярозаўка, удзельнік партызанскага руху супраць польскіх акупантаў, з Вялікай Айчыннай вайны вярнуўся інвалідам, памёр.



Ц.А.Балукоў.



І.М.Брыткін.



Л.М.Воранаў.



Я.С.Малахаў.

**МЕЛЬНІКАЎ Піліп Прахоравіч,** н. у 1896 у в. Гіжэнка, удзельнік 1-й сусветнай вайны, Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, працаваў у калгасе, памёр у 1964.

**ПРУСАЎ Аляксей Сяргеевіч,** н. у 1895 у в. Бярозаўка, удзельнік 1-й сусветнай і грамадзянскай войнаў, баец 1-й Коннай арміі, арганізатар і адзін з першых старшынь калгаса, загінуў у Вялікую Айчынную вайну.

**ПЧАЛОЎ Сямён Піліпавіч,** н. у 1892 у в. Бярозаўка, у 1919—1920 удзельнічаў у баях супраць польскіх і нямецкіх акупантаў, жыў у в. Ляцягі, памёр у 1990.

**ПШАНІЧНІКАЎ Кандрат Міхайлавіч,** н. у 1896 у в. Любаны, удзельнік Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый, баёў на возеры Хасан, Вялікай Айчыннай вайны, палкоўнік, адзначаны адзінаццаццю ўрадавымі ўзнагародамі, памёр у 1969.

**ПШАНІЧНІКАЎ Ягор Міхайлавіч,** н. у 1891 у в. Любаны, удзельнік грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, працаваў у калгасе, памёр у 1969.

**САЗОНАЎ Пракоп Фядосавіч,** удзельнік 1-й сусветнай і грамадзянскай войнаў, памёр у 1931.



Я.М.Пшанічнікаў.



К.М.Пшанічнікаў.

**САЗОНАЎ Фама Фядосавіч,** н. у 1896 у в. Ляцягі, удзельнік грамадзянскай вайны, працаваў у калгасе «Радзіма», памёр у 1963.

**СКАЧКОЎ Мірон Апанасавіч,** н. у 1898 у в. Трасліўка, у Вялікую Айчынную вайну адзін з арганізатараў партызанскага руху ў раёне, працаваў да вайны і пасля яе ў органах МУС, памёр у 1988.

**КАМЕНКАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ**

**ЛАЗАРЭНКА Міхаіл Максімавіч,** н. у 1901 у в. Дабранка, юнаком добраахвотна ўступіў у Чырвоную Армію, працаваў старшынёй калгаса, памёр.

**ЛАПУЦІН Мацвей Агеевіч,** н. у 1900 у Слаўгарадзе, баец 1-га сялянскага атрада Чырвонай Арміі, потым 50-й арміі Каўказскага фронту, працаваў у Слаўгарадзе, памёр у 1989.

### З успамінаў М.А.Лапуціна

У 12 гадоў я застаўся без бацькі і маці. Трэба было зарабляць на хлеб самому. Мне сказалі, што ў Крыму можна знайсці работу, і я са Старой Каменкі падаўся ў Ялту. Работы там не знайшоў, паехаў далей. У Артэку была сядзіба. Батрачыў у пана. У лістападзе 1917 г. у Артэк з Масквы прыехаў упаўнаважаны. Ён расказаў, што прыбыў па загаду У.І.Леніна арганізаваць атрад чырвонагвардзейцаў. Правялі мітынг, і мы, батракі, пачалі запісвацца добраахвотнікамі. Я да стала падышоў першым. За мной запісалася яшчэ 19 батракоў. Наш атрад папоўніўся, і мы прыбылі ў Ялту на барацьбу з контррэвалюцыянерамі. Тут мы пахавалі сваіх 24 таварышаў, якія загінулі ў баях. На іх магіле мы далі клятву не выпускаць з рук зброю, пакуль не будзе поўнасцю ўстаноўлена савецкая ўлада.

Там, у Ялце, сфарміраваўся Першы ялцінскі атрад з 250 чалавек, і нас накіравалі ў Адэсу. Мне давялося змагацца з унутранымі ворагамі і інтэрвентамі ў Крыму і на Каўказе. Многіх таварышаў страціў я ў тыя грозныя гады. Потым наш атрад накіравалі на Украіну пад камандаванне К.Я.Варашылава. Да 1922 г. не выпускаў з рук зброю. Мы выстаялі ў суровыя дні.

**СУГАЧКОЎ Георгій Якаўлевіч,** н. у 1885 у в. Старая Каменка, удзельнік 1-й сусветнай вайны, Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, матрос лінкора «Севастопаль», у час кранштацкага мяцяжу перайшоў на бок мяцежнікаў, за што па прыгавору рэўтрыбунала Петраградскай ваеннай акругі быў расстраляны 20.3.1921.

**КУЛЬШЫЦКІ СЕЛЬСАВЕТ**

**БАДЗЕЕЎ Апанас..,** н. у 1899 у в. Ржаўка, удзельнік грамадзянскай вайны, салдат 2-й роты 157-га палка 17-й стралковай дывізіі.

**БАЛ[А]БОТКІН Каліна Аляксеевіч,** н. у 1892 у в. Ржаўка, удзельнік 1-й сусветнай вайны, Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны.

**БОНДАРАЎ Мікалай Раманавіч,** н. у в. Кулікоўка, узначаліў роту чырвонаармейцаў, сфарміраваную ў 1918 у Кулікоўцы.

**ВУШАЎ Майсей Цітавіч,** н. у 1887 у в. Кулікоўка, удзельнік 1-й сусветнай вайны, Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, камандзір узвода кулямётнай каманды і 1-га крапаснога палка Гомельскай асобнай брыгады.

**ЕРМАЛАЕЎ (ЯРМОЛЕНКА) Парфірый Георгіевіч,** н. у в. Серкаўка, удзельнік 1-й сусветнай вайны, Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, матрос Балтыйскага флоту, потым Дняпроўскай ваеннай флатыліі.

**КАВАЛЁЎ Андрэй Васільевіч,** н. у в. Кулікоўка, жыў у в. Кульшычы, удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, у 1941 абараняў Маскву, у 1945 штурмаваў Берлін.

### З успамінаў А.В.Кавалёва

Да рэвалюцыі я служыў у царскай арміі. Яшчэ не скончылася 1-я сусветная вайна, але мы, салдаты, адчулі, што набліжаецца важная падзея, будзе нейкі значны пералом. Як і кожны сын простага селяніна, я бачыў, што несалодкае жыццё было ў маіх аднавяскоўцаў пры панах. Таму не спатрэбіўся доўгі час для разважання наконт таго, брацць ці не браць уласнасць у пана Шыманскага. Рашуча білі мы і ўдзельнікаў контррэвалюцыйнага мяцяжу ў Гомелі.

**КРЫВУЛЬКІН Фрол Ільіч,** н. у в. Кульшычы, удзельнік 1-й сусветнай, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, ганаровы калгаснік, памёр.

**КУРАЛЕНКА Карней Яўсеевіч,** н. у 1898 у в. Ржаўка, у гады грамадзянскай вайны чырвонагвардзейскі атрад пад яго камандаваннем змагаўся з контррэвалюцыйнымі і іншымі бандамі ў наваколлі Быхава, Бабруйска, Барысава, памёр у 1988.

### З успамінаў Марыі Карнееўны Аксененка

Бацька мой нарадзіўся ў той дзень, калі ў Мінску адбыўся I з'езд РСДРП, і ганарыўся гэтым, хаця ў партыі ніколі не быў. У дваццацігадовым узросце ён узначальваў асобы чырвонагвардзейскі атрад па барацьбе з бандытызмам, у якім налічвалася 126 байцоў і 4 кулямётныя тачанкі. За ўзорнае выкананне атрадам заданняў бацька быў узнагароджаны імянной зброяй.

Калі ў вёсцы быў створаны калгас «Крынічкі», Карнея Яўсеевіча абралі яго старшынёй. Памятаю, што гэта была вельмі добрая гаспадарка, у якой усе дружна працавалі і жылі ў згодзе. Ва ўсёй акрузе «Крынічкі» славіліся тым, што тут не мелі паняцця аб гультайстве, ліхадзействе. Магчыма, гэта таму, што калгас быў невялічкі: у ім аб'ядналіся галоўным чынам людзі, звязаныя сваяцкімі адносінамі. Тут усё трымалася на Кураленках і Куранцовых. Вырошчваўся ў калгасе ў асноўным лён, якому можна было пазайздросціць. Нездарма ж лён з «Крынічак» у 1939 — 1940 гг. экспанаваўся ў Маскве на Усесаюзнай выстаўцы дасягненняў народнай гаспадаркі. На жаль, сёння ад «Крынічак» засталіся толькі ўспаміны. Сам пасёлак Крынічкі ў 1939 г. звезлі ў Ржаўку, а пасля ўзбуйнення знік і калгас з такой назвай.

**КУРАЛЕНКА Карп Максімавіч,** н. у 1897 у в. Ржаўка, баец 1-й Коннай арміі, загінуў у 1920.

**МЕЛЬНІКАЎ Яўсей..,** н. у 1895 у в. Ржаўка, удзельнік 1-й сусветнай вайны, Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны.

**МІХЕЕНКА Максім Фёдаравіч,** н. у 1884 у в. Кулікоўка, баец 1-й Коннай арміі С.М.Будзённага, пасля вайны працаваў у калгасе, памёр у 1978.

**МІХЕЕНКА Уладзімір Максімавіч,** н. у в. Кулікоўка.

**НІКАЛАЕНКАЎ Іоў Андрэевіч,** н. у 1892 у в. Рабінаўка, удзельнік 1-сусветнай вайны, Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, матрос крэйсера «Громобой», абараняў Петраград у 1919.



Т.М.Янчанка.

**НІКАЛАЕЎ Іван Андрэевіч,** н. у 1891 у в. Рабінаўка, удзельнік 1-й сусветнай вайны і Кастрычніцкай рэвалюцыі, матрос 1-й стацці эсмінца «Азард», які 4.6.1919 патапіў найноўшую англійскую падводную лодку «Л-55».

**ПРАЧКІН Георгій Мінавіч,** н. у 1893 у в. Прыволле, удзельнік 1-й сусветнай вайны, Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, ваяваў на Заходнім і Усходнім франтах, быў паранены.

**ПЯТРОЎ Аўхім..,** н. у 1892 у в. Ржаўка, удзельнік 1-й сусветнай вайны, Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны.

**САКАЛОЎ Мікалай..,** н. у 1895 у в. Кульшычы, удзельнік 1-й сусветнай вайны, Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, член РКП(б).

**САЛДАЦЕНКА Кузьма Юр'евіч,** н. у 1900 у в. Ржаўка, удзельнік грамадзянскай вайны, баец 1-й Коннай арміі С.М.Будзённага, загінуў у 1920.

**ЮРЧАНКА Піліп Васільевіч.**

**ЯЖОЎ Апанас Сяргеевіч,** н. у 1895 у в. Рабінаўка, служыў на флоце, удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, працаваў старшынёй Слаўгарадскага гарсавета, памёр у 1937.

**ЯНЧАНКА Тарас Мінавіч,** н. у 1899 у в. Ржаўка, у грамадзянскую вайну змагаўся на фронце супраць войскаў Дзянікіна, польскіх акупантаў, ваяваў у 152-м палку і ў 17-й дывізіі, памёр у 1992.

### ЛАПАЦІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

**БАНДАРЭНКА Герасім Фёдаравіч,** н. у 1888 у в. Улукі, удзельнік грамадзянскай вайны, калгаснік, памёр у 1973.

**ДУДЗЯНКОЎ Пракоп Сцяпанавіч,** н. у 1899 у в. Лапацічы, у грамадзянскую вайну ваяваў у 292-м пяхотным палку 33-й дывізіі на Заходнім фронце, змагаўся супраць войскаў Дзянікіна, Мамантава, Шкуро, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, узнагароджаны ордэнамі і медалямі, пасля вайны працаваў старшынёй сельсавета, памёр у 1989.

**ІЛЬІНКОЎ Ермалай Усцінавіч,** н. у 1893 у в. Лясная, удзельнік 1-й сусветнай вайны і Кастрычніцкай рэвалюцыі, камандзір эсмінца «Уладзімір» (з 30.8.1917 — «Свабода»), загінуў з камандай эсмінца 21.10.1919.



З.А.Камароў.



П.І.Старавойтаў.

### Абставіны гібелі трох эсмінцаў

У дзве гадзіны ночы 21.10.1919 г. эсмінцы «Гавриил», «Константин», «Свобода» і «Азард» выйшлі з Кранштата для пастаноўкі мін у Капорскім заліве. У 5 гадзін 48 мінут пры ўваходзе ў заліў ішоўшы галаўным «Гавриил» падарваўся на варожай міне і праз 20 мінут затануў.

Услед за ім падарваліся і затанулі «Константин» і «Свобода». Эсмінец «Азард», не маючы з-за цемры магчымасці дапамагчы тонучым маракам, у 6 гадзін 20 мінут заднім ходам выйшаў з міннага поля. У водах Балтыкі смерцю герояў загінулі 28 камандзіраў і военкомаў, 433 старшыны і радавыя матросы, сярод якіх 33 ураджэнцы Беларусі. На брацкай магіле форта Красная Горка, дзе пахаваны целы ўсплыўшых маракоў, устаноўлены абеліск без указання імён загінуўшых. У Кранштаце ёсць спортклуб імя Трох эсмінцаў.

**КОСАРАЎ Іван Аўдакімавіч,** н. у 1897 у в. Улукі, удзельнік 1-й сусветнай вайны і Кастрычніцкай рэвалюцыі, старшы матрос эсмінца «Уладзімір» («Свабода»), загінуў 21.10.1919 (гл. артыкул «Абставіны гібелі трох эсмінцаў»).

**КРЫШТАПАЎ Дзмітрый Іванавіч,** н. у 1888 у в. Улукі, удзельнік грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, палкоўнік, памёр у 1947.

**ЛАЗАРЭНКА Іван Сямёнавіч,** н. у 1899 у в. Рабавічы, служыў у 66-м артпалку, удзельнічаў у баях пад Варшавай, працаваў у саўгасе, памёр.

**РУДКОЎСКІ Трафім Рыгоравіч,** н. у в. Кульшычы, удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі, матрос крэйсера «Аўрора», у грамадзянскую вайну ўзначальваў разведку батальёна марской пяхоты, жыў у Санкт-Пецярбургу.

**СОМАЎ Архіп Сяргеевіч,** н. у 1898 у в. Чырвоная Слабада, у грамадзянскую вайну ў 1918 – 1919 на фронце, памёр.

**ЦІМАШКОЎ Тарас Епіфанавіч,** н. у 1894 у в. Улукі, удзельнік грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, палкоўнік, памёр у 1976.

**ЦІМАШКОЎ Якаў Епіфанавіч,** н. у 1891 у в. Улукі, удзельнік грамадзянскай вайны, камісар дывізіі, забіты дыверсантам у Маскве ў 1918.

**ЦІШЧАНКА Іван Анісімавіч,** н. у 1895 у в. Улукі, капельмайстар ваеннага аркестра, загінуў у грамадзянскую вайну у 1919.

**ЦІШЧАНКА Кірыла Анісімавіч,** н. у 1897 у в. Улукі, памёр у 1983.

### СВЕНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

**АНІСЬКАЎЦАЎ Якаў Канстанцінавіч,** н. у в. Лебядзёўка, змагаўся за савецкую ўладу, працаваў старшынёй сельсавета, узначальваў калгас, памёр у 1966.

**АЎДЗЕЕНКА Васіль Тарасавіч,** н. у 1882 у в. Слаўня, былы салдат царскай арміі, перайшоў на бок рэвалюцыі, змагаўся за ўстанаўленне савецкай улады, памёр у 1960.

**АЎДЗЕЕНКА Міхаіл Антонавіч,** н. у 1895 у в. Слаўня, удзельнік трох войнаў, пасля дэмабілізацыі працаваў пчалаводам у калгасе «Звязда», памёр у 1979.

**АЎДЗЕЕНКА Павел Фядотавіч,** н. у 1882 у в. Слаўня, ваяваў на розных франтах грамадзянскай вайны, у 1938 рэпрэсіраваны, адбыў 10 гадоў у лагерах, вярнуўся ў родную вёску і да канца жыцця добрасумленна працаваў у калгасе.

**БУЛАЧКІН Ягор Арцёмавіч,** н. у 1898 у в. Слаўня, адзін з першых у вёсцы чырвонагвардзейцаў, калгасны актывіст, памёр.

**КАМАРОЎ Захар Авяр'янавіч,** н. у 1893 у в. Чарнякоўка, першы камуніст у вёсцы, арганізатар калгаса, пасля вайны загадчык райземаддзела, старшыня калгаса, памёр у 1985.

**КОКАНАЎ Іван Рыгоравіч,** н. у 1895 у в. Слаўня, у час грамадзянскай вайны трапіў у палон у Балгарыю, праз 6 гадоў вярнуўся ў родную вёску, калгаснік, памёр у 1965.

**КОРШУНАЎ Нічыпар Іванавіч,** н. у 1889 у в. Прудок (Кулікоўка), удзельнік 1-й сусветнай вайны, Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны.

**ЛІСІМЕНКА Сяргей Пятровіч,** н. у в. Рэкта, змагаўся супраць царскага самадзяржаўя, у грамадзянскую вайну супраць ваеннай інтэрвенцыі.

**МАКАРАНКА Аляксандр Сцяпанавіч,** н. у 1891 у в. Прудок, памёр у 1970.

**МАКАРАНКА Севасцьян Данілавіч,** н. у 1895 у в. Прудок, удзельнік 1-й сусветнай, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалём «За адвагу», памёр у 1976.

**МАКАРАНКА Юрый Сцяпанавіч,** н. у 1895 у в. Прудок, жыў у в. Сычман Рагачоўскага р-на, памёр у 1972.

**МАКАРАЎ Міхаіл Сцяпанавіч,** н. у 1899 у в. Прудок, у 1918 – 1923 у Чырвонай Арміі.

**ПІНТУСАЎ Павел Аляксандравіч,** н. у 1895 у в. Слаўня, у 1918—1921 у Чырвонай Арміі, калгасны актывіст, памёр у 1969.

**ПОЛАЎЦАЎ Герасім Паўлавіч,** н. у 1899, юнаком добраахвотна уступіў у Чырвоную Армію, у 1930 рэпрэсіраваны як кулак, вярнуўся амаль праз 20 год з Сібіры, жыў у в. Станькава Дзяржынскага р-на Мінскай вобл.

**СТАЛІВОНЕНКА Фадзей Дзмітрыевіч,** н. у 1899 у в. Прудок, ваяваў на розных франтах 1-й сусветнай і грамадзянскай войнаў, арганізатар калгаснай гаспадаркі, памёр у 1988.

**СТАРАВОЙТАЎ Аухім Рыгоравіч,** н. у в. Слаўня, добраахвотна перайшоў з царскай арміі ў Чырвоную гвардыю, у баях быў паранены, памёр у 1926.

**СТАРАВОЙТАЎ Георгій Іўкавіч,** н. у 1892 у в. Лебядзёўка, удзельнік 1-й сусветнай вайны, Кастрычніцкай рэвалюцыі, загінуў у грамадзянскую вайну.

**СТАРАВОЙТАЎ Павел Іўкавіч,** н. у 1898 у в. Лебядзёўка, у 1918—1922 у Чырвонай Арміі, першы старшыня калгаса «Пралетарый», пазней перайменаваны ў «Зару», у Вялікую Айчынную вайну партызанскі сувязны, памёр.

**СТАРАВОЙТАЎ Пракоп Іўкавіч,** н. у 1894 у в. Лебядзёўка, удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі, 1-й сусветнай і грамадзянскай войнаў.

**СТАРАВОЙТАЎ Цімафей Іўкавіч,** н. у 1896 у в. Лебядзёўка.

**ТКАЧОЎ Кірыла Васільевіч,** н. у 1872 у в. Слаўня, удзельнік 1-й сусветнай і грамадзянскай войнаў, памёр у 1960.

**ЦЯНЬКОЎ Васіль Майсеевіч,** н. у 1894 у в. Рагі, удзельнік рэвалюцыйнага паўстання на крэйсеры «Свяціцель Мікалай» у 1917, у грамадзянскую вайну змагаўся супраць унутранай і знешняй контррэвалюцыі, першы старшыня калгаса «Пралетарый», памёр у 1977.

## СЛАЎГАРАДСКІ ГАРСАВЕТ

**АКСЁНАЎ Аляксандр Аўсеевіч,** н. у 1890, удзельнік 1-й сусветнай вайны, у 1919—1921 чырвонаармеец 3-га стралковага палка 28-й дывізіі, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, працаваў у калгасе ў в. Кабіна Гара, памёр у 1986.

**АСТАПАЎ Трафім Яўменавіч,** н. у 1900, у Чырвонай Арміі з 5.6.1919 па 10.9.1923, камуніст, памёр у 1981, пахаваны ў г. Слаўгарад.

**БАРАНАЎ Герасім Сцяпанавіч,** н. у 1884 у в. Новая Слабада, загінуў у сакавіку 1917 пад Баранавічамі.

**БУРАКОЎ Лазар Гаўрылавіч,** н. у 1893 у Слаўгарадзе, удзельнік 1-й сусветнай вайны, Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, матрос лінкора «Севастопаль».

**ЕМЯЛЬЯНАЎ Міхаіл Піменавіч,** н. у 1892 у Слаўгарадзе, удзельнік 1-й сусветнай вайны, Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, матрос Балтыйскага флоту, потым Дняпроўскай ваеннай флатыліі, быў паранены.



Ф.С.Самусенка.



В.М.Цянькоў.

**ЕРАШЭНКА Міхаіл Іванавіч,** н. у 1882 у в. Васькавічы, удзельнік 1-й сусветнай і грамадзянскай войнаў, потым селянін-аднаасобнік, у 1939 пераехаў на жыхарства ў Слаўгарад, дзе саматужнічаў да канца жыцця, памёр у 1964.

**ЗАК Восіп Якаўлевіч,** н. у 1897 у Слаўгарадзе, удзельнік грамадзянскай вайны ў складзе 1-га Васілеастроўскага і Рагожска-Сіманаўскага палкоў.

**КЛЮЕЎ Максім Іванавіч,** н. у 1871 у Слаўгарадзе, удзельнік 1-й сусветнай і грамадзянскай войнаў, памёр у 1939.

**КРАСНАБАЕЎ Павел Рыгоравіч,** н. у 1898 у в. Улукі, удзельнік грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, пасля працаваў старшынёй Васькавіцкага сельсавета, Слаўгарадскага гарсавета, памёр у 1969.

**ЛАГУЦЁНАК Васіль Карпавіч,** н. у 1890 у Слаўгарадзе, у 1912 прызваны на Балтыйскі флот, у 1914—1917 ваяваў супраць немцаў у Міжземным моры і Індыйскім акіяне, у 1919—1921 у складзе Дняпроўскай ваеннай флатыліі змагаўся супраць войскаў Дзянікіна, польскіх акупантаў, бандаў, пасля грамадзянскай вайны застаўся на флоце, апошнія гады жыцця правёў у Слаўгарадзе.

**ЛАГУЦЁНАК Восіп Карпавіч,** н. у Слаўгарадзе, адзін з 550 добраахвотнікаў-чырвонаармейцаў, якія летам 1918 былі накіраваны са Слаўгарада на франты грамадзянскай вайны.

**ЛАРЭСАЎ Фёдар Мікітавіч,** н. у 1894 у в. Завад-Віравая, удзельнік 1-й сусветнай вайны, Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, кулямётчык 508-га палка 57-й стралковай дывізіі.

**ЛІХАЧОЎ Васіль Фаўставіч,** н. у 1894 у Слаўгарадзе, удзельнік 1-й сусветнай вайны, Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, мінны машыніст Балтыйскага флоту.

**ПІНТУСАЎ Васіль Цярэнцьевіч,** н. у 1900 у Слаўгарадзе.

**САМУСЕНКА Фёдар Сідаравіч,** н . у 1896 у в. Рудня, удзельнік 1-й сусветнай, грамадзянскай і



Ф.Ф.Старахазяеў.



У.І.Шкірманкоў.

Вялікай Айчыннай войнаў, працаваў у калгасе «Кастрычнік», узнагароджаны медалямі «За адвагу» і «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.», памёр у 1989.

**СМАЛІЦКІ Натан Цявельевіч,** н. у Слаўгарадзе, удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, належаў да каманднага саставу Чырвонай Арміі, жыў у Слаўгарадзе, памёр у 1958.

**СТАРАХАЗЯЕЎ Кузьма Фёдаравіч,** н. у Слаўгарадзе, удзельнік грамадзянскай вайны, баец чырвонагвардзейскага атрада, створанага ў Слаўгарадзе, памёр.

**СТАРАХАЗЯЕЎ Фёдар Фёдаравіч,** н. у 1899 у Слаўгарадзе, удзельнік грамадзянскай вайны, адзін з арганізатараў савецкай улады ў раёне, у 1920—1930-я гады працаваў сакратаром райвыканкома, загадчыкам земаддзела, старшынёй калгаса, у Вялікую Айчынную вайну падпольшчык, партызан, пасля вайны на партыйнай і савецкай рабоце, памёр.

**ТАПТУНОЎ Сямён Васільевіч,** н. у 1889, у маі—лістападзе 1919 чырвонагвардзеец 1-га Крымскага палка, жыве ў Слаўгарадзе.

**ХАХАНЬКОЎ Раман Ільіч,** н. у 1895 у в. Новая Слабада, удзельнік 1-й сусветнай і грамадзянскай войнаў, кулямётчык 559-га палка 187-й асобнай стралковай брыгады Кранштацкай крэпасці.

**ШКІРМАНКОЎ Уладзімір Іванавіч,** н. у 1900, у грамадзянскую вайну добраахвотнік 6-га Задняпроўскага палка 1-й дывізіі, з 1924 на партыйнай рабоце ў Слаўгарадскім р-не, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны I ступені, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР, памёр у 1989.

### З успамінаў У.І.Шкірманкова, былога палітрука кулямётнай каманды 70-га стралковага палка 24-й Самара-Сімбірскай жалезнай дывізіі

Быў канец мая 1919 г. Неяк падыходзіць да мяне ротны фельчар камуніст Блажко і гаворыць:

— Вазьмі гэту газету і, калі хлопцы папросяць штосьці прачытаць, пачытай ім вось гэты артыкул.

Ён называўся «Царская Расія — турма народаў», а надрукаваны быў у нашай дывізіённай газеце «Барэц за камунізм». Чаму ён даручыў гэта мне? А таму, што ў роце былі людзі розных нацыянальнасцей, а пісьменных вельмі мала. Многія не ўмелі распісацца, не тое што чытаць...

Неяк падыходзіць адзін чырвонаармеец і гаворыць:

— Пачытаў бы ты нам, таварыш Шкірманкоў, што-небудзь.

І я пачаў чытаць гэты артыкул...

Праходзілі гады. І вось я ўжо член партыі, скончыў Вышэйшую ваенна-палітычную школу, палітрук кулямётнай каманды. Было гэта прыкладна ў жніўні 1922 г. Праводзіў я палітзаняткі з байцамі, і трапіла знаёмая тэма: «Царская Расія — турма народаў». Калі ў той раз я чытаў газетны артыкул, то зараз самастойна і з прыкладамі расказваў аб мінулым царскай Расіі, аб жыцці яе народаў.

**ШУСЦЕРАЎ Рыгор Абрамавіч,** н. у 1893 у Слаўгарадзе, удзельнік 1-й сусветнай вайны, Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны.

### СТАРЫНКАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

**БАРАНАЎ Антон Апанасавіч,** н. у 1895 у в. Крамянка (Каменка), удзельнік 1-й сусветнай вайны, Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, матрос крэйсера «Громобой».

**КУДРАЎЦАЎ Мікіта Герасімавіч,** н. у 1900 у в. Старынка, адзін з першых у вёсцы добраахвотнікаў-чырвонаармейцаў, у Вялікую Айчынную вайну трапіў у лагер смерці «Асвенцым», працаваў старшынёй калгаса да вайны і пасля яе, памёр у 1984.

**МАНЧАНКА Марк Кузьміч,** н. у 1892 у в. Старынка, у 1918—1921 змагаўся за ўстанаўленне савецкай улады, у 1941—1945 разам з трыма сынамі абараняў Радзіму ад фашысцкіх захопнікаў, вызваляў Чырвоную Слабаду, Рабавічы, Машэцкую Слабаду і іншыя вёскі раёна, быў паранены, пасля вайны жыў і працаваў у роднай вёсцы, памёр.

**СТРУКАЎ Іван Рыгоравіч,** н. у в. Старынка, удзельнік абароны Петраграда ў 1919, матрос аховы Кранштацкага ваеннага порту.

**СТРУКАЎ Мацвей Рыгоравіч,** н. у 1895 у в. Старынка, удзельнік 1-й сусветнай вайны, Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, у сакавіку 1921 прапаў без вестак.

**ШЭДАЎ Іван Мікалаевіч,** н. у 1895 у в. Крамянка (Каменка), удзельнік 1-й сусветнай вайны, Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, сігнальшчык лінкора «Севастопаль».

## Паміж войнамі

Заканчваўся 1920 год. Скалечаная, знявечаная ўступала Слаўгарадчына, як і ўся Беларусь, у чацвёрты год свайго жыцця пасля знакамітага выстралу крэйсера «Аўрора» і ў першы пасляваенны год, які выдаўся асабліва цяжкім і бурным. Адроджаныя Саветы пачалі аднаўленне сельскай гаспадаркі, асновай якой у нашых мясцінах заўсёды з'яўлялася земляробства. Жывёлу тут калі і трымалі, то толькі для сябе, садоўніцтва і нават агародніцтва былі не ў пашане. А сеялі галоўным чынам жыта, ячмень, авёс, бульбу ды яшчэ лён і каноплі. Жыта ішло на хлеб, які пякла кожная гаспадыня. З ячменю таксама ў хатніх умовах выраблялі крупы. Аўсом кармілі коней, а бульбай — свіней, дый самі без яе не абыходзіліся ні дня. Культываваліся, хаця і ў значна меншай ступені, дый то не ўсімі, пшаніца, грэчка і гарох. І не дзіўна, што белы бохан і грэцкую кашу сялянін бачыў на сваім стале 2—3 разы ў год на вялікія святы. А вось без ільну і канапель, з якіх сяляне рабілі сабе адзенне і абутак ды яшчэ і грошай крыху зараблялі, не абыходзілася ні адна сям'я. Гэта было звычайнай з'явай. А ў першыя пасляваенныя гады наогул менш звярталі ўвагу на пшаніцу, грэчку ці на лён з пянькой. Краіне перш за ўсё патрэбны быў хлеб. Менавіта на гэта нацэліў сялянства 4-ы павятовы з'езд Саветаў, які 12 верасня 1920 г. разгледзеў пытанне аб пераходзе да мірнай працы. Аднак хлебам якраз і не парадаваў земляробаў 1920 г. Яго было сабрана значна менш, чым раней. На зніжэнне ўрадлівасці паўплывалі засуха, якая ахапіла тады ўсходнюю частку Беларусі, і доўгія гады вайны, што прывялі да скарачэння пасяўных плошчаў, недахопу рабочай сілы і г.д.

Цяжкім было становішча і ў прамысловасці. Больш буйныя прадпрыемствы стаялі. Дзейнічалі галоўным чынам невялікія прыватныя рамесныя майстэрні з 1—2 рабочымі, без якіх жыхары Слаўгарада і вёсак не маглі абысціся.

Паскарэнню аднаўлення народнай гаспадаркі садзейнічала новая эканамічная палітыка (нэп), якая пачала ажыццяўляцца ў краіне з 1921 г. у адпаведнасці з рашэннямі X з'езда РКП(б). Дзяржавай дазваляліся абмежаваная прыватная ўласнасць на сродкі вытворчасці, прыватны гандаль, буйнейшыя прадпрыемствы здаваліся на невялікі тэрмін у арэнду. На вёсцы харчразвёрстка замянялася харчпадаткам, пры якім селянін сам распараджаўся наяўнымі лішкамі хлеба. Адначасова Слаўгарадскі выканком і партячэйка рабілі ўсё магчымае і для развіцця ва ўмовах нэпа дзяржаўных і кааператыўных прадпрыемстваў. Ужо ў 1926 г. у мястэчку дзейнічала 116 невялікіх прадпрыемстваў, на якіх было занята 168 чалавек. Сярод іх найбольш значнымі лічыліся «Чырвоны дрэваапрацоўшчык» (9 рабочых), арцелі «Змычка», «Чырвоны інвалід» і панчошная (па 5 рабочых). У наваколлі Слаўгарада ў 1921 г. з'явілася сельскагаспадарчая арцель «Араты-2» (адзін кааператыў з такой жа назвай да таго часу ўжо дзейнічаў у в. Хатоўня). У наступным годзе ўзнікаюць сельскагаспадарчыя кааператывы: 10 сакавіка — «Чысць», у які на базе былога аднайменнага панскага маёнтка аб'ядналіся 12 бядняцкіх сямей; 3 мая — «Чырвоны Гарадзец», створаны з 14 гаспадарак в. Новы Гарадзец; 22 лістапада — «Сінякоўка», у які ўвайшлі 13 зімніцкіх сямей. Крыху пазней ствараюцца калектыўныя аб'яднанні «Культура» ў Свенскаполлі, «Саха» і «Ясная Паляна» побач з «Аратым-2». У 1922 г. на зямлі,

якая належала памешчыку Каморскаму, паставілі першыя хаты перасяленцы з ліку васькаўскіх малазямельных сялян. Яны на працягу 1—2 гадоў стварылі вёску Ганчароўку і аб'ядналіся ў машыннае таварыства «Адраджэнне». Як бачна з прыведзеных вышэй прыкладаў, калектыўныя гаспадаркі спачатку былі невялікія. Аднак з першых крокаў яны прыцягвалі ўвагу аднавяскоўцаў, сялян суседніх вёсак і хутка раслі. Да пачатку 1925 г. Баханскае сельскагаспадарчае таварыства налічвала ўжо 60 гаспадарак. Усе кааператывы з'яўляліся добраахвотнымі аб'яднаннямі, на прыкладзе якіх потым вялася агітацыя за калгасы. Пэўную ролю ў правядзенні калектывізацыі адыграла дзейнасць з сярэдзіны 1923 г. Слаўгарадскага крэдытнага кааператыўнага таварыства, у склад якога ў пачатку кастрычніка 1924 г. уваходзіла 210 пайшчыкаў, 15% з іх былі беднякі, а астатнія — серадднякі. Звяртаючы на гэта ўвагу, раённы партыйны сход, які адбыўся 11.10.1924 г., рэкамендаваў у далейшым больш уцягваць у таварыства «бядняцкага элементу».

Адразу пасля грамадзянскай вайны кіраўніцтва БССР неаднаразова ставіла перад Масквой пытанне аб далучэнні да Беларусі тэрыторый са складу РСФСР, якія населены пераважна беларусамі. І вось у пачатку лютага 1924 г. Прэзідыум ЦВК па пытанні аб перадачы Беларусі раёнаў з пераважным беларускім насельніцтвам прыняў пастанову, у якой было запісана: «Перадаць Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспубліцы:...

2. Са складу Гомельскай губерні паветы: Магілёўскі, Рагачоўскі, Быхаўскі...»

У адпаведнасці з гэтай пастановай з абодвух бакоў пачалася падрыхтоўчая праца. І ўжо ў сярэдзіне ліпеня 1924 г. 2-я сесія ЦВК Беларусі 6-га склікання з улікам далучаных тэрыторый разгледзела пытанне аб адміністрацыйна-гаспадарчым падзеле Беларусі.

Сесія вырашыла замест існаваўшых дагэтуль у Беларусі губерняў утварыць 10 акруг, у тым ліку Магілёўскую. Акругі падзяляліся на раёны, апошнія — на сельсаветы.

Такім чынам 17 ліпеня 1924 г. у складзе Магілёўскай акругі ўзнік Прапойскі раён. Яго ядром стала Прапойская воласць, да якой былі далучаны часткі Баханскай, Бычанскай, Даўгамохаўскай, Старынкаўскай і некаторых іншых сумежных валасцей. Райвыканком узначаліў актыўны ўдзельнік грамадзянскай вайны бальшавік-ленінец Іван Яўсеевіч Тарасаў.

Адміністрацыйна раён у той час падзяліўся на Прапойскі мястэчковы і 11 сельскіх Саветаў: Васькавіцкі, Гайшынскі, Гіжэнскі, Іванішчавіцкі, Кульшыцкі, Лапаціцкі, Рабавіцкі, Ржаўскі, Старынскі, Целяшоўскі, Чарнякоўскі. Набыццё Прапойскам статусу райцэнтра дало значны імпульс для ўсебаковага развіцця як мястэчка, так і ўсяго раёна. За кошт далучаных тэрыторый павялічылася і колькасць жыхароў. Паводле перапісу 1926 г., у раёне пражывалі 41 491 чалавек, у тым ліку ў Прапойску — 4428 (2181 мужчына і 2247 жанчын).

За выключэннем райцэнтра насельніцтва займалася галоўным чынам земляробствам і ў меншай ступені жывёлагадоўляй. Па афіцыйных звестках, у 1926 г. толькі 38 больш моцных аднаасобных гаспадарак прытрымлівалася шматпольнай сістэмы апрацоўкі зямлі, астатнія — трохпольнай. Апошняя патрабуе шмат угнаенняў. А іх якраз і не хапала: арганікі — з-за скарачэння ў гады вайны пагалоўя жывёлы, а мінеральныя вёска яшчэ амаль не ведала. Адсюль і значнае зніжэнне

ўрадлівасці глебы. Калі ў 1914 г. сяляне Прапойскай воласці збіралі з 1 дзесяціны жыта, пшаніцы і гароху па 60 пудоў, ячменю — 65, аўса — 55, а бульбы — 800 пудоў, то ў 1926 г. ураджайнасць жыта зменшылася на 20 пудоў, пшаніцы і гароху — на 10, ячменю і аўса — на 15, а бульбы — на 100 пудоў. Але ў параўнанні з апошнім ваенным годам гэта было ўжо крыху больш. Прыбавілася на вёсцы і жывёлы. На канец 1926 г. у раёне было 9767 коней, 12 059 кароў, 14 726 свіней, 24 882 авечак, 474 казы. Аднак патрабавалася іх значна больш.

Недахоп угнаенняў у нейкай меры можна было папоўніць за кошт значных запасаў торфу, які ёсць у наваколлі большасці вёсак. Аднак распрацоўка яго залежаў не вялася.

Уся ўвага мясцовых кіраўнікоў была звернута на выкананне ўказанняў ліпеньскай (1924) сесіі ЦВК БССР, на якой падкрэслівалася, што «Магілёўская акруга павінна паклапаціцца аб далейшым росквіце лясной гаспадаркі, развіцці меліярацыйнай працы, дрэваапрацоўчай і харчовай прамысловасці». Ва ўсякім выпадку, трэба было перш за ўсё нарошчваць тэмпы развіцця сельскай гаспадаркі. Пэўныя надзеі ў гэтым накірунку звязваліся з прапановамі тагачаснага наркома земляробства Беларусі Дз. Ф.Прышчэпава (гл. арт. «Пасёлкі»).

Яшчэ ў разгар грамадзянскай вайны ў краіне пачалася кампанія па ліквідацыі непісьменнасці, якая ахапіла і Слаўгарадчыну. З гэтай мэтай тут у 1920—1921 гг. дадаткова да існуючых былі адкрыты 39 школ для дарослых. У кожнай з іх навучаліся ад 8 (4-я Слаўгарадская школа) да 75 чалавек (у в. Хляўно, якая адносілася тады да Бычанскай воласці). У в. Слаўня адкрылася школа 1-й ступені. Акрамя таго калектывам местачковай школы 2-й ступені быў створаны і актыўна дзейнічаў Клуб падлеткаў. 6 яго гурткоў — літаратурны, драматычны, прафсаюзнага руху, сельскагаспадарчы, сацыялістычных ведаў, пеўчы — наведвалі 84 юнакі і 66 дзяўчат.

Ва ўсіх гэтых школах, вядомых ў народзе як «лікбезы», навучаліся пераважна жанчыны. А сярод 195 навучэнцаў Бязуевіцкай, Дабрадубскай, Перагонскай, Прудоцкай і Цераховўскай школ не было ніводнага мужчыны. У іншых жа, калі і былі, то 1—2, за выключэннем Рэкта-Міхайлаўскай школы, дзе з 34 навучэнцаў 20 былі мужчыны. Вучыліся людзі добрасумленна. Ды і настаўнікі былі ў іх добрыя. Усё астатняе жыццё з удзячнасцю ўспаміналі потым лікбезаўцы тых, хто адкрыў ім шлях да ведаў: А.Будаеву, А.Максімаву, М.Ніканаву, А.Сафроненку і дзесяткі іншых. А прозвішча былога настаўніка Людкоўскай школы ліквідацыі непісьменнасці Васіля Емяльянавіча Марчанкі было вядома ўсяму раёну. Ён паклаў пачатак цэлай дынастыі савецкіх педагогаў з такім прозвішчам.

Аднак лікбезы сталі толькі першымі крокамі на шляху пераадольвання цяжкай спадчыны мінулага. Галоўнае ў гэтым накірунку было яшчэ наперадзе. Справа арганізацыі народнай асветы ў раёне ўскладнялася тым, што наяўныя школы — 1 сямігодка, 1 яўрэйская ў Слаўгарадзе і 38 аднакамплектных пачатковых у вёсках — маглі ахапіць толькі 30% дзяцей школьнага ўзросту. Асабліва цяжка было вырашаць пытанне: дзе вучыцца дзецям пасля заканчэння 4-га класа?

У канцы лета 1924 г. у Слаўгарадскую сямігодку было пададзена звыш 300 заяў аб прыёме, а маглі залічыць толькі 25—30. Як быць? Каму аддаць перавагу? Каму адмовіць? Вырашаць гэтыя пытанні даручылі спецыяльна створанай камісіі, у склад якой увайшлі настаўнікі, прадстаўнікі ад

райкомаў партыі і камсамола, прафсаюзаў, грамадскасці. Перавагу аддавалі піянерам, і ў першую чаргу з вёскі, дзецям беднякоў і г.д. І тым не менш скаргі былі: «Чаму залічылі сына таго, а не майго?» Перапоўнены былі і іншыя школы, а настаўнікаў не хапала. У яўрэйскай школе на 120 вучняў было ўсяго 2 настаўнікі, а ў сельскіх школах здаралася аднаму настаўніку вучыць ледзь не сотню ці больш дзяцей. Негатыўны адбітак мела і тое, што ў час знаходжання Слаўгарадчыны ў складзе РСФСР навучанне ў школах і дзяцей, і дарослых вялося на рускай мове, па рускіх падручніках. Зараз трэба было пераходзіць на беларускую мову. А тут яшчэ больш не хапала настаўнікаў, падручнікаў, паперы. Усё гэта патрабавала значных намаганняў, каб не дапусціць замаруджвання тэмпаў адукацыі насельніцтва. У Магілёве ўжо летам 1924 г. адкрыліся курсы па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы педагагічных кадраў, ствараліся беларускамоўныя падручнікі. Аўтарам аднаго з іх — «Беларуская чытанка» — стаў потым і наш зямляк, загадчык сямігодкі А.П.Шышонак. Хаця і цяжкі гэта быў час у матэрыяльных адносінах, але падручнікі для вучняў закупляліся тады за бюджэтныя сродкі.

Рамантаваліся старыя і будаваліся новыя школы. Праз 4 гады іх стала ўжо 48. У 1928 г. за школьнай партай па раёне сядзелі 3645 хлопчыкаў і дзяўчынак. У гэтым жа годзе ў Слаўгарадзе быў узведзены новы будынак для сямігодкі. Цяпер яе магчымасці значна павялічыліся. У 1929/30 навучальным годзе тут былі 3 пятыя класы, 2 шостыя і 1 сёмы.

А вось каб вучыцца далей, атрымаць сярэднюю адукацыю, трэба было ехаць ужо ў Быхаў ці Магілёў. І ехалі, а нярэдка з-за адсутнасці грошай ішлі пешшу. Толькі б вучыцца. Большасць моладзі імкнулася працягваць вучобу і пасля сямігодкі. І толькі перад самай вайной некалькі астыла цяга да асветы. Шмат сялянскіх дзяцей, скончыўшы 7 класаў, больш не ішлі ў школу. У 1940 г., пачынаючы з 8-га класа, была ўведзена плата за навучанне — 150 руб. у год. Такія грошы тады ў вёсцы мела рэдка якая сям'я.

Год ад году паляпшалася эканамічнае становішча раёна. Ствараліся новыя і рэканструяваліся старыя прамысловыя прадпрыемствы, пашыралі выпуск прадукцыі, мацнела і сельская гаспадарка. У 1929 г. пасяўная плошча перавысіла даваенную і складала 30 322 га. Больш ураддлівымі сталі глебы.

Паспяховае развіццё эканомікі дазволіла дзяржаве адпускаць больш сродкаў і на медыцыну, якая з дарэвалюцыйнага часу і да стварэння раёна не зрабіла наперад амаль ні кроку. Яшчэ і сёння ў Слаўгарадзе захаваўся аднапавярховы цагляны будынак былой раённай бальніцы, разлічанай на 10 ложкаў. Як сведчыць выкладзеная на франтоне дата, ён быў узведзены ў 1908 г. Побач з ім каля шашы — драўляны будынак, які служыў амбулаторыяй. У ім штодзённа праводзілі прыём хворых два фельчары — Вавілаў і Дудкоў. Трэці фельчар, стары ўжо чалавек, па прозвішчы Шуміла, выдаваў парашкі і мікстуры, што выпісвалі яго калегі. Вось і ўвесь персанал раённай паліклінікі таго часу. У 1930 г. паліклініку ўзначальваў урач Варапаеў. Ён рабіў агляд хворых у час абходу па палатах. Акрамя раённай дзейнічала бальніца ў в. Лясная, ды яшчэ ў Старынцы быў урачэбны пункт. У пачатку 1930-х гадоў пачалі адкрывацца ў вёсках — цэнтрах сельсаветаў —фельчарска-акушэрскія пункты, у штаце якіх спачатку быў толькі адзін фельчар. Потым увялі і акушэрку, але часцей за ўсё абедзве гэтыя пасады займаў адзін

чалавек з сярэдняй медыцынскай адукацыяй.

Медпункты разам з сельсаветамі, клубамі і хатамі-чытальнямі ўсё больш прыцягвалі ўвагу сялян. Вялікім святам для іх станавіліся дні, калі ў вёску прыязджала кінаперасоўка. Спачатку фільмы дэманстраваліся «нямыя», бо гукавога кіно яшчэ не было. Пасля ўтварэння Слаўгарадскага раёна ў жыццё жыхароў мястэчка, а таксама цэнтраў сельсаветаў пачаў уваходзіць тэлефон. У 1926 г. правадная сувязь была ўстаноўлена і з Магілёвам.

Разам з усім гэтым у лексікон насельніцтва ўсё больш упэўнена ўваходзілі новыя словы: «камуна», «таварыства», «калгас», «саўгас», «МТС». З 1927 г. у раёне пачалі ствараццa калектыўныя гаспадаркі — праобразы будучых калгасаў: «Перадавік» у Слаўгарадзе, імя С.М.Будзённага ў Свенску і іншых вёсках. Краіна, а разам з ёй і Слаўгарадчына падыходзіла да мяжы, з якой пачнецца ўпартая і доўгая барацьба за суцэльную калектывізацыю. І на шляху да яе будзе зроблена нямала памылак з абодвух бакоў. Аднак большасцю насельніцтва праводзімыя пераўтварэнні ўспрымаліся як адзіна правільныя і горача падтрымліваліся, асабліва беднатой. Яна і ў калгасы ішла добраахвотна. Цяжэй было з серадняком і заможным селянінам — кулаком. Яны перш за ўсё траплялі ў няміласць мясцовых кіраўнікоў. У лютым 1931 г. шмат гаварылі аб падзеях у в. Дашкаўка. Імкнучыся хутчэй пакончыць з кулакамі і дасягнуць лепшых паказчыкаў у калектывізацыі сельскай гаспадаркі, мясцовыя кіраўнікі ўсю сваю працу зводзілі да лаянкі, пагромаў і прымянення фізічнай сілы. Іх дзеянні сталі вядо-



Калгаснікі каля праўлення сельгасарцелі «Ленінец». 1931 г.

мы ў райвыканкоме і райкоме партыі. Старшыня сельсавета Сцяпанаў атрымаў вымову, а міліцыянера Давыдзенку выключылі з кандыдатаў у члены партыі і завялі на яго крымінальную справу.

У той час у найбольш складаных умовах апынулася тая частка сялян, якую, згодна з партыйнай установкай, знішчалі як клас. Кулакоў (а гэта часцей за ўсё былі самыя працавітыя сяляне) не прымалі ў калгасы. Нават тых, хто ў самым пачатку ўступіў у кааператыўныя гаспадаркі, потым выключалі з іх, расцэньваючы сам факт прыёму як «прымірэнне з кулакамі і заможнікамі». Менавіта так запісаў у «Акце агляду Ракцянскай ячэйкі КП(б)Б ад 12.10.1931 г.» упаўнаважаны Слаўгарадскага райкома партыі С.К.Жураўкоў. Сваю выснову ён зрабіў на падставе таго, што ў калгасе «Далёкі Усход» марудзілі справу аб выключэнні з арцелі кулака Аўчыннікава і дапусцілі памылку пры прыёме ў яе «цвёрда абкладзенага» Ігната Зарэцкага.

Палітыка ізаляцыі заможнай часткі сялянства, якая складала ў раёне ў 1928 г. 496 уласных гаспадарак (251 з іх мела па 3 кані і 3—4 каровы і 145 — па 4 ці больш коней і столькі ж кароў), выклікала з яе боку моцнае супраціўленне. Гэта была сапраўдная класавая барацьба, якая вялася ўсімі даступнымі сродкамі. Паводле архіўных матэрыялаў за 1928 г., у в. Рэкта кулакі забілі двух коней сакратара сельсавета Напрэева. У в. Кулікоўка 18 ліпеня яны падпалілі хату, у якой кватараваў каморнік Казакоў. Агнём былі знішчаны асабістыя рэчы каморніка і дакументы аб надзяленні зямлёй мясцовай беднаты. У ноч з 17 на 18 верасня згарэла гумно селяніна Агея Казлова, які не паслухаўся кулацкай агітацыі і ўступіў у калгас. 4 кастрычніка згарэў дом і гумно старшыні калгаса «Васькавічы».

У вёсках Гіжэнскага сельсавета нечакана пачалі з'яўляцца антысавецкія лістоўкі. А праз некаторы час у лясным сховішчы былі знойдзены і матрыцы, з якіх яны рабіліся. У Целяшах выявіліся факты антыкалгасных і антысеміцкіх настрояў. Настаўнік мясцовай школы Уладзімір Жураўкоў складаў вершы і распаўсюджваў сярод сялян, якія іх ахвотна чыталі: «Дзве гармоні, адзін бубен — у калгасе жыць не будзем, усю бульбу папячом і з калгаса ўцячом» і іншыя. У в. Улукі вучаніца Шурхіна, дачка былога арандатара вадзянога млына і гандляра, гаварыла: «Мужыцкім пастановам і батрацкай уладзе падпарадкоўвацца не буду». Жураўковы, Шурхіны і іншыя добра ведалі вёску, яе жыхароў, ведалі, у каго і як закрануць балючую струну.

У пастанове бюро райкома КП(б)Б ад 26.5.1931 г. адзначалася, што ў раёне калектывізацыя ідзе з апераджальнымі тэмпамі і замест 35% запланаваных на 20.1.1931 г. склала ў сярэднім па раёне 43%.

Да жніўня 1934 г. у раёне было ахоплена кааперацыяй 65,2% гаспадарак, у тым ліку па Ржаўскаму сельсавету — 48, Іванішчавіцкаму — 56, Слаўгарадскаму — 57,4.

З канца 1931 г. пачала выходзіць раённая газета «Калгасны шлях». Яе рэдактарамі ў розны час былі Клімаў, Каган, С.Л.Тумарынсон.

У ходзе пераўтварэння жыцця на сацыялістычны лад у вёсках раёна, дзе былі створаны сельсаветы, дзейнічалі, як правіла, партячэйкі, камсамольскія, асаавіяхімаўскія, мопраўскія і іншыя грамадскія арганізацыі. Яны аб'ядноўвалі актыўных прыхільнікаў савецкай улады. У гэтых вёсках адчыняліся клубы, хаты-чытальні. Усё гэта садзейнічала перабудове вёскі.

У канцы 1929 г. на Слаўгарадчыну было накіравана 8 дваццаціпяцітысячнікаў з завода «Чырвонае

Сормава»: С.Н.Баранаў, А.І.Галадухін, Ільін, Мухін, Рагожын, Самадураў, Трубнікаў, Яршоў. Галадухін працаваў у Гіжэнскім сельсавеце, Самадураў спачатку ў калгасе «Чырвоны Партызан» (Васькавіцкі сельсавет), а потым у адным з калгасаў Гіжэнскага сельсавета. Добрыя ўспаміны пакінуў пасля сябе Мухін у калгасах «Ленінец» і «Чырвоны Сцяг», якія ён дапамагаў ствараць. Баранаў у чэрвені 1931 г. быў накіраваны Слаўгарадскім райкомам КП(б)Б на вучобу ў Камуністычны універсітэт Беларусі. Разам з дваццаціпяцітысячнікамі актыўна змагаліся за ўсё новае, лепшае мясцовыя камуністы, камсамольцы, ветэраны Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны Г.Н.Акуліч, М.Е.Батоўкін, Д.І.Бяляцкі, С.В.Гаўрыленка, Р.Ц.Ерашэнка, П.С.Каплінскі, А.А.Кірэеў, І.Н.Марчанка, К.Л.Маргелаў, П.А.Несцераў, П.І.Старавойтаў, Ф.Ф.Старахазяеў, Е.С.Сцяпанаў, І.Е.Тарасаў і многія іншыя. Самай вялікай узнагародай ім былі дасягнутыя поспехі. А яны нарошчваліся з кожным годам. Калі да 1927 г. у раёне было 644 бясконныя гаспадаркі, а 236 карысталася сахой, то праз 10 гадоў аб гэтай прыладзе і не ўспаміналі. Сялянам ужо не былі ў навіну трактар, аўтамабіль, іншая сельскагаспадарчая тэхніка. Толькі ў Слаўгарадскай МТС на пачатак 1938 г. мелася 56 трактароў, 5 збожжаўборачных камбайнаў, 14 складаных малатарань, 4 грузавыя аўтамашыны. Прыкладна столькі ж тэхнікі было ў Жалезінскай МТС. Шэраг калгасаў раёна набылі свае машыны-палутаркі. У пачатку лістапада 1935 г. адбыўся пробны пуск мясцовай электрастанцыі магутнасцю 35 кВт, у 369 дамах і кватэрах жыхароў раёна загаварыла радыё. З уводзеннем у 1939 г. у строй новага радыёвузла колькасць радыёкропак дасягнула 5 тысяч.

У сялянскія хаты прыйшло не толькі радыё, але і матэрыяльны дастатак, асабліва там, дзе калгасы змаглі



А.І.Галадухін.

хутчэй стаць на ногі, дзе былі больш гаспадарлівыя кіраўнікі. Але такіх гаспадарак было нямнога. Большасць ледзь зводзілі канцы з канцамі. Праца ў гэтых калгасах аплачвалася дрэнна і то толькі ў канцы года. Карміліся сяляне ў асноўным з прысядзібнага ўчастка ці з пабочнага заробку, калі яго ўдавалася знайсці. Але з цягам часу мясцовыя ўлады пачалі забараняць сялянам пакідаць вёску. Затое для моладзі былі адкрыты ўсе жыццёвыя шляхі. Ад яе патрабавалася толькі адно — добра вучыцца. Тады можна было пайсці ў ВНУ, тэхнікум, на курсы трактарыстаў, у фабрычна-заводскія навучальныя ўстановы. Для юнакоў асаблівым гонарам было трапіць у ваеннае вучылішча. Да гэтага рыхтаваліся яшчэ ў школе: здавалі нормы СПХА, займаліся ў гуртках «Варашылаўскі стралок», радыёаматараў і інш.

Святкаванне 20-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі праходзіла ў раёне пад знакам падрыхтоўкі да першых выбараў у Вярхоўны Савет СССР. Асаблівы ўздым перадвыбарнай кампаніі надавала тое, што ў ліку іншых гонар быць вылучаным кандыдатам у дэпутаты ўдастоіўся Мікіта Ермалаевіч Батоўкін — першы ў раёне кавалер ордэна Леніна.

Аднак мірная праца жыхароў Слаўгарадчыны, як і ўсіх савецкіх людзей, была перарвана нападам гітлераўскай Германіі на СССР.

*П.С.Ерашэнка.*

## Першыя крокі «Аратага № 2»

У 1921 г. на зямлі былога памешчыка Мурамцава была створана калектыўная гаспадарка над назвай «Араты № 2». Яна налічвала 60 сямей, якія добраахвотна вырашылі весці калектыўную апрацоўку зямлі. Першыя крокі «Аратага № 2» пачыналіся так.

### ЗАЯВА Ў БЫХАЎСКІ ПАВЯТОВЫ ЗЕМАДДЗЕЛ

Ввиду того, что отведенной нам земли в имении Михайлова недостаточно для нашей артели, поэтому просим Уземотдел сделать надлежащее распоряжение об отводе нам участка земли в количестве 50 д (пятьдесят десятин) в урочище «Малеев ров», граничущем с нашей землей.

Председатель У.Берлин

Секретарь Т.Масинский

*Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобл. Ф. 83. Воп. 1. Спр. 150.*

### ПАСЯДЖЭННЕ ЗЕМЛЕЎПАРАДКАВАЛЬНАЙ КАМІСІІ

**27 студзеня 1921 г.**

Слушали: дело об отводе участка земли под с.-х. трудовую артель «Пахарь» Пропойской волости и протокол от 12 сентября 1920 года, составленный землемером Кратевенским о запроектировании под артель «Пахарь № 2» двух участков, обозначенных на чертежах.

Постановили: настоящее дело включить в план работы 1921 года.

Председатель С.Антонов

Члены (подписи)

Секретарь (подписи)

*Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобл. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 4. Л. 13.*

## Так нарадзілася вёска

**З успамінаў Фядота Панкратавіча Пагодзіна**

У дарэвалюцыйны час назву «Ганчароўка» нельга было сустрэць ні ў дакументах, ні на якіх там картах Слаўгарадчыны. Таму што яе тут зусім не было. А дзе зараз яна ёсць, раней была зямля памешчыка Каморскага. А вось менавіта яго не памятую. Іх было з дзесятак ці больш братоў і сясцёр, і ў кожнага свой маёнтак з сотнямі дзесяцін зямлі. Гэта прозвішча было шырока вядома не толькі ў нашых мясцінах, але і на ўсёй Быхаўшчыне, ды, бадай, і на Магілёўшчыне.

Але прыйшоў час, і Каморскія адсюль зніклі. А гэта зямля дасталася беднякам. Першым у 1922 г. сюды перасяліўся я. Затым пабудавалі свае хаты браты Ерашэнкі — Аляксандр, Антон, Апанас і Ціхан, Васіль і Мікалай Пагодзіны, Васіль Саўчанка. Усяго дванаццаць гаспадарак.

Дружна зажылі мы адной сям'ёй. Яно і вядома, бо мы адчувалі радасць жыцця, шчасце. І гэта дружба аб'ядноўвала нас у нешта падобнае на калгас. Дарэчы, слова «калгас» увайшло ў наш лексікон не ў пачатку 1930-х гадоў, як лічаць некаторыя з нас, а значна раней. Яшчэ калі мы толькі будавалі свае хаты, каля Слаўгарада ўжо ўзнікла калектыўная гаспадарка «Араты № 2». Менавіта па яе прыкладу мы стварылі машыннае таварыства «Адраджэнне». Мяне абралі яго старшынёй.

З дапамогай дзяржавы купілі конную малатарню, ільнамялку, сартыроўку, акучнікі. Апрацоўку зямлі, абмалот збожжа і многія іншыя работы праводзілі сумесна. Своечасова ўправіўшыся ў сваёй гаспадарцы, дапамагалі сялянам — іншавяскоўцам. Таму і не дзіўна, што калі пачалася масавая калектывізацыя, то, скажам, нашых суседзяў васькаўцаў не трэба было агітаваць за калгас.

# Ты ж наш бацька, парай, што рабіць

З такім пытаннем не раз звярталіся сяляне да старшыні ЦВК БССР А.Р.Чарвякова, калі той летам 1924 г. зрабіў 1200-верставую паездку па Беларусі. Разам з Чарвяковым падарожнічаў пісьменнік Міхась Чарот. Яго нататкі з падарожнага блакнота друкаваліся на старонках газеты «Савецкая Беларусь».

## 1200 ВЁРСТАЎ ПА БЕЛАРУСІ

### З падарожнага блёк-ноту

**13 чэрвеня**

...А ў воласці Рэкта, некалькі дзесяткаў вёрст ад Доўска, ужо нас чакалі з самай раніцы. З бліжайшых вёсак сяляне даведаліся, што будзе ехаць усебеларускі староста Чарвякоў. Прыйшлі нарачна пабачыць, пагутарыць.

Спачатку старшыня валіспалкома Дзергачоў... Зайшлі ў воласць...

Большасць вывесак на беларускай мове. Чуваць і гутарка беларуская...

Гэта адзін з глухіх куткоў нашай Савецкай краіны. А каля воласці расце і шырыцца грамада сялян...

Сяляне сталыя — барадачы. Ёсць нават такія сярод іх, што ў турэцкай вайне пабывалі.

Большасць апрануты ў святочныя світкі — абшытыя чорнай тасемачкай каўнер, берагі ў падоле і кішэні. Гэта і ёсць характэрная беларуская світка, якую ў Меншчыне трудна адшукаць... Толькі часам на сцэне прыходзіцца бачыць. А тут, у Магілёўшчыне, гэта яшчэ жыве.

Кабеты таксама ў вопратках саматканых — разнакаляровых андараках, са старынным убраннем на галаве... Вачэй няможна адарваць!

Так гэта ўсё выглядае прыгожа.

Ніводнай крамнай вопраткі так і не давялося спаткаць.

— У нас усе так ходзяць, — адказвае сялянін на маё запытанне, — няма грошай крамнае купляць. Ды сваёй работы тканіну прыемней на целе насіць... Так бацькі і дзеды нашы жылі... Сабраліся ў школу. Кабеты каля парогу стаяць, а мужчыны паселі на лаўкі. Папрасілі пазваленне закурыць... Дзяды сівабародыя пэхкаюць люлькі, вачэй не зводзяць з усебеларускага старасты...

Чарвякоў кажа невялічкую прамову, апавядае, што яму прыйшлося бачыць, праязджаючы беларускія вёскі... Старыя хаты, бедныя сяляне, худая жывёла. Але ёсць настрой, ёсць вера ў свае сілы, — а гэта самае галоўнае...

Ну, а далей пашлі гутаркі.

— Ты ж наш бацька, таварыш Чарвякоў, парай, што рабіць: хаты ды хлеўчыкі пагнілі, як і самі заўважылі, едучы праз нашу вёску, а лесу няма новага будаваць... Пойдзем гнілое палена дроў узяць, ці галля паломанага — вартаўнікі тапор адбіраюць ды яшчэ ў суд цягнуць за самапраўную парубку лесу... Уся вёска без тапара жыве, — лясніцтва пазабірала.

Мне адразу прыпомнілася куча тапароў і піл, якую сапраўды паказваў ляснічы...

— Самі не ведаем, што рабіць. Воласць не дапамагае, чакае загаду з павету, а павет і пагэтуль справы не вырашае, як дастаць лесу...

Зямлі таксама мала. Шмат хто хоча выехаць адгэтуль, а рэшта сялян хоча на хутары выселіцца, — няможна далей так жыць, цяжка...

— А як зямлю думаеце размяркоўваць?

— Падушна!... Усе хочуць падушна!..

Больш двух гадзін вялася гутарка... Пасля сходу мы зайшлі да сялян-жыдоў. Тут іх ёсць некалькі гаспадарак. Гаспадарку вядуць ужо даўным-даўно і вядуць ня горш усіх сялян...

Досыць пажылы гаспадар нас прыемна спаткаў і пачаў гутарыць аб сваёй працы, — як ён перайшоў да сельскай гаспадаркі...

Ужо падыходзіў вечар, і мне прышлося патарапіць Аляксандра Грыгоравіча ехаць далей...

Застанавіліся ў Прапойску. Тут спаткалі Чарвякова зусім ужо арганізавана, з чырвонымі сцягамі.

— Ня-хай жы-ве ўсе-бе-ла-рускі ста-рас-та та-ва-рыш Чар-вя-коў! — несліся па вуліцы гучныя выкрыкі камсамольцаў і піянераў, якія стаялі каля воласці ў стройных шарэнгах... Начальнік міліцыі падышоў з рапартам, як гэта і водзіцца. Прыйшлося толькі пазнаёміцца са школьнай выстаўкай, дзе вучні, камсамольцы і

піянеры прымусілі разам з імі сфатаграфавацца...

Пад гучнае «ўра» шматлікай згаміды мы пакінулі Прапойск.

У чырвоным бляску заходзячага сонца купаліся бярозы і сосны абапал дарогі. Аўтамабіль з шумам нёсся ўперад і ўперад. Толькі паламаныя масты прымушалі сцішыць ход. Шофер на кожным мосце паціху запускаў моцнае слаўцо...

Здалёку пачалі паказвацца сярод зеляніны будынкі...

Гэта віднеўся Чэрыкаў...

М.Ч-Т

*Савецкая Беларусь. 1924. 28 чэрв.*
*Падрыхтаваў Я.А.Ерашэнка.*

## Дысцыпліна была жалезная

**З успамінаў камсамольца 1920-х гадоў М.Ігудзіна**

Нам, камсамольцам дваццатых гадоў, якія жылі ў Слаўгарадзе, давялося прымаць удзел у барацьбе з ворагамі савецкай улады. Мы заўсёды былі напагатове. Па першай баявой трывозе з'яўляліся ў свае штабы, патрулiравалі вуліцы горада, выязджалі ў засады супраць бандытаў, абясшкоджвалі сабатажнікаў. Многія нашы аднагодкі з атрадамі ЧОН ішлі на грамадзянскую вайну і на фронце праяўлялі мужнасць і гераізм разам з чырвонаармейцамі. Адна з галоўных задач камсамольцаў, якія заставаліся на месцы, заключалася ў тым, каб вырваць моладзь з-пад уплыву буржуазных элементаў, дапамагчы ёй пакончыць з перажыткамі старога свету. Для гэтага трэба было самім вучыцца. І мы вучыліся, вучыліся цярпліва, настойліва. Камсамольскія сходы і палітвучоба праводзіліся адзін раз у тыдзень. Не памятаю такога выпадку, каб хто-небудзь з камсамольцаў не з'явіўся на сход або на палітвучобу. Дысцыпліна была жалезная.

Асабліва жорсткая была барацьба з амаральнымі праступкамі маладых людзей. Камсамольца, які хоць раз прыклаўся да спіртнога, неадкладна выключалі са сваіх радоў. Не было ніякай літасці таму, хто спраўляў рэлігійныя абрады або трымаў у хаце абразы.

Ініцыятыва біла крыніцай. Нястомным выдумшчыкам, любімым нашым важаком быў Міша Самадзелаў. Умеў ён падабраць справу кожнаму па душы, выявіць і накіраваць у патрэбным кірунку здольнасці, якіх іншы раз не заўважаў і сам малады чалавек. Міхаіл Самадзелаў загінуў у гады Вялікай Айчыннай вайны.

## З камсамола пачынаўся наш лёс

**З успамінаў першага важака ржаўскіх камсамольцаў М.Шаройкіна**

Камсамолу я асабіста абавязаны вельмі многім. І не будзе перабольшваннем, калі скажу: з камсамола пачаўся мой лёс, пачалося маё жыццё, хоць мне ў той час і нямала год было. Пра дзяцінства ўспамінаць цяжка: бацькі батрачылі ў памешчыцы Мурамцавай, і пра ўмовы жыцця тут гаварыць будзе лішнім. Да таго ж у час імперыялістычнай вайны бацька трапіў на фронт і мы з маці засталіся адны. Жылі ў маёнтку памешчыцы, а калі ў семнаццатым тая ўцякла за мяжу, давялося перабрацца ў вёску, бо маці засталася без работы. Так мы сталі жыць у Ржаўцы. Маці працавала ў кулакоў на сезонных палявых работах, а я стаў пасвіць кулацкую жывёлу — трэба было неяк зарабіць кавалак хлеба.

У той час (а было гэта ў 1923 г.) даведаліся мы, што ў Жаролах створана камсамольская ячэйка і што камсамольцы супраць эксплуатататараў, за рэвалюцыю і за лепшае жыццё для ўсіх працоўных. Сакратаром ячэйкі быў чалавек, якога глыбока паважалі ў нас бедпякі, а кулакі ненавідзелі — Аляксей Лутаў, студэнт Ленінградскага рабфака. Вельмі хацелася і мне стаць камсамольцам, быць падобным на Аляксея. Быў шчаслівы, калі ў тым жа годзе атрымаў камсамольскі білет. На гэтым скончылася маё батрацтва: кулак Салдаценка прагнаў мяне, бо, як і належыць камсамольцу, я ўдзельнічаў у выяўленні і канфіскацыі ў кулакоў хлеба, які яны хавалі ад савецкай улады.

Але без работы я не застаўся. Па пу-

цёўцы райкома камсамола пайшоў працаваць старшынёй мясцовага камітэта прафсаюза батракоў (рабземлес). У абавязкі ўваходзіла сачыць за выкананнем правоў батракоў у двух сельсаветах — Ржаўскім і Кульшыцкім.

Асноўныя праблемы, якія хвалявалі нас, камсамольцаў, мы абмяркоўвалі на сходах ячэйкі. Сходы праходзілі ў Жарольскай школе, што была пабудавана земскім упраўленнем. Настаўніцамі там працавалі камсамолкі М.Залеская і Н.Арлова. Яны ахвотна давалі памяшканне школы для правядзення сходаў, а самі вучылі нас грамаце.

Камсамол станавіўся ў вёсцы аўтарытэтнай сілай. Многія юнакі і дзяўчаты выказвалі жаданне стаць камсамольцамі, нягледзячы на тое, што кулакі вялі шалёную агітацыю супраць камсамола, бальшавікоў, прарочылі тым, хто ўступіць у камсамол, розныя зямныя і нябесныя кары. Вядома, вялі сваю агітацыю і мы. Райком камсамола даручыў мне стварыць камсамольскую ячэйку ў Ржаўцы, і такая ячэйка была створана. Праўда, напачатку яна была невялікая — усяго пяць чалавек, але затое гэта былі самыя смелыя, адданыя рэвалюцыі і савецкай уладзе хлопцы і дзяўчаты. Сакратаром ячэйкі выбралі мяне. Многія пытанні хвалявалі ячэйку. І ліквідацыя непісьменнасці насельніцтва, і актыўнае садзейнічанне органам савецкай улады, і барацьба з кулакамі. Вялікую дапамогу нам аказваў старшыня Ржаўскага сельсавета Аніськаўцаў, у той час адзіны камуніст ва ўсім Савеце.

## Пасёлкі

У 1925 г. у раёне прайшло землеўпарадкаванне. Вёскі разбіваліся на пасёлкі, невялікія вёсачкі ў 8—12—15 двароў. У ліку такіх была і мая родная Бярозаўка. Вось як гэта адбывалася...

Раней амаль усе беларускія вёскі былі вялікія. Ад цеснаты яны ўжо даўно задыхаліся, але ж, нягледзячы на гэта, працягвалі ўшчыльняцца. Яшчэ больш вёска задыхалася ад малазямелля і беззямелля.

Гадамі, дзесяцігоддзямі ўздоўж рэзаліся і так ужо вузкія палоскі на яшчэ больш вузкія. Яны, гэтыя палоскі, стаўшы яшчэ вузейшымі, ператвараліся ў доўгія шнуры. Нараджаліся дзеці, выраслі, ствараліся новыя сем'і, абзаводзіліся гаспадаркай. Бацька пры аддзяленні наступнага сына выдзяляў яму надзел зямлі. Ды і дачка, якая выходзіла замуж, павінна была атрымаць па дамоўленасці з жаніхом нейкі кавалак зямлі. І зноў пачынаўся падзел, ад якога ўсім рабілася яшчэ больш кепска. Асабліва цяжкім быў лёс селяніна ў вялікіх сем'ях, дзе нараджаліся і выраслі хлопцы. А былі ж сем'і, дзе тых хлопцаў было па 2—3, а то і па чатыры і нават болей... Што і казаць, цяжка падзяліць той шнур на адпаведную колькасць яшчэ больш вузкіх шнуроў зямлі.

І вось у 1925 г. так званая прышчэпаўшчына дакацілася да нашых мясцін: праводзілася зямельная рэформа тагачасным наркомам земляробства БССР Дз.Ф.Прышчэпавым. І хоць сам аўтар гэтага ўпарадкавання ў 1930-я гады быў аб'яўлены «ворагам народа», а яго рэформа названа «прышчэпаўшчынай», перыяд гэты быў цікавы. Рэформа наблізіла людзей да актыўнай, творчай працы, вывела іх у нейкай меры з галечы і нястачы. Людзі адчулі сябе сапраўднымі гаспадарамі і хутка пачалі абжывацца.

Але ідэя Прышчэпава аб утварэнні пасёлкаў была ўспрынята неаднազначна. Гаспадары, якія мелі дастаткова зямлі і якім уперадзе не пагражаў яе падзел на палоскі, — скептычна, з насмешкай, — і не збіраліся перасяляцца на пасёлкі, тым больш, што справа гэта была строга добраахвотная. Другія ж, што мелі даволі вузенькія палоскі, а то і зусім іх не мелі, гэтую навіну сустрэлі з радасцю і надзеяй.

У Бярозаўку прыехалі два камортнікі — Рапапорт і Шубадзёраў. Прыбылі яны, каб падзяліць усю зямлю на пасёлкі, надзяліць усіх зямлёй пароўну ў адпаведнасці з колькасцю душ у сям'і, г.зн. «дзялілі зямлю па едаках».

Пасяліліся яны ў хаце (хата была больш прасторная і чыстая) Сідара Іванова, гаспадара больш заможнага. Абшчына вёскі ўзяла камортнікаў на сваё поўнае забеспячэнне. Кожны двор здаваў для харчавання прыехаўшым пэўную

колькасць прадуктаў. Людзі стараліся прынесці ўсё лепшае, што мелі, бо гэта ж каморнікі! У вёсцы было больш за 120 двароў. Такой грамадой можна было добра харчаваць спецыялістаў, хоць і не ўсе жылі з дастаткам.

Пасёлкі атрымалі назвы ўрочышчаў, у якія перасяляліся людзі, — Сядзіба, Бутошныя, Крушынікі, Скрып'е, Ліцін, Палой, Навінка. Падбіраліся гаспадаркі па жаданні, потым цягнулі жэрабя. Дзесяць гаспадарак, у тым ліку і мае бацькі, атрымалі зямлю ва ўрочышчы Ліцін. Знаходзілася яно за 3—4 км ад цэнтра вёскі. Зямля тут нікім ніколі не ўгнойвалася, таму лічылася пустэчай, неўрадлівай. Бо хто ж павязе той гной далёка, калі побач былі землі. Яны ўвесь час і ўгнойваліся. А такія мясціны, як Ліцін, Скрып'е і іншыя, называліся «вераб'інымі пагнойкамі». «Памруць галадранцы з голаду на «вераб'іных пагнойках», — казалі тыя, хто працівіўся перасяленню.

На пасёлкі выйшлі сапраўды галадранцы. Ведаю добра па становішчы гаспадароў, якіх выдзелілі на наш пасёлак; гэта былі самыя бедныя ў вёсцы людзі. Але як ні цяжка было, людзі перабраліся на пасёлак, і дзесяць вясковых хат выстраіліся ў адзін рад, утварыўшы новае паселішча. А побач зямля вёскі Заглiннае. Страшна ўспомніць, як мы зімавалі першую зіму ў чыстым полі. Наша гаспадарка перабралася на пасёлак першай. Бацька на зіму паехаў на заработкі на шахты. Хату нашу занясло снегам, ноччу прыходзілі ваўкі і шнырылі вакол пуні, дзе была жывёла. Вады не было. Растаплялі снег.

Наступны год быў весялейшы. Перабраліся астатнія гаспадары, сталі думаць аб стварэнні хоць якіх-небудзь умоў для жыцця. Зямлёй надзялілі дастаткова. Кожнай гаспадарцы дасталося па сядзібе, па паласе і яшчэ па засценку. Паколькі зямля лічылася няўдобіцай, то давалі яе ў большай колькасці. Калі ў сям'і быў хлопец, то зямля давалася яшчэ на аднаго едака. Да зямлі дадаваўся кавалак лесу. Праўда, лес быў не стары, але дрэвы для пабудовы надворных будынкаў усё ж былі. І людзі пачалі будавацца, старанна працавалі на зямлі. І ў першы год атрымалі вельмі добры ўраджай карняплодаў, капусты. Са збожжавымі культурамі было горш. Выручыла тады ўсіх нас грэчка. Так! Менавіта грэчка на першых парах дапамагла людзям стаць на ногі. Яе намалочвалі тады па 40—50 пудоў. А побач, у в. Целяшы, былі дробныя прадпрыемствы: крупадзёрка і вадзяны млын. Такім чынам, мы мелі і бліны і кашу.

Праходзілі гады. Зямля памалу ўгнойвалася, пачала даваць нядрэнныя ўраджаі жыта, ячменю, пшаніцы, бульбы.

Перасяленцам дзяржава давала пазыку. Атрымаўшы яе, у Слаўгарадзе можна было набываць плугі, бароны і іншы інвентар, мінеральныя ўгнаенні. Да гэтага трэба дадаць, што з райцэнтра калінікалі наведваўся да нас у вёску і аграном, даваў парады. Менавіта па яго падказцы перасяленцы пасадзілі фруктовы сад — першы сад у вёсцы. Праз 3—4 гады ён пачаў ужо пладаносіць. На градках паявіліся клубніцы, чаго ў вёсцы ніколі не было.

Памятаю, калі бацька прывёз са Слаўгарада суперфасфатную муку і сеяў яе на паласе, то суседзі смяяліся і казалі, што чалавек займаецца глупствам — сее муку па зямлі. А калі на наступны год яны сталі побач з жытам, якое было вышэй росту чалавека, то і самі потым пачалі карыстацца гэтай жа мукой.

Зашумелі, загаманілі нівы на пасялковых палетках. Зямля шчодра плаціла за добрасумленную працу. І што важна — цёмны, непісьменны мужык сваім адвечным чуццём тварыў цуд. Не было ні ўказанняў зверху, ні павучанняў, калі і што сеяць. Поўная свабода дзеянняў на сваёй зямлі. Толькі час ад часу прыязджалі аграномы, давалі парады. Людзі сталі праяўляць інтарэс і цікавасць да грамадскага жыцця, пацягнуліся да газеты, кнігі. Любімымі газетамі былі «Беларуская вёска» і «Магілёўскі селянін». Сходы праводзіліся ў старой вёсцы ў школе, куды збіраліся людзі з усіх пасёлкаў. Школа была адзіным ачагом культуры і асветы ў вёсцы. Працаваў адзін настаўнік Пётр Андрэевіч Ляшчоў. Бывала, настаўнік скажа: «Дзеці, сёння ўвечары, як толькі сцямнее, будзе сходка.Скажыце сваім бацькам, каб прыходзілі». Гэтых слоў было дастаткова, каб увечары сабралася столькі людзей, што школа і ўмясціць іх не магла. Многія стаялі ў калідоры, пад вокнамі школы. Скажу прама, што такой актыўнасці, такой зацікаўленасці людзей

я больш ніколі не бачыў. Былыя галадранцы сталі людзьмі сытымі, многія ўжо лічыліся серадлякамі. А прайшло ўсяго якіх-небудзь пяць год. Хутка пачалася калектывізацыя. А калі б яшчэ працягнулася тое жыццё гадоў пяць—дзесяць, то я ўпэўнены, што з былых галадранцаў большасць ператварылася б у тых гаспадароў, якіх у час калектывізацыі назвалі кулакамі і ліквідавалі іх як клас.

*В.А.Драздоў.*

## Але адкрываўся іншы шлях...

Канец 1929 г. і пачатак трыццатых прынеслі трывожныя весткі —загаварылі пра калектывізацыю. Люд вясковы, сялянства аднесліся насцярожана і, можна сказаць, з недаверам да новай палітыкі партыі і ўрада. Я не падзяляю думкі і выказванні тых, хто сцвярджае, што сялянства адзінадушна і з вялікай радасцю сустрэла вестку аб аб'яднанні ў калгасы. Нараджаліся калгасы ў надзвычай цяжкай і драматычнай абстаноўцы. Сяляне — народ асцярожны, яны баяліся расстацца са сваёй гаспадаркай, пазбавіцца ўласнай зямелькі, коніка, інвентару, стаць на невядомы шлях жыцця. Бо яшчэ не было такога, каб людзі ўсёй вёскай сталі адной гаспадаркай. Таму упаўнаважаным асобам даводзілася доўга і ўпарта растлумачваць людзям перавагу калгаснага ладу жыцця над дробнаўласніцкім вядзеннем гаспадаркі. Добра памятаю, як ствараўся калгас у той жа Бярозаўцы, якая ў 1925 г. рассялілася на пасёлкі. Звычайна праводзіліся сходы ў школе. І цікава тое, што людзі праяўлялі актыўнасць. На сходы прыходзілі не толькі мужчыны, гаспадары, а і жанчыны. Так што на сходах шмат якія сем'і былі ў поўным саставе. Вось як праходзіў сход. Аб'яўляўся парадак дня, за сталом прэзідыум —упаўнаважаны з раёна, звычайна і старшыня сельскага Савета. Упаўнаважаны рабіў даклад. Людзі слухалі напружана, не прапускаючы ніводнага слова. Здавалася, што зала поўнасцю пагаджалася з прамоўцам, які расказваў пра будучае райскае жыццё людзей у калгасе. Даклад скончаны. І тут пачыналася тое, што цяжка перадаць. Прэзідыум прапаноўваў запісвацца ў калгас або падаваць заявы. У зале ўсчынаўся гоман. Чуваць было галасы жанчын, якія тут жа накідваліся на сваіх мужыкоў, падазраючы іх у жаданні запісацца ў калгас. Частка людзей пакінула ўжо сход, частка выходзіла, частка спрачалася. Вынік — ніякі. Калгас не ўдавалася стварыць. І гэтак працягвалася доўга. У 1931 г., нарэшце, калгас быў створаны.

Тры гаспадаркі склалі яго аснову — Нічыпар Варанцоў, Іван Сазонаў і Пімен Кручкоў. Іх даволі вялікія сем'і і сталі асноўнай працоўнай сілай новай калектыўнай гаспадаркі. Моладзь, камсамол адыгралі значную ролю ў арганізацыі калгасаў. Камсамольцы Бярозаўкі са сваім сакратаром Кручковым Стафанам сталі калгаснікамі.

У калгас уступілі настаўнік вясковай школы Ляшчоў Пётр Андрэевіч і сакратар сельскага Савета Балукоў Цімафей Аляксеевіч. Вось які быў калгас на першых кроках.

У 1931 г. праходзіў IX з'езд камсамола. І па прапанове нашага важака Кручкова Стафана мы калгас назвалі «IX з'езд ВЛКСМ». Стафан Кручкоў належаў да тых маладых людзей, якія прынялі да сэрца камуністычныя ідэі, і ўсе свае сілы і здольнасці аддаваў справе перабудовы вёскі на новы лад. Ён стаў першым старшынёй калгаса. Потым вучыўся на рабфаку. Стаў настаўнікам. У 1941 г. добраахвотна пайшоў на вайну і загінуў. Актыўнымі калгаснікамі былі камсамольцы Варанцоў Пятрок, Сазонавы Панцялей і Макар.

Летам, у час сенакосу, у калгас уступілі Драздоў Аляксандр, Прусаў Аляксей, Шкабронаў Мікалай. На наступны год — яшчэ некалькі гаспадарак. І ў 1933 г. у вёсцы ўжо мала засталося аднаасобнікаў. Трэба сказаць, што для больш эфектыўнага ўздзеяння на селяніна, каб яго каапераваць, была і праведзена тая кампанія, якая называлася ліквідацыяй кулацтва як класа на базе суцэльнай калектывізацыі. І тут бязлітаснае кола рэпрэсій падмяла пад сябе сумленных працавітых людзей, даўшы ім назву «кулакі». Гэта ў першую чаргу было папярэджанне ўсім, хто сумняваўся ў перавазе калгаснага ладу над аднаасобніцкім.



К.А.Цішчанка.

Памятаю хаты Бярозаўкі таго часу. У большасці з іх, бывала, калі зойдзе чалавек і стане на падлогу, то тая дошка, на якую ён ступіў, крутнецца на супрацьлеглы край хаты. Бо дошкі не былі прыбіты і нагадвалі прапелер ад самалёта. Ваконцы маленькія з пабітымі шыбінамі. І толькі адна хата ў вёсцы асабліва выдзялялася — Аўхіма Петрачонка. У яго на падлозе, калі разальеш ваду, то яна нідзе не знойдзе шчыліны, каб выцечы. На вокнах у яго налічнікі, усё добра выглядала. За гэта ён першым і быў выдвараны і са сваёй хаты, і з вёскі, сасланы як кулак. І яшчэ тры гаспадары — Воранавы Макар і Лазар, удзельнік грамадзянскай вайны, і Кручкоў Майсей. Не абмінуў такі ж лёс і Сідара Іванова, у якога ў свой час кватаравалі каморнікі.

Дагэтуль не магу зразумець філасофію партыйных дзеячаў таго часу і погляд на лад жыцця чалавека. Калі чалавек з большага апрануты, ды мае на стале нешта добрае з'есці, то такі чалавек выклікаў у партыйца нянавісць, ён абавязкова павінен быў з'яўляцца варожым элементам. Вось узор прамовы старшыні сельскага Савета таго часу на сходзе ў вёсцы: «Таварышы! Заходзім мы да (тут называецца прозвішча «прыступніка»), дык ён паставіў на стол скавараду жаранага сала і жрэць... Сала жрэць... І гэта ў той час, калі людзі не маюць нават бульбіны. Вось да чаго мы дажыліся, таварышы! Ён (зноў называецца прозвішча) сала з салам есць, сала пад галаву кладзе, салам накрываецца, столькі ў яго сала...»

Вядома, што пасля такой прамовы старшыні, уладальнік сала павінен быў па начах чакаць гасцей, якія адпрэчуць яго ад сала. Калі я прывяду прыклады, за што забіралі людзей, то цяпер гэта можа выклікае ўсмешку. Але тады было не да смеху.

Знік з вёскі на ўсё жыццё Сідараў Даніла, Гапеенак Данілка, як яго звалі ў вёсцы. А справа была так. Ішоў сход. Даніла, мастак расказваць розныя прыгодніцкія байкі, раптам падыходзіць да стала прэзідыума і пытаецца:

— А дзе гэта падзеліся сялёдкі? Бывала пойдзеш у Чавусы, дык ля Бэркавай лаўкі назбіраеш галоў з сялёдак поўную торбу. А цяпер ні сялёдак, ні галоў. Як быў царом Мікола-дурачок, дык была булка — пятачок...

— Пачакай дзед, — сказаў начальнік ДПУ, які быў на сходзе ўпаўнаважаным. Як забраў ён Данілку, дык яго і па сённяшні дзень няма.

Маленькая вёсачка Дашкоўка таго ж Целяшоўскага сельсавета (па даваенным адміністрацыйным падзеле), а колькі адтуль знікла людзей у трыццатыя гады.

Жыхар яе Грудзіна Аляксандр Іосіфавіч зацікавіўся гісторыяй гэтай маленькай вёсачкі. У першую чаргу яго непакоіў лёс дзеда Грудзіны Аляксандра Васільевіча, раптоўна прапаўшага ў 1937 г. Пасля доўгіх пошукаў унук атрымаў такую паперу:

*СПРАВКА*

*Выдана настоящая Грудино Александру Иссифовичу в том, что постановление особой тройки НКВД БССР от 18 сентября 1937 г., которым был осужден Грудино А.В., 1887 года рождения, к расстрелу, постановлением Президиума Могилевского облсуда от 9 августа 1988 года отменено, а уголовное дело прекращено на основании ст. 5. п. 2 УПК БССР. Грудино Александр Васильевич реабилитирован посмертно. К моменту ареста в 1937 г. работал бригадиром в колхозе «Ленинский путь».*

*Председатель Могилевского обл. суда В.Попенюк*

У сваёй заяве пракурору Магілёўскай вобласці Грудзіна А.І. пісаў: «Пасля XX з'езда КПСС у 1957—1958 гг. у вёску прыехаў таварыш з абласной пракуратуры, распытваў пра людзей, якіх у 1930-я гады рэпрэсіравалі (а іх у вёсцы было дзесяць чалавек), хто яны такія, чым займаліся. Пасля гэтага яны як быццам былі рэабілітаваны як невінаватыя, з іх

сямей знялі ярлык «сем'і ворагаў народа», «дзеці ворага народа», іх блізкія сталі карыстацца ўсімі правамі савецкіх людзей».

Пасля грамадзянскай вайны ў в. Улукі вярнуўся ліхі кулямётчык Кірыла Цішчанка. Ён вызваляў і абараняў г. Сімбірск і іншыя гарады Паволжа. Быў цяжка паранены пры вызваленні Сімбірска, пасля выздараўлення трапіў на дзянікінскі фронт.

І вось былы чырвонаармеец становіцца праваднікам ідэй партыі на вёсцы. Ён арганізаваў беднату вёскі на раздзел панскай зямлі. А калі пачалі арганізоўвацца калгасы, ён адзін з першых ва Улуках становіцца калгаснікам. А потым і старшынёй калгаса. Людзі верылі яму і ішлі за ім. І калгас, які насіў імя старшыні ЦВК БССР А.Р.Чарвякова, стаў перадавой гаспадаркай у раёне. У 1936 г. за добрыя паказчыкі ў вытворчасці Цішчанку пасылаюць на 2-і з'езд калгаснікаў-ударнікаў. Мала ўжо засталося тых, хто сваёй працай падымаў калгасную гаспадарку. Сам Кірыла Анісімавіч успамінаў ужо ў апошнія гады свайго жыцця: «Наш калгас лічыўся багацейшай гаспадаркай у раёне. Дастаткова сказаць, што ў той час ужо калгас меў уласны грузавы аўтамабіль. Праўда, людзі жылі не вельмі раскошна, апраналіся бедна. Улетку на работу хадзілі разутымі» (Ленінскае слова. 1968. 8 чэрв.).

Калгас тады наведаў старшыня ЦВК Чарвякоў. Радасная была сустрэча з калгаснікамі. Ніхто тады не ведаў, што чакала Чарвякова і чарвякоўцаў. Не вытрымала ганьбы шчырае сэрца сумленнага чалавека. Чарвякоў, абняслаўлены і аднесены да «ворагаў народа», пусціў сабе кулю ў сэрца ў 1937 г.

А хутка і ліхі кулямётчык быў схоплены і пайшоў па дарогах перасылак і этапаў. І толькі ў 1947 г. паявіўся Цішчанка на радзіме. Зноў калгаснікі даверылі яму калгас, выбралі старшынёй. І зноў сякера ката заносіцца над ім, ён зноў рэпрэсіраваны. Якімсьці цудам на гэты раз яму ўдалося вырвацца з учэпістых лап чэкістаў.

Цяжка цяпер дакладна расказаць пра ўсіх, хто стаў ахвярай тых чорных дзён. Няхай жа тая праўда, якая прарвалася з глыбіні гадоў і засведчыла жудасныя праявы канібалізму перыяду сацыялістычнага будаўніцтва ў нашым раёне, будзе светлай памяццю ўсім тым, хто не названы на старонках гэтай кнігі, хоць і стаў ахвярай тых часоў.

*В.А.Драздоў.*

## Пацягнуліся людзі да ведаў

**З успамінаў В.А.Драздова, былога загадчыка Слаўгарадскага райана**

Кампанія лікбеза ўскалыхнула вёску, адкрыла людзям вочы на значэнне ведаў у жыцці чалавека. І яны зусім інакш сталі глядзець на школу. «Не змаглі вучыцца мы — няхай цяпер вучацца дзеці», — гэтак гаварыла тады большасць сялян, калі заходзіла размова пра школу. Толькі, на жаль, школ было вельмі мала. У канцы 1920-х — пачатку 1930-х гадоў у раёне дзейнічала адна сямігодка і 47 пачатковых, галоўным чынам аднакамплектных школ, школьных будынкаў амаль не было. А памяшканні для вучобы арэндаваліся ў сялян, якія мелі больш прасторныя хаты. У Ляцягах, Целяшах і некаторых іншых вёсках, у якіх раней былі прыходы, школы размяшчаліся ў памяшканнях, канфіскаваных у служыцеляў культу, а ў Гіжэнцы — у былым доме памешчыцы Целепаніхі.

У 1925/26 навучальным годзе ў в. Бярозаўка ўвайшла ў строй новапабудаваная школа. Яна мела два вялікія класныя пакоі і памяшканне для кватэры настаўніка. Спачатку заняткі праводзіліся толькі ў адным пакоі. У другім наладжваліся сялянскія сходкі. І толькі ў 1930—1931 гг. школа стала двухкамплектная і пачалі выкарыстоўвацца абодва памяшканні. Вось як праводзіліся заняткі ў аднакамплектнай школе, дзе адзін настаўнік адначасова працаваў з чатырма класамі. Памяшканне застаўлена партамі. Пасярод стаяць дзве вялізныя дошкі, якія служаць для ўсіх чатырох класаў, аддзяляючы іх адзін ад аднаго.

Такім чынам у адным вуглу размешчаны, скажам, чацвёрты клас, а за дошкай у процілеглым вуглу — трэці. І так у наступнай паласе памяшкання. Настаўнік

стаіць пасярод і вядзе ўрок: некаторыя класы атрымліваюць самастойныя заданні і працуюць. З адным з класаў па чарзе настаўнік вядзе вусна работу, час ад часу падыходзіць да самастойна працуючых класаў, правярае, як яны выконваюць заданне.

Калі было няшмат вучняў, настаўнік паспяхова спраўляўся са сваімі абавязкамі. Але пазней, з павелічэннем цягі сялянскіх дзяцей да навукі, у класах ужо стала па 20 і больш вучняў. Займацца з 80 ці больш вучнямі аднаму настаўніку стала вельмі цяжка. Трэба было інакш арганізоўваць навучанне. Гэтак у 1930 г. здзейсніўся пераход на двухкамплектныя школы. Інакш кажучы, адзін настаўнік стаў весці два класы, а хутка на кожны клас быў свой настаўнік. І вучыў ён дзяцей з 1-га па 4-ы класы. Безумоўна, гэта спрыяла і лепшай працы педагога, і рабіла больш дасканалым навучанне дзяцей.

Сямігадовая школа імя 1 Мая размяшчалася ў Слаўгарадзе на развілцы дарог, што вядуць да Сожа і царквы. Тут, на левым баку ад дарогі, стаяў школьны будынак, так званая ў народзе «прымітыўка» (зараз на гэтым месцы стаіць дом Астапавых), а насупраць быў пабудаваны новы школьны будынак. Школу спачатку ўзначальваў Восіп Яўціхіевіч Дамарацкі, ён жа быў і выкладчыкам фізікі. У 1930 г. загадчыкам школы стаў Алесь Пракопавіч Шышонак, настаўнік беларускай мовы. Выкладчыкам фізкультуры быў Аўхім Мікалаевіч Бібікаў, у далейшым дырэктар сярэдняй школы ў Віцебску, які загінуў у Айчынную вайну пры вызваленні Кіева ў званні палкоўніка авіяцыі. Настаўнічалі тут у тыя гады Аляксандр Ніканоравіч Лешчанка — геаграфія і руская мова, гісторык Іпаліт Рыгоравіч Дзямідаў. Марыя Фёдараўна Ружачка выкладала нямецкую мову.

У 1930/31 навучальным годзе ўпершыню былі адкрыты пятыя класы ў Гіжэнцы і Гайшыне. Праз тры гады тут былі ўжо сямігодкі. У 1932—1933 гг. адкрываюцца сямігодкі ў кожным сельсавеце. Спачатку камплектаваліся і вучыліся пятыя класы, а затым яны развіваліся ў няпоўныя СШ. У наступныя гады ствараліся сямігодкі і ў некаторых вёсках, якія не з'яўляліся цэнтрамі сельсаветаў (Бярозаўка, Міхайлоў). А сямігодкі, што дзейнічалі ў вёсках Васькавічы, Гайшын, Гіжэнка, Кульшычы, Рабавічы, Старынка, Целяшы і іншых, у сярэдзіне 1930-х гадоў пачалі перарастаць у сярэднія. І да пачатку 1941 г. сталі сярэднімі школамі.

Акрамя таго ў самім Слаўгарадзе ў 1931 г. была адкрыта яўрэйская сямігодка. Дырэктарам яе быў Майсей Шаевіч Салодкін. Школа праіснавала да 1937 г., калі па ўказанні з Масквы на Беларусі былі закрыты ўсе школы нацыяльных меншасцей.

## Раённыя з'езды Саветаў

Раённыя з'езды Саветаў праводзіліся штогод. На з'ездах вырашаліся самыя разнастайныя пытанні гаспадарчага і культурнага будаўніцтва.

Захаваўся парадак дня 3-га раённага з'езда Саветаў, які адбыўся 5 сакавіка 1926 г.:

1. Справаздача акрвыканкома.
2. Справаздача райвыканкома.
3. Землеўладкаванне і пытанні сельскай гаспадаркі раёна.
4. Раённы бюджэт.

На чарговым з'ездзе Саветаў у 1927 г. акрамя справаздач акрвыканкома і райвыканкома разглядаліся такія пытанні, як «Практычныя мерапрыемствы па гаспадарчым будаўніцтве», «Вынікі і далейшыя задачы па аказанні дапамогі бядняцкім гаспадаркам у вёсцы» і іншыя.

## Цікавы гэта быў час

### З успамінаў ветэрана вайны і працы Д. Старавойтава

Успамінаюцца далёкія гады, першыя гады пасля ўтварэння Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

У той час працаваў я ў арцелі, у якой было дзесятка паўтара сталяроў. У асноўным рабілі школьныя парты і венскія крэслы, аконныя рамы і іншае па заказу вясковых і гарадскіх жыхароў. Так было

амаль два гады. Затым на аснове гэтай арцелі стварылі камбінат.

Па тым часе гэта было сапраўднае прамысловае прадпрыемства. У нас ужо дзейнічалі машыннае аддзяленне, сталярны, колавы, гонтавы, крэславы, слясарны, бляшаны, кавальскі і іншыя цэхі. Выраблялі металічныя трубы, колы, дэталі для венскіх крэслаў і самі крэслы, былі ў нас гантарэзныя станкі. Дзейнічалі філіялы камбіната ў вёсках Сычын, Хатыжын Краснапольскага раёна, Вепрын Чэрыкаўскага раёна і ў самім Чэрыкаве. Наша прадукцыя вельмі была патрэбна народнай гаспадарцы і асабліва насельніцтву вёскі.

Бурна ў тыя гады развівалася прамысловасць, хаця па сённяшнім часе яна і была вельмі прымітыўная. А калі стварылі два такарныя цэхі, для гараджан і вяскоўцаў гэта была навіна і радасць. У Слаўгарадзе дзейнічалі млын, арцель па вырабе кошыкаў і скрыняў з лазовых прутоў. Асноўнымі майстрамі былі саматужнікі-адзіночкі, якія аб'ядналіся ў арцель.

Памятаю і вяровачны цэх, што знаходзіўся каля сучаснага масласыраробчага завода. Выраблялі звычайныя вяроўкі для продажу мясцовым жыхарам, канаты для флоту і іншых заказчыкаў. Быў і пашывачны цэх, дзе шылі адзенне для насельніцтва. Першым начальнікам нашага камбіната быў Шлабкоўскі. Пад яго кіраўніцтвам працавалі ўсе арцельныя цэхі ў Слаўгарадзе, а таксама філіялы.

Непадалёку ад таго месца, дзе зараз размяшчаецца гарадская лазня, была сплаўная. Адсюль сплаўлялі плытамі стойку для шахтаў, бярозу для фанернай прамысловасці, асіну на запалкі і іншы матэрыял.

Была ў горадзе і свая маслабойня. Выраблялі масла ўручную, самым прымітыўным спосабам, а першай работніцай на ёй была Зінаіда Бондарава.

Самым вялікім і галоўным цэхам лічыўся дрэваапрацоўчы. У ім налічвалася каля 160 рабочых. У той час пачалі ствараць вучнёўскія брыгады з ліку падлеткаў. Я прайшоў ужо загартоўку ў старшага майстра Івана Рудольфавіча Вестараля.

Цікавы гэта быў час. З энтузіязмам працавалі людзі.



Дэлегаты 3-га раённага з'езда Саветаў.

6. Зак. 4744.

## Іх ніхто не агітаваў

### З успамінаў Васіля Фядотавіча Васількова, жыхара в. Гайшын

Шмат напакутаваліся мае аднавяскоўцы ад мясцовага пана Парэмбскага. Не лічыў ён сялян за людзей. Ды што сялян! З ім судовую цяжбу вяла, дайшоўшую аж да Пецярбурга, яго ўласная жонка. Толькі пры савецкай уладзе мае землякі пачалі людзьмі сябе адчуваць. Таму і гатовы былі яны і сілы і жыццё аддаць за партыю, за ўрад, якія клапаціліся пра народ. Трэба было змагацца з ворагам — ішлі, змагаліся і сыны, і бацькі ў адных радах. Пачалі народную гаспадарку ўздымаць — рабілі гэта па-мужыцку ўпэўнена, не шкадуючы сіл. У канцы 1920-х гадоў пайшлі чуткі аб перабудове вёскі, і тут яны апынуліся ўперадзе. Іх ніхто не агітаваў і зброяй не пагражаў. А яны ўзялі і стварылі таварыства па сумеснай апрацоўцы зямлі і самі назвалі яго «Іскра». Спачатку іх было трое — трое Васільковых: Фядот Карнеевіч, Нічыпар Ермалаевіч і Даніла Ермалаевіч. Потым да іх далучыліся Яўстаф'еў Мікалай Ісакавіч, Пракапенка Міхаіл Іванавіч і Пракапенка Фядот Іванавіч. За гэтымі пацягнуліся яшчэ 10 гаспадарак. Ім адвялі 270 га зямлі паміж Гайшынам і Барсукоўкай, і восенню яны ўпершыню пасеялі жыта. А ў наступным годзе ў «Іскру» пайшлі амаль усе гайшынцы. Гэтак узнік калгас «Ленінец». Ён існуе і цяпер, але, на вялікі жаль, Чарнобыль, закрануўшы Пасожжа, наклаў і на яго лёс свой жахлівы адбітак. І чароўныя мае родныя мясціны прыходзяць у заняпад.

## Дэлегаты з'езда — ударнікі

В Пропойске на днях закончился второй ударный съезд колхозников. В районе 33 колхоза. Они объединяют 1230 хозяйств. Коллективизация составляет 16 процентов.

После двух дней съезд прервал свою работу, делегаты мобилизовали себя на организацию сталинского прилива. Разделившись на бригады, все делегаты разъехались по районам. Результаты двух дней массово-разъяснительной работы подтвердили, что съезд был действительно ударным и что на нем собрались лучшие колхозные энтузиасты. Ударники организовали 11 новых колхозов. Социалистический сектор приобрел еще 326 новых хозяйств.

Женщины деревни Железинка организовали к своему празднику колхоз имени 8 Марта. В колхоз вошли 15 хозяйств. Новые колхозницы приняли на себя обязательства — до весны довести коллективизацию своей деревни до 100 процентов.

В деревне Машецкая Слобода, в этой окутанной религиозным дурманом и распропагандированной кулаками деревне, организовался колхоз имени Демьяна Бедного. Большевистская весна вызвала к жизни новые колхозы — «Сталинский прилив», «Ворошилова», «Красный борец», «Возрождение» и др.

44 колхоза и 22 процента коллективизации по району — вот показатель ударной работы съезда. Вождь ленинской партии тов. Сталин избран почетным делегатом на Всебелорусский съезд колхозников. Президиум съезда получил 20 заявлений от колхозников, решивших вступить в партию.

*Бригадиры «Рабочего» Агрaпов, Иванов*
*Газета «Рабочий». 1931. 20 марта.*

## Усё трымалася на сумленні

### З успамінаў заслужанай калгасніцы Хрысціны Іванаўны Крыловай

Калгас у нашай вёсцы ўтварыўся ў 1930 г. Напачатку нямнога сямей запісалася, але вельмі хутка калгаснікамі стала амаль уся вёска. Называўся наш калгас «Другая пяцігодка». Старшынёй быў Сцяпан Пятровіч Масленікаў. Жылі тады на пасёлку Садыкіна, на былой кулацкай зямлі, куды перасялілі нас, бяднейшых. Пасёлак патанаў у садах — адсюль і назва. За садамі адразу ж арганізавалі догляд, здавалі яблыкі дзяржаве.

Былі ў калгасе дзве брыгады. Адну ўзначальваў Кірыла Фёдаравіч Цімафееў, другую — мой пляменнік Аляксей Рыгоравіч Крылоў.

У кожнай з брыгад — па 30 жанчын,

мужчыны, хлопцы. На працадзень плацілі — адна назва ад той платы, але працавалі людзі сябе не шкадуючы. Варвара Карпаўна Прачкіна, Таццяна Елісееўна Краўцова, Анісся Сяргееўна Аўдзеева за дзень па два працадні выжыналі.

І не патрэбны эпітэты да працы першых калгасніц, калі ўдакладніць, што два працадні — гэта паўгектара жыта ці ячменю, зжатых уручную, сярпом. А потым тое ж жыта, прасушанае ў ёўні, малацілі: днём — адну ёўню, ноччу — другую.

А ці лёгка даваўся лён? Вось пералічу толькі, чаго ён патрабаваў: сеялі, палолі, бралі, слалі, падымалі, адбельвалі, сартавалі, трапалі. А рукі ж адны, вось і зноў ноч выручала. Дый калі яно лягчэй. На сяўбу — з цяжкім лубком, а як садзілі бульбу, дык адна з жанчын ішла папераздзе — гной з фартуха ў баразну ўкладвала, другая — клала клубні. Не адпачнеш і зімой — вывозілі дзяржаве лес. За сякеры і пілы браліся і мы, жанчыны.

Не цураліся ніякай цяжкай працы Таццяна Варэнікава, Вулляна Свірыдзенка, Праскоўя Кухарава. Яны ішлі за бараной, за плугам. А потым на падмогу прыйшлі першыя прывольскія трактарысты. Спарней закіпела праца на калгасных палетках.

Хапала працы на ферме, дзе патрабавалі догляду каровы, авечкі, коні, куры, свінні.

Па трыста і болей працадзён зараблялі ў год. Не проста адбытых у полі ці на ферме дзён, а стомных будняў, у якія не выканаць адведзены брыгадзірам аб'ём работ — сораму не абярэшся, ды і сумленне не дазволіць.

Не заробіш той працадзень — страта матэрыяльная, канешне, невялікая. Але як жа на людзей паглядзіш, прагуляўшы. Усё на сумленні трымалася.

## Газета ў барацьбе з «ворагамі народа»

**Па старонках газеты «Калгасны шлях» за 1934—1935 гг.**[1]

На думку некаторых гісторыкаў, масавыя рэпрэсіі ў СССР пачалі разгортвацца пасля таго, як 1 снежня 1934 г. у Ленінградзе быў забіты вядомы партыйны дзеяч, бліжэйшы паплечнік І.В.Сталіна Сяргей Міронавіч Кіраў. Слаўгарадцы маюць усе падставы, каб з такім доказам не пагадзіцца, бо ў іх у раёне ўсё гэта пачалося раней. Не апошняе месца ў гэтай чорнай справе адыграла раённая газета «Калгасны шлях». Узяўшы жорсткі курс на барацьбу з «ворагамі», яна актыўна шукала іх усюды: у лесе і на калгаснай ферме, у полі і ва ўстановах. Матэрыялы гэтай тэматыкі друкуюцца на яе старонках з нумара ў нумар. Іх пішуць ананімныя аўтары — Зоркі, Наглядаючы, Вучань і інш. Але часцей за ўсё яны змяшчаюцца пад рубрыкай «Пісьмы працоўных», і па кожнаму з іх рэдакцыя настойліва патрабуе суровага пакарання вінаватых. Перад рэдактарам С.Л.Тумарынсонам дрыжыць увесь раён, нават сам пракурор. Вось толькі невялікая частка таго націску і запужвання, якія абрушваліся на людзей са старонак газеты.

**23 лістапада 1934 г.**

ДА ЎВАГІ РАЙЗА

Аб МТФ калгаса імя Варашылава Гайшынскага сельсавета газета «Калгасны шлях» ужо пісала. Аднак праўленне калгаса не прымае ніякіх мер для таго, каб ачысціць ферму ад класава-варожых элементаў.

Тут па-ранейшаму дойшчыцай працуе Марчанка Л. (муж за антыкалгасную дзейнасць асуджан на 5 год).

Даглядчыца за цялятамі Камандзенка В. таксама ўвесь час крадзе малако ад цялят. Сын яе Іван (быў асуджан на 5 год за антыкалгасную дзейнасць) зараз працуе пастухом і ўкраў 5 авец.

РайЗА павінна зацікавіцца работай калгаса імя Варашылава.

**15 снежня 1934 г.**

ЛЯПЁШКІН САБАТУЕ ЛЕСАВЫВАЗКУ І ЗАГАТОЎКІ

Калгас «Маяк» Іванішчаўскага сельсавета да гэтага часу зусім не прыступіў

[1]Захаваны тагачасныя стыль і арфаграфія.

да загатовак і вывазак леса. Старшыня гэтага калгаса зусім адмовіўся заключыць умову з леспрамгасам на лесазагатоўкі і вывазкі. Ён разважае па-кулацкі: «Не наша гэта справа — лесазагатоўкі і вывазкі».

Так можа разважаць толькі кулацкі агент. Іваніпічаўскаму сельсавету трэба прыняць рашучыя меры да сабатажніка Ляпёшкіна.

*Зоркі*

**19 снежня 1934 г.**

## КУЛАЦКАЯ ВЫЛАЗКА Ў КАЛГАСЕ «БАЛЬШАВІЦКІ СЕЎ»

Шкодніцкі вырубае лес брыгада калгаса «Бальшавіцкі сеў» (Каменскага сельсавета), якая працуе на ўчастку Старынскай дачы... [Так называліся вялікія масівы дзяржаўных лясоў.] Старшыня калгаса Васіленка зусім не звяртае ўвагі на работу калгаснай брыгады.

Між тым гэта брыгада на чале з брыгадзірам Аксёнавым Змітраком нанесла вялікія страты дзяржаве, працуя па-кулацкі.

У выніку гэтага папсавана 15 куб. м запалкавай асіны, 10 куб. м бачкаркі.

Брыгада сучча на броўнах не ачышчае, астаўляе вялікія пні. Месцы высечкі зусім не ачышчаюцца, чым складаюцца ўмовы для размнажэння караеда і немагчымасці лесавывазкі. 15 снежня, калі брыгада леспрамгаса на чале з нам. дырэктара т. Забаўскім прыехала правяраць якасць работы калгаса «Бальшавіцкі сеў», мела месца кулацкая вылазка.

У адказ на заяву т. Забаўскага аб неадкладным спыненні кулацкай работы, брыгадзір Аксёнаў і калгаснікі Анціпенка Ф. і Галычоў П. накінуліся на яго з тапарамі. Толькі дзякуючы прысутнічанню работнікаў ЛПГ гэтыя кулацкія агенты былі затрыманы.

*Кляноў*

**Ад рэдакцыі:** Рэдакцыя патрабуе ад райпракуратуры тэрміновага расследавання гэтых фактаў.

**19 снежня 1934 г.**

## НАМ ПІШУЦЬ

У калгасе «Чырвоны ўдарнік» Целяшоўскага сельсавета дрэнна даглядаюць жарэбных конематак. Яшчэ і зараз конематкі не вызвалены ад цяжкіх работ. У выніку гэтага ёсць выпадкі абарціравання.

Аб гэтым ведае праўленне калгаса (старшыня Янушэўскі), але ніякіх мер не прымае.

Сельскаму Савету неабходна прыняць суровыя меры да тых, хто па-драпежніцкі адносіцца да конематак.

*Вучань*

**19 снежня 1934 г.**

У Рэцянскім сельсавеце ёсць выпадкі знішчэння маладняка. Так, калгаснік з калгаса імя Ягорава Шамалой Мікіта зарэзаў цёлку, дырэктар Рэцянскай НСШ таксама зарэзаў цёлку. Сельсавет замест таго, каб прыняць самыя суровыя меры да знішчальнікаў маладняка, абыходзіць гэта пытанне маўчаннем, чым патурае знішчальнікам маладняка.

*П.Ф.*

**28 снежня 1934 г.**

## СУРОВА ПАКАРАЦЬ ЗНІШЧАЛЬНІКАЎ МАЛАДНЯКА

У Целяшоўскім сельсавеце за апошні час наглядаюцца выпадкі драпежніцкага ўбою маладняка.

Так, у калгасе «Чырвоны ўдарнік» гэтага сельсавета 16 і 17 снежня калгаснікі Зымалеў С. і Сазонаў С. зарэзалі сваіх цялят. Між тым, гэтыя калгаснікі яшчэ не разлічыліся з дзяржавай па мясапастаўках 1934 года. Зымалеў яшчэ не здаў дзяржаве 25 кг мяса.

Калгаснікі, даведаўшыся аб гэтым факце, патрабуюць суровага пакарання для драпежнікаў маладняка.

*Наглядаючы*

**Ад рэдакцыі:** Рэдакцыя ўжо змяшчала сігналы з Рэцянскага сельсавета аб маючыхся там фактах драпежніцкага знішчэння маладняка. Змяшчаючы сёння матэрыялы аб фактах знішчэння маладняка, рэдакцыя звяртае ўвагу РайЗа на неабходнасць прыняцця суровых мер да знішчальнікаў маладняка. РайЗа і сельсавету трэба зараз жа ў корані прасекчы ўсе спробы кулацкіх агентаў знішчыць маладняк.

**1 студзеня 1935 г.**

## ДАКУЛЬ ПРАКУРОР ТАВ. ДАРАШКЕВІЧ БУДЗЕ МАРЫНАВАЦЬ СПРАВУ АБ АБАРТАВАННІ КАБЫЛ?

7 кастрычніка 1934 г. у паведамленні бюро РК КП(б)Б і Прапойскага РВК было запісана: «За драпежніцкія

адносіны да захавання жаробых матак па калгасу «Перамога» (з 15 конематак абартавала 3 конематкі), мяжуючых з праяўленнем шкодніцтва, накіраваных на зрыў вапраізводства конскага пагалоў'я, старшыню калгаса Саладухіна аддаць пад суд. Абавязаць пракурора Дарашкевіча ў 10-ці дзённы тэрмін забяспечыць разгляд гэтай справы ў паказальным парадку. Справы з РайЗА за драпежніцкія адносіны да каня і захавання астатніх відаў жывёлы разгледзіць унечаргі».

З таго часу прайшло ўжо тры месяцы. Як жа райпракурор т. Дарашкевіч выканаў пастанову РК і прэзідыума РВК? Мы можам з усёй адказнасцю адказаць, што тав. Дарашкевіч па-чыноўніцкі аднёсся да выканання гэтага рашэння, чым стаў на шлях патурання драпежніцкіх адносін да каня.

Справу аб абартаванні кабыл пракурор марынуе ўжо некалькі месяцаў.

Да гэтага часу яшчэ не разгледжана справа старшыні калгаса «Перамога» Саладухіна. Дарашкевіч нават не палічыў патрэбным заводзіць справу на Саладухіна.

Толькі 30.10.34 была заведзена справа, якая марынуецца і па сённяшні дзень.

Гэта ні адзінкавы факт. Пракурор марынуе з верасня месяца 1934 года справу аб абартаванні кабыл у калгасе «XVI партз'езд» (Ржаўскага сельсавета). Гэта справа была перадана самім калгасам. У канцы лістапада агульны сход калгаснікаў гэтага калгаса ў другі раз хадайнічаў перад пракуратурай аб прыцягненні злачынцаў да адказнасці. Але хадайніцтва калгаснікаў засталося для пракуратуры пустым гукам.

К гэтаму трэба дадаць, што да гэтага часу не расследаваны справы і не асуджаны вінаватыя ў абартаванні кабыл: з калгаса «Чырвоны ўдарнік» (Целяшоўскага сельсавета), дзе абартавала 4 кабылы (справа перадана 30 лістапада); калгаса «Чырвоная зорка» (справа перададзена 12 лістапада); калгаса «2-я пяцігодка» (Ржаўскага сельсавета, справа перададзена 17 кастрычніка) і іншыя.

Усё гэта гаворыць аб тым, што тав. Дарашкевіч яўна ігнаруе дырэктывы партыі і ўрада аб вапраізводстве конскага пагалоў'я, патурае драпежніцкім адносінам да каня.

Мы пытаемся ў т. Дарашкевіча: дакуль пракуратура будзе марынаваць справы аб абартаванні кабыл?

**13 студзеня 1935 г.**

ЗА ДРАПЕЖНІЦКІЯ АДНОСІНЫ ДА КАНЯ — ПАД СУД

За драпежніцкія адносіны да конскага пагалоў'я, за абартаванне кабыл за апошні час Прапойскім нарсудом асуджаны наступныя асобы:

Па калгасу «Азарычы» (Ржаўскага сельсавета) — Шыванікаў Церах і Земцоў М. — на 1 год прымусовай працы, Гірасаў Сямён — да 3-х месяцаў прымусовай працы.

Па калгасу «2-я пяцігодка» (Ржаўскага сельсавета) — Свірыдзенка Трахім і Бітчанка Іван — да 6 месяцаў прымусовай працы.

Па калгасу імя Будзённага (Рагінскага сельсавета) — Разгонаў Ціхон — да 5 месяцаў прымусовай працы.

Па саўгасу «Чарнякоўка» — Майсеенка Захар — на 1 год прымусовай працы.

Аднаасобнік вёскі Ліцягі (Целяшоўскага сельсавета) Сазонаў Фама за самавольны забой сваяго каня на 1 год.

*Падрыхтаваў А.П.Ерашэнка.*

## Ішла вясна 1935-га...

**З успамінаў Максіма Канстанцінавіча Жуткіна, былога механіка Слаўгарадскай МТС**

Радасна сустрэлі нас, першых выпускнікоў Гарадоцкага тэхнікума механізацыі сельскай гаспадаркі, у Слаўгарадскай МТС.

— Зачакаліся, — коратка зазначыў Мікалай Сідаравіч Койда. Ён таксама быў першым — першым дырэктарам першай на Слаўгарадчыне машынна-трактарнай станцыі. — Вам вельмі рады. У самую пару прыехалі — праз колькі дзён трэба ў поле выязджаць, хлеб сеяць.

Ішла вясна трыццаць пятага. Месяц існавала МТС. Горача нам прыйшлося. Я стаў механікам па сельгасмашынах. Гайшун, таксама выпускнік тэхнікума — старшым механікам. Адказнасць за рамонт

трактароў і сельгасмашын, за надзейную работу тэхнікі, якой чакалі ў вёсцы, прымушала па некалькі дзён, а здаралася і тыдняў запар не быць дома. Не хапала запчастак, не было памяшканняў для захавання тэхнікі, для правядзення рамонту. Вось зараз часам заходжу ў сельгастэхнікаўскія майстэрні — цёплыя, прасторныя, з безліччу памочнікаў механізатара — газаэлектразваркай, пнеўмамолатамі, разнастайнымі станкамі — і ўспамінаю вогнішчы на снезе ў тых далёкіх трыццатых гадах. Палілі такое вогнішча побач з трактарам, пад якім на падасланай саломе корпаўся механік, трактарыст. Палілі вогнішчы ўначы — які той зімовы дзень, а адрамантаваць трактар пры дапамозе ў асноўным гаечнага ключа няпроста. А каб трактар ды падоўгу без руху стаяў — такое лічылі за злачынства, бо ведалі, чаго каштуе калгаснікам прастой нашай небагатай тады і па колькасці, і па прадукцыйнасці тэхнікі. Таму людзей, атрымаўшых эмтээсаўскую перадваенную загартоўку, не магу ўспамінаць без шчымлівай цеплыні, без душэўнага хвалявання. Ніколі не забуду Цімоха Шпакава, Васіля Рыжанкова, Мікалая Мельнікава, Мікалая Баранка, нашых дзяўчат-трактарыстак Пашку Кавалёву, Вулляну Марчанка, Вулляну Аўчыннікаву, Марыю Рыжанкову. Выпаў ім лёс цяжкі, але людзі не збочвалі, не шкадавалі сябе ў рабоце. Днём і ноччу не змаўкаў гул матораў над палеткамі — не маглі мы дазволіць сабе паслаблення. Напачатку ўсім набыткам МТС былі 24 трактары ХТЗ, 2 грузавыя аўтамабілі, легкавушка. Гэтай тэхнікай абслугоўвалі калгасы ў Засожжы, Гайшыне, Свенску, Рагах, Прудку, Васькавічах, Чарнякоўцы.

Была і ў мяне «свая тэхніка». Памятаю, у канцы трыццаць пятага прэміравалі мяне веласіпедам. Вялікім багаццем гэта было па тым часе. Так і праездзіў на тым веласіпедзе да самай вайны. Мая Ганна Ігнатаўна — яна ў дзіцячым садзе працавала — жартавала:

— Каб не веласіпед, ты б, напэўна, і па паўгода дома не паказваўся — часу на дарогу шкадаваў.

## Першыя выбары

12 снежня 1937 г. адбыліся першыя выбары ў Вярхоўны Савет СССР. Нашы выбаршчыкі галасавалі за знатнага конюха Мікіту Ермалаевіча Батоўкіна. У той час мне давялося быць членам выбарчай камісіі свайго выбарчага ўчастка, які знаходзіўся ў в. Ляцягі. Да 12 гадзін дня выбаршчыкаў з'явілася толькі палавіна. Пачакаўшы гадзіну-другую, членаў камісіі паслалі ў тыя хаты, адкуль не прыйшлі выбаршчыкі.

Якраз быў снежны марозны дзень. Днём з агнём некаторых нельга было знайсці ў хатах. У большасці выпадкаў адсутнічалі мужчыны, а іх жонкі наадрэз адмаўляліся галасаваць. Тлумачылі тым, што іх за гэта будуць судзіць, заб'юць або падпаляць. Хтосьці перад выбарамі правёў антывыбарчую прапаганду.

Дні ў снежні кароткія, ужо цямнела а пятай гадзіне, а тут многія не прагаласавалі. У адной хаце нам падказалі, што там у лесе хаваюцца такія-та выбаршчыкі. Мы вярнуліся да выбарчага ўчастка, узялі дзяжурнага каня і паскакалі па іх слядах. Яны і не думалі, што іх там знойдзем. І нечакана яны (чалавек сем) стаялі перад намі. Тут мы ім далі бюлетэні, растлумачылі значэнне выбараў. Яны як адзін укінулі бюлетэні ў скрынку, якую мы вазілі з сабой. Калі выбары заканчваліся і да ўскрыцця урны заставалася хвілін дзесяць, заходзіць адзін выбаршчык і просіць бюлетэнь. «Што вы так позна?» — задаў яму пытанне. Ён адказаў з іроніяй: «Не турбуйцеся, выбары яшчэ не закончаны». Але і да часу іх заканчэння чатыры выбаршчыкі так і не прынялі ўдзел. Чакаць ужо было нельга, і мы пачалі падлік галасоў. Мы везлі ноччу ў райцэнтр бюлетэні, і нашы сэрцы былі не на месцы. Ад'ехаўшы кіламетры тры ад выбарчага ўчастка, сустрэлі аднаго чалавека, які не прыйшоў на выбары.

— Адкуль?! — запыталі ў яго.

— Быў у горадзе, спазніўся, ды зайшоў да родных, думаў паспею, але не. Ці будуць мяне за гэта судзіць?

— Ніхто цябе судзіць не збіраецца, — адказваем яму. — А вось ты папаўся некаму на вудачку. Ідзі з богам.

Раніцай у райкоме здавалі пратаколы

і бюлетэні. М.Е.Батоўкін быў абраны дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР, а яго імя стала вядома ўсёй Беларусі. Нават сам Якуб Колас прысвяціў яму верш.

*П.Е.Кавалькоў.*

**БАТОЎКІН Мікіта Ермалаевіч** (1873, Прапойская вол. Быхаўскага пав. Магілёўскай губ. — 15.1.1947), вядомы беларускі жывёлавод, актыўны ўдзельнік калгаснага будаўніцтва. Член КПСС з 1934 г. Больш за 12 гадоў узначальваў конегадоўчую ферму калгаса «Кастрычнік» Прапойскага (з 1945 Слаўгарадскага) раёна, адну з лепшых на Беларусі, якая ў 1939 г. была ўдзельнікам Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі ў Маскве. У Айчынную вайну інструктар Галоўнага ўпраўлення конегадоўлі Наркамзема СССР. Пасля вайны намеснік старшыні калгаса «Кастрычнік», загадчык конефермы. Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР 1—2-га скліканняў. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, «Знак Пашаны», медалямі.

*БелСЭ. Мн., 1970. Т. 2. С. 181.*



М.Е.Батоўкін.



П.П.Савіцкі.

## Сялянскі сын — рэктар БДУ

Парфен Пятровіч Савіцкі нарадзіўся ў 1904 г. у в. Гайшын Слаўгарадскага р-на ў сям'і беззямельнага селяніна. У 1916 г. скончыў Гайшынскую земскую пачатковую школу, у 1921 г. — Слаўгарадскае вучылішча. Працаваў настаўнікам пачатковай школы ў в. Барсукоўка, потым займаўся земляробствам у бацькавай гаспадарцы. У 1925 г. абраны старшынёй Гайшынскага сельсавета. У 1927 г. уступіў у КП(б)Б. З 1929 па 1931 гг. працаваў сакратаром Слаўгарадскага райвыканкома. У 1934 г. скончыў Камуністычны універсітэт Беларусі, працаваў у ім выкладчыкам гісторыі партыі, быў рэдактарам шматтыражнай газеты «Ленінец». З 1935 г. інструктар Варашылаўскага райкома КП(б)Б г. Мінска, загадчык аддзела школ Мінскага гаркома КП(б)Б, з ліпеня 1937 г. першы сакратар Кагановіцкага райкома, потым сакратар Мінскага гаркома партыі. У 1937 г. завочна скончыў Інстытут чырвонай прафесуры ў Маскве. З 1938 г. член ЦК КП(б)Б. На XVII з'ездзе партыі абраны членам Рэвізійнай камісіі КП(б)Б. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР з 1938 г. У 1938—1947 гг. рэктар Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Памёр у 1968 г.

*В.Ф.Васількоў.*

## Таўкачоўскі смалакурны

На беразе Сожа, непадалёку ад вёскі Таўкачоўка, стаіць смалакурны завод. Гэта адно з нямногіх прадпрыемстваў, узведзеных у першыя гады савецкай улады.

Пабудаваў Таўкачоўскі смалакурны завод Масей Катляр у 1922 г. У той час дзейнічалі два катлы ёмістасцю 8 м$^3$ кожны. Першымі рабочымі-качагарамі былі Ціхан Іванавіч Свірыдаў і Малет Міхайлавіч Клімянкоў.

Працаваў завод на мясцовай сыравіне — асмоле або абгніўшых сасновых пнях. Нарыхтоўку і падвозку смалы рабілі навакольныя жыхары. Цікава, што сасновыя пні не замерваліся метрамі, а ўзважваліся. За кожны пуд карчоў выдавалася пэўная колькасць мукі.

Вугаль, дзёгаць, шкіпінар — вось прадукцыя, якую выпускаў завод. Вугаль і дзёгаць Масей Катляр прадаваў навакольным жыхарам, а шкіпінар адвозіў на баржах у Гомель.

Крыху пазней на базе завода была створана прамарцель. У яе аб'ядналіся жыхары Новай Слабады. Гэта былі ўжо штатныя рабочыя савецкага прадпрыемства.

У час Вялікай Айчыннай вайны завод

быў моцна пашкоджаны. Пасля выгнання фашысцкіх акупантаў яго зноў аднавілі, і ён пачаў даваць прадукцыю.

Цяпер Таўкачоўскі смалакурны завод больш удасканалены. Пры заводзе адкрыты новы цэх, які выпускае воцатна-кальцыевы парашок. Магутнасць завода невялікая, але прадукцыя яго важная. Ён выпускае ў месяц 2100 кг шкіпінару, удвая больш дзёгцю, 9 т вугалю, 1,1 т воцатна-кальцыевага парашку.

Вугаль скарыстоўваецца для мясцовых патрэб, а шкіпінар, дзёгаць, воцатна-кальцыевы парашок адпраўляюцца па прызначэнні.

Многа гадоў працавалі на смалакурным заводзе Іван Ціханавіч Свірыдаў, Зоя Цімафееўна Кардова. Зараз яны пенсіянеры. Але час ад часу наведваюць сваё прадпрыемства, цікавяцца ходам спраў, даюць карысныя парады.

*Я.П.Фурсін.*

## Ад нямога да шырокаэкраннага

### З успамінаў Мікалая Аляксандравіча Пячкоўскага, які 37 гадоў паказваў слаўгарадчанам кіно

Памятаю 1929 г. Тады я быў гарманістам, і адным з папулярнейшых відаў адпачынку былі вечарыны. Я іграў моладзі. Аднойчы пачуў, што ў Слаўгарад прывезлі кіно. Што гэта такое, я не ведаў і не разумеў. Гаварылі, што на сцяне па белым палатне бегалі людзі. Нават не верылася. Неўзабаве я пазнаёміўся з кінамеханікам Васілём Галавачом, які даў мне кніжку пра ўстройства першай кінаперасоўкі. Асвоіў я апарат хутка, бо ён складаўся з невялікага рухавіка, некалькіх механічных вузлоў і ручнога прывода. Каб паказаць кінафільм, трэба была дапамога іншага чалавека. Ён круціў уручную дынамамашыну, і яна давала электрычны ток. Аднаму гэта было не пад сілу, і тады ў чаргу станавілася некалькі гледачоў.

Вядома ж, кіно было нямое, але і яму былі рады. Прывязеш, бывала, у вёску кінастужку, дык туды прыходзілі з усяго наваколля, нават за 7—8 км ішлі.

Трэба адзначыць, што і нямога кіно не хапала. Кінастужку нам прысылаў Аршанскі кінапракат, і адну на месяц. Таму паказаць кінафільм у кожнай вёсцы мы проста не мелі магчымасці і паказвалі толькі там, дзе было больш за ўсё гаспадарак.

Дрэнна было і з памяшканнямі. Летам кіно паказвалі ў гумнах ці хлявах, а зімой у школах, хатах, бо клубаў у той час не было.

У 1935 г. на экраны выйшаў першы гукавы фільм «Паручнік Кіжэ». Яго мы паказвалі ў Слаўгарадзе ў пераабсталяванай сінагозе. І хоць гэта памяшканне ў параўнанні з другімі было больш раскошнае, гледачоў нельга было ўмясціць. Тады ў нас ужо быў новы апарат, але ад гарадской электрасеткі ён працаваць не мог, і я мусіў прыладжваць рухавічок. Гледачы хваляваліся, распытвалі, ці праўда, што кіно гаворыць, а мне самому хутчэй хацелася пачуць голас з экрана.

А колькі пытанняў было потым. Людзям нават пасля таго, што чулі сваімі вушамі, не верылася, і яны ўспаміналі і бога, і чорта, і каго толькі не ўспаміналі. А кіно было гукавое.

Затым пайшлі новыя фільмы «Чапаеў», «Чырвоныя д'ябаляты». Прыходзілася паказваць па некалькі разоў.

З гадамі ўдасканальваўся паказ кінафільмаў. З вытворчасці выходзілі новыя апараты, кінастужкі. У вёсках пачалі будаваць клубы. Цяпер нават у маленькіх вёсках часта паказваюць шматсерыйныя і нават шырокаэкранныя фільмы. Іх якасць выдатная, таму на кожны сеанс заўсёды прыходзіць шмат гледачоў. Калі раней кінастужкі выпускалі нягледзячы на ўзрост гледача, то зараз для дзяцей і школьнікаў выпускаюцца спецыяльныя фільмы. Акрамя мастацкіх можна паглядзець фільмы на тэхнічныя тэмы, пра сельскую гаспадарку, спорт.

Зараз у раёне акрамя кінатэатра працуе 26 стацыянарных і перасовачных установак, а пры кожнай васьмігадовай і сярэдняй школе створаны кінатэатр «Спадарожнік».

Іншы раз гляджу я каляровы шырокаэкранны фільм, успамінаю «Паручніка Кіжэ» і тыя далекія гады, калі ўпершыню круціў прывод, каб самому паглядзець і людзям паказаць цуда на белай сцяне.

## Колькі нас было на 1.1.1938 г.

| №№ пп | Назва сельсаветаў | Колькасць жыхароў |
|---|---|---|
| 1. | Слаўгарадскі местачковы Савет | 1983 |
| 2. | Васькаўскі сельсавет | 3512 |
| 3. | Гайшынскі сельсавет | 1147 |
| 4. | Гіжэнкаўскі сельсавет | 1900 |
| 5. | Іванішчавіцкі сельсавет | 1747 |
| 6. | Каменкаўскі сельсавет | 1882 |
| 7. | Кульшыцкі сельсавет | 2184 |
| 8. | Лапаціцкі сельсавет | 3296 |
| 9. | Рабавіцкі сельсавет | 1489 |
| 10. | Рагінскі сельсавет | 2299 |
| 11. | Ржаўскі сельсавет | 4086 |
| 12. | Старынкаўскі сельсавет | 2396 |
| 13. | Целяшоўскі сельсавет | 3192 |
| 14. | Чарнякоўскі сельсавет | 3106 |
| Усяго | ў сельскай мясцовасці | 34 219 |
| | м. Слаўгарад | 4019 |
| Разам: | | 38 238 чал. |

Паводле перапісу 1926 г. у раёне пражывалі 41 491 чал., у тым ліку 4428 — у Слаўгарадзе. За 12 гадоў колькасць жыхароў паменшылася на 3253. У пэўнай меры на змяншэнне колькасці насельніцтва краю паўплывалі масавыя рэпрэсіі, хваля якіх пракацілася па краіне ў 1930-я гады. Некалькі соцень нашых землякоў яны забралі. Тысячы юнакоў і дзяўчат па камсамольскіх пуцёўках і без іх ішлі з вёскі ў горад: будавалі ДнепраГЭС, БелДРЭС, узводзілі Камсамольск-на-Амуры, шахты Данбаса, Кузбаса, шмат іншых будоўляў. Для тых, хто паспеў скончыць хаця б сямігодку, шырока адчынілі дзверы інстытуты, тэхнікумы, школы фабрычна-заводскага навучання, ваенныя вучылішчы. Значна павялічыўся прызыў у рады Чырвонай Арміі. Усюды патрэбны былі кадры. Дзяржава рыхтавалася да вялікіх выпрабаванняў.

*П.С.Васькаўскі.*

## Даваенная эканоміка раёна: лічбы і факты

Як вядома, шэраг прадпрыемстваў на Прапойшчыне існавалі яшчэ з царскіх часоў. У 1930 г. у мястэчку быў пабудаваны крэмнедрабільны завод-арцель «Мінерал», на якім працавалі 48 чалавек. Завод выпускаў крэмень (памол — 544 т, тэхнічнага — 103 т). У тым жа годзе пачала дзейнічаць канатна-вяровачная арцель-майстэрня «Беларусь», на якой выраблялася 80 т гаспадарчай вяроўкі і 8295 пар лапцяў. Некалькі раней, у 1926 г., пачаў дзейнічаць смалакурны завод імя Варашылава. Штат яго быў 38 чалавек, выпускалася штогод 206 т шкіпінару, 300 т смалы і 17 т дзёгцю.

У 1928 г. пачала дзейнічаць швейная майстэрня-арцель «Кастрычнік», у якой выпускалася 47 пар новага абутку і праводзіўся рамонт старога. У 1929 г. ва ўрочышчы «Рабаўка» ўступіў у строй цагельны завод-арцель «Усход». Тут 19 чалавек выраблялі 220 тыс. цаглін. У гэтым жа годзе на вуліцы Першамайскай была адкрыта майстэрня-арцель «Чырвоны швейнік», у якой працавалі 19 чалавек. Арцель выпускала за год штаноў — 1452, куртак — 301, кашуль — 840, спадніц — 35.

Амаль адначасова з «Чырвоным швейнікам» уступіў у строй дзеючых дрэвакамбінат з лікам занятых 52 чалавекі. Ён выпускаў колы — 2254, крэслы — 5670, бочкі — 2457, сталы — 61.

У 1931 г. пачалі дзейнічаць кавальская майстэрня-арцель «Чырвоны металіст» і арцель «Гужба», якая вырабляла за год 38 740 пар гужбы.

Мясцовы маслазавод выпускаў 314 т масла і 101 т тварагу, салатопка «Чырвоны карабейнік» вытоплівала 0,3 т сала і вытварала 0,6 т мыла, а хлебаня-карняваня [хлебапякарня] — каля 1962 т хлеба ў год.

У Васькавіцкім сельсавеце быў ветраны млын калгаса «Памяць Леніна», такія самыя млыны былі ў вёсках Ганчароўка і Шаламы. У астатніх сельсаветах былі ветраныя, вадзяныя і нафтавыя млыны і крупадзёркі.

Па даных перапісу насельніцтва 1939 г. у раёне пражывала 40 тыс. чалавек, меўся адзін пасялковы і 13 сельскіх Саветаў. У гарадскім пасёлку пражывала 4700 чалавек. Плошча зямельных і лясных угоддзяў складала 118 112 га, у тым ліку пад ворывам было 10 198, пад садамі — 260, пад сенакоснымі ўгоддзямі — 15 303, пад лесам — 31 078 га, пашы і выганы для жывёлы займалі 8073 га.

У раёне было 14 прамысловых торфабалот (на 1.1.1937 г.), здабыча торфу за 1939 г. склала 1,7 тыс. т. Нарыхтоўка і вывазка драўніны складала адпаведна 12 і 15 тыс. м$^3$.

З усіх прадпрыемстваў, якія былі ў той час, самымі буйнымі лічыліся канатнавяровачная арцель «Беларусь» і смаласкіпінарная арцель імя Варашылава. Валавая прадукцыя, выпускаемая імі па цэнах 1926—1927 гг., складала 793 тыс. руб.

На 1.6.1939 г. у раёне мелася дзве МТС з трактарным паркам у 82 машыны, дзейнічала 75 калгасаў, якія аб'ядноўвалі 6923 гаспадаркі. Аднаасобнікаў на гэты час засталося 561, працэнт калектывізацыі склаў 92,5. Значна расшырыліся пасяўныя плошчы. Пасевы размяшчаліся на 32 335 га, з іх калгасныя — на 29 053.

На пачатак 1938 г. у дзяржаўным кааператыўным сектары буйной рагатай жывёлы было 52 галавы, у тым ліку 19 кароў, 76 свіней, коней 140, з іх рабочых — 137. У калгасах было 6548 галоў буйной рагатай жывёлы, у тым ліку 2629 кароў, 1970 свіней, авечак і коз 3476, коней 6107, з іх 4467 — рабочыя. У асабістым карыстанні калгаснікаў знаходзілася 8542 галавы буйной рагатай жывёлы, у тым ліку 5661 карова, свіней — 16 040, авечак і коз — 5098. У аднаасобнікаў буйной рагатай жывёлы было 575 галоў, у тым ліку 362 каровы, 1242 свінні, авечак і коз — 251. У рабочых і служачых знаходзілася 577 галоў буйной рагатай жывёлы, з іх 492 кароў, 996 свіней, 48 авечак і коз.

*Ленінскае слова. 1980. 22 сак.*

## Гісторыя раёна газетным радком

**Па старонках газеты «Калгасны шлях» за 1935—1940 гг.**[1]

**20 лютага 1935 г.**

У гэтым годзе ў нас у раёне пачнецца будаўніцтва лазні і электрастанцыі. Дзяржплан: Наркамгас БССР ужо зацвердзіў будаўніцтва лазні і электрастанцыі ў Прапойску. На будаўніцтва лазні адпушчана 70 тысяч рублей, а на электрастанцыю 35 тысяч рублей. Прапускная здольнасць лазні будзе разлічана на 30 чалавек. Электрастанцыя будзе будавацца магутнасцю ў 16 кілават з устаноўкай 500—600 электраточак.

Райвыканком ужо заключыў дагавор з дзяржпраэктам БССР на складанне праектаў як для лазні, так і для электрастанцыі.

Будаўніцтва лазні і электрастанцыі павінна быць закончана ў канцы гэтага года.

**26 студзеня 1936 г.**

24 студзеня народны суд разглядаў справу хуліганаў Самадзелава В.І. і Сіньпорахава В.К.

Самадзелаў і Сіньпорахаў напіваліся пьянымі і хуліганілі на вуліцы і на вечарах. Напіўшыся, яны хацелі адабраць партфель у работніка Учдора Выбарнага, на вечары збілі Котменку С.

Разглядзеўшы гэту справу, народны суд Прапойскага раёна прыгаварыў хуліганаў Самадзелава і Сіньпорахава да 5 год пазбаўлення волі кожнага.

**27 ліпеня 1936 г.**

8—9 жніўня ў Прапойскім гукавым кінатэатры дэманструецца новы гукавы фільм «Партыйны білет». Пачатак сеансу: 1—8 гадзін, 2—10 гадзін.

---

[1]Захаваны тагачасныя стыль і арфаграфія.

Прымаюцца заяўкі на калектыўнае пасяшчэнне.

**10 кастрычніка 1936 г.**

11 кастрычніка ў в. Свенск Чарнякоўскае сельпо адкрывае сельмаг. У сельмаг завезена тавару на 40 тыс. руб., у тым ліку гатовага адзення на 12 тыс., абутку — на 8 тыс., галош — на 4 тыс., мануфактуры — на 8 тыс. руб.

**23 кастрычніка 1936 г.**

Прапойскі радыёвузел даводзіць да ведама ўсіх зацікаўленых асоб, што радыёвузел прымае заказы на ўстаноўку новых радыё-кропак да дню 19 гадавіны Кастрычніка.

Кошт устаноўкі радыё-кропкі з рэпрадуктарамі «Рэкорд» для служачых — 55 руб., для калгаснікаў — 45 руб.

Заказы выконваюцца на працягу 2-х дзён з дня ўплаты грошай.

**20 сакавіка 1937 г.**

ПАВЕДАМЛЕННЕ ПРАКУРАТУРЫ

Сакратар Прапойскага мястсавета Шуміла ўвесь час затрымліваў судовыя позвы. Хаваючы няўручаныя позвы ў скрыню пісьмовага стала. Падобнымі дзеяннямі Шуміла сістэматычна зрываў разгляд спраў у судзе.

1 сакавіка ў Шумілы ў пісьмовым стале знойдзена вялікая колькасць няўручаных позваў. Частка іх у Шумілы была адабрана, а астатнія ён знішчыў.

Пракуратурай супраць Шумілы ўзбуджана крымінальная справа. Вядзецца следства.

Пракурор Рыжэвіч

**24 сакавіка 1937 г.**

У барацьбе за высокі ўраджай

У брыгадзе № 5 (калгас «Васькавічы» Васькаўскага сельсавета) калгаснікі добра зразумелі, што павышэнне ўраджайнасці цалкам залежаць ад накаплення угнаення. Ініцыятарам збору попелу і курынага памёту з'ўляецца Авраменка Гаврыла. Ён сабраў 3 цэнтнеры курынага памёту і 1 цэнтнер попелу.

Я.Мацвеенка.

**7 лістапада 1937 г.**

ПАЛЮБІЛА ТРАКТАР

Мне было 20 год, калі я села першы раз за руль трактара. Спачатку баялася, што аскандалюся, як мне старыкі гаварылі. Але нічога, вышла добра. Дзень за днём я прывыкала к сваёй рабоце, палюбіла трактар.

Выдатна работаў у гэтым годзе мой трактар, без аварый, малейшых прастояў. За рабочы сезон я на ім узарала 460 га пры плане 430 га. Зарабіла 1050 кілаграм збожжа і 850 руб. грашыма.

Радасна і шчасліва я жыву. Бацькоўскія клопаты вялікага Сталіна аб нас, жанчынах, натхняюць мяне да яшчэ лепшай работы. Я абавязуюся аддаць усе свае маладыя сілы справе сацыялізма.

Кавалёва Паша

Трактарыстка Прапойскай МТС.

**29 лістапада 1937 г.**

ЗА ДРАПЕЖНІЦКІЯ АДНОСІНЫ ДА КАНЯ — ПАД СУД

Нарсуд 2-га ўчастка разгледзеў справу Ерашэнкі Афанаса з калгаса «Васькавічы» па абвінавачванні ў драпежніцкіх адносінах да каня.

Ерашэнка замацаванага за ім каня пусціў без нагляду пасвіцца, у выніку апошні ўтапіўся.

Нарсуд прыгаварыў Ерашэнку на 6 месяцаў прымусовых работ і пастанавіў узыскаць з яго ў карысць калгаса 300 рублёў.

**5 красавіка 1938 г.**

УСТУПАЮЦЬ У КАЛГАСЫ

У сувязі з надыходам вясновай сяўбы аднаасобныя гаспадаркі ўступаюць у калгасы. За апошні час у калгас «Парыжская камуна» Лапаціцкага сельсавета ўступіла 4 аднаасобных гаспадаркі — Ладэсаў Павел, Ладэсаў Панас, Сідарэнка Іван і Сідарэнка А.

Прынятыя ў калгас былыя аднаасобнікі ўзялі на сябе абавязацельства ў дружнай сям'і з усімі калгаснікамі змагацца за высокі ўраджай 1938 года.

А.Маісеенка

**10 красавіка 1938 г.**

КАЛІ МНЕ ВЫПЛАЦЯЦЬ ГРОШЫ?

Яшчэ да выбараў у Вярхоўны Савет СССР я ў чацвёртай брыгадзе калгаса «9 з'езд ВЛКСМ» Целяшоўскага сельсавета, засталася з малапісьменнымі і непісьменнымі. Па дагаваронасці з загадчыкам Бярозаўскай школы Якушавым мне павінны за гэта заплаціць грошы. Але ні Якушаў, ні старшыня сельсавета не жадаюць мне аплачваць за маю работу.

М.Балукова

**21 красавіка 1938 г.**

КАЛГАС ІМЯ СТАЛІНА ЗАКОНЧЫЎ СЯЎБУ ЯЧМЕНЮ

Разгарнулі масавую сяўбу яравых культур у калгасе імя Сталіна Целяшоўскага сельсавета. Тут ужо засеяна 40 гектараў ячменю (пры плане 40 га), 19,4 гектара яравой пшаніцы (план 20 га), 6 га вікі, 6 га лубіну і 2 га аўса.

Пад кожны гектар пасеву ячменю і пшаніцы калгас вывез па 75 вазоў гною. Поўнасцю падрыхтавана глеба пад пасеў усіх яравых культур.

Па ўсіх палявых работах уперадзе ідзе трэцяя брыгада (брыгадзір Малахаў), звеннявы гэтай брыгады Сілянкоў змагаецца за атрыманне 17—19 цэнтнераў ячменю з га.

Звеннявы першай брыгады Шынкароў узяў абавязацельства дабіцца ўраджаю пшаніцы з аднаго га не менш 18—20 цэнтнераў.

І.Ганчароў

**18 чэрвеня 1938 г.**

АГІТБРЫГАДА Ў КАЛГАСЕ

14 чэрвеня калгас «Пралетарый» Рагінскага сельсавета наведала агітбрыгада па падрыхтоўцы да выбараў у Вярхоўны Савет БССР.

Пасля даклада ўдзельнікі агітбрыгады паставілі п'есу і рад другіх нумароў. Сваё выступленне [закончым] песняй «Если завтра вайна».

Калгаснікі засталіся вельмі задаволены агітбрыгадай.

С.Бажкоў

**1 ліпеня 1938 г.**

НАМ ПІШУЦЬ

Дрэнна працуе арганізацыя асавіяхіма пры калгасе «Васькавічы» (Васькаўскі сельсавет). Ужо больш месяца не праводзяцца заняткі гуртка.

Ваенрук Сазоненка Васіль і старшыня арганізацыі Макарэнка П. нічога не робяць для наладжвання работы.

П.Е.

**1 верасня 1938 г.**

З хутароў у калгасныя цэнтры

Вялікую ролю ў арганізацыйна-гаспадарчым умацаванні калгасаў павінна ўзыграць сцягванне хутароў. Калгаснікі жывучы на хутарах амаль адарваны ад жыцця калгаса. Ім далёка хадзіць на працу. Не заўсёды яны могуць быць на агульных сходах і прымаць актыўны ўдзел у вырашэнні тых альбо іншых пытанняў, дзецям далёка хадзіць у школу, і шмат іншых нязручнасцей прадстаўляе сабой хутарская сістэма. Калгаснікі выражаюць жаданне перасяліцца ў цэнтр калгаса.

Наша партыя і ўрад ідуць насустрач жаданням калгаснікаў і прадстаўляюць ім шмат ільгот па перасяленню.

Згодна пастановы партыі і ўрада па нашаму раёну павінна быць сцягнута 510 хутарскіх гаспадарак. Кожнай перасяляючайся гаспадарцы дзяржава адпускае крэдыт у суме 500 руб., лесаматэрыялы на ільготных умовах і інш. Акрамя таго, калгас павінен аказваць дапамогу ў перавозцы будынкаў і г.д.

Рад калгасаў добра арганізавалі працу па сцягванню хутароў, як, напрыклад, калгас «XVII партз'езд» Васькаўскага сельсавета. Адным з першых ён узяў абавязацельства выканаць рашэнне партыі і ўрада і да 1 кастрычніка 1938 г. перавазіў з хутароў у вёску 35 гаспадарак. За дэкаду ўжо перавезена 13 хутарскіх гаспадарак.

Калгас «Свабода» Ржаўскага сельсавета ўзяў абавязацельства да 1 кастрычніка 1938 г. перавезці 20 гаспадарак і за дэкаду ўжо перавезлі 7 гаспадарак.

Аднак некаторыя старшыні калгасаў не арганізавалі працу па сцягванню хутароў. Калгасы «Пабеда», «Парыжская Камуна» Лапаціцкага сельсавета і імя Будзённага Рагінскага сельсавета перавезлі толькі па адной хутарской гаспадарцы.

Гэта сведчыць аб тым, што старшыні гэтых сельсаветаў і калгасаў Елісеенка, Пішчанка, Мельнікаў Ісай і інш. недаацанілі ўсю важнасць сцягвання хутароў, што ў далейшым не можа быць цярпімым.

Кожны сельсавет, кожны калгас павінен аказаць найвялікшую дапамогу ў перасяленні хутарскіх гаспадарак.

Елісеенка
Старшы землеўпарадчык РайЗА.

**9 чэрвеня 1940 г.**

ПРЫСТУПІЛІ ДА АСУШКІ БАЛОТ

Калгаснікі сельгасарцелі імені Молатава Ржаўскага сельсавета прыступілі да асушкі балот. Тут ужо распачата распрацоўка і асваенне забалочаных зямель на плошчы 15,3 гектара.

На асушанай плошчы быўшага балота ў 6,3 гектара калгас засеяў авёс. Астатнік 9 гектараў калгаснікі асвойваюць пад пасеў азімых.

Штодзённа на асушку балот выходзяць 70 калгаснікаў і калгасніц. Стаханаўскія метады работы паказваюць калгасніцы Лесюкова Насця, Раманава Хадося, Маёрава Арына, Матвеева П. і другія. Яны штодзённую норму выпрацоўкі выконваюць на 110—150 працэнтаў.

А.Курыленка

**21 чэрвеня 1940 г.**

АБАРОННАЯ РАБОТА Ў АРЦЕЛІ

Добра пастаўлена ваенна-фізкультурная работа ў арцелі «Дрэўкамбінат». Тут рэгулярна праводзяцца заняткі ў фізкультурным, валейбольным, тапаграфічным і іншых гуртках. Многія члены арцелі ўжо здалі нормы на абаронныя значкі. Нормы на значок ПВХО I ступені здалі 54 чал., на значок ВС I ступені — 25 чал., на значок ГТО I ступені — 19 чал. Зараз фізкультурны гурток праводзіць работу па здачы летніх норм на значок ГТО. Сярод дапрызыўнікоў праводзіцца дапрызыўная падрыхтоўка. Цяга ў членаў арцелі да авалодання ваеннай справай вялікая.

З.Мельнікаў

## Слаўгарадчане — удзельнікі Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі 1940 г.

У 1939 г. у Маскве (Астанкіна) адкрылася пастаянная Усесаюзная сельскагаспадарчая выстаўка для дэманстрацыі лепшых дасягненняў сельскагаспадарчай вытворчасці і навукі. У яе 250 будынках, размешчаных на плошчы 140 га, былі сабраны сотні тысяч экспанатаў, якія сведчылі аб вялікіх магчымасцях працаўнікоў калгасных і саўгасных палёў і фермӑў, дзеячаў навукі. Экспанентамі выстаўкі ўжо ў першыя гады яе існавання стала шмат перадавых калектываў і асоб, самаадданая праца якіх павялічвала магутнасць Радзімы. Быць удзельнікам гэтай выстаўкі лічылася справай гонару і чэсці для кожнага працаўніка сельскай гаспадаркі. Аб гэтым марылі людзі вёскі, дзеля гэтага напружана працавалі.

Прозвішчы жыхароў раёна, для якіх гэта мара здзейснілася ўжо ў 1940 г., прыведзены ў той паслядоўнасці, у якой яны былі змешчаны ў тагачасных матэрыялах: Дзёмін Міхаіл Ягоравіч, Хадуноў Дзмітрый Іванавіч — конюхі, Тарэлкіна Уліта Фёдараўна — цялятніца, Шусцікаў Даніла Касьянавіч — бычнік, Батоўкін Мікалай Ермалаевіч — агароднік калгаса «Кастрычнік»; Маркусенка Ціхан Кірылавіч — старшы конюх калгаса імя Леніна; Валковіч Франц Пятровіч — старшы конюх калгаса «8 Сакавіка»; Ульянаў Іосіф Паўлавіч — старшы конюх калгаса «Камінтэрн»; Віннікаў Фёдар Аўхімавіч — конюх, Зыскуноў Мікалай Цярэнцьевіч — брыгадзір па льну калгаса «Аграном»; Ерашэнка Марыя Харытонаўна — свінарка калгаса «Чырвоны партызан»; Емяльянаў Кірыла Макаравіч — аўчар, Волкаў Максім Яфімавіч — конюх калгаса «Чырвоны ўдарнік»; Зыскунова Аўгіння Нічыпараўна, Міронава Марыя Ціханаўна — аўчары калгаса «Чырвоны сцяг»; Козін Фёдар Маркавіч — конюх, Воранаў Лазар Міхайлавіч — чабан, Саўкін Пётр Іларыёнавіч — аўчар калгаса «Ленінец»; Студзялёва Марыя Сцяпанаўна — аўчар калгаса «Камунар»; Адаменка Ціхан Ульянавіч — чабан калгаса «Маяк»; Рыжкоў Аляксей Аляксеевіч — старшы конюх калгаса «Памяць Фрунзе» Старыкаўскага сельсавета; Башылы Іван Юркавіч — старшы конюх, Кубаркоў Аляксей Свірыдавіч — конюх калгаса «Чырвоны перадавік» Каменкаўскага сельсавета; Карнейчык Настасся Кузьмінічна — участковы заатэхнік РайЗА; Вавілава Ганна Яўменаўна — цялятніца калгаса «Чырвоная Церахоўка»; Іванчыкаў Ніканор Фёдаравіч — скотнік-пастух, Сафоненка Ціхан Рыгоравіч — старшы конюх, Емяльянаў Антон Лаўрэнавіч — аўчар, Старавойтава Еўдакія Аўдзееўна — цялятніца, Старавойтаў Пракоп Іцкавіч — звеннявы па льну калгаса «Пралетарый»; Гарэлікава Ганна Аляксееўна — цялятніца калгаса «XV партз'езд»; Раманава Акуліна Цярахаўна — даярка калгаса «Спартак»; Кастрыца Іван Антонавіч — аўчар калгаса «Новае



М.П.Ерашэнка.



Ф.М.Козін.

жыццё»; Галачова Кацярына Фёдараўна — даярка калгаса «Бальшавіцкая сяўба»; Прывалава Марыя Аксёнаўна — аўчар, Копысева Наталля Рыгораўна — цялятніца калгаса «Памяць Фрунзе»; Аксёнава Салоха Сцяпанаўна — даярка, Салаўёў Лука Данілавіч — скотнік-пастух калгаса «Бальшавіцкая сяўба»; Паўлючэнка Іван Логінавіч — аўчар калгаса імя Куйбышава; Міхаськова Марыя Мікітаўна — аўчар, Дарафеева Вольга Дзмітрыеўна — цялятніца, Агеенка Еўдакім Мікітавіч — брыгадзір калгаса «Новы шлях»; Чухараў Васіль Пятровіч — скотнік, Марчанка Васіль Фадзеевіч — каваль, Шэкаў Архіп Цярэнцьевіч — звеннявы, Кандрацeнка Андрэй Авакумавіч — рахункавод калгаса імя Варашылава; Краснічэнка Еўдакія Яўхімаўна — аўчар калгаса «Звязда»; Тарбанкоў Клім Марцінавіч — аўчар калгаса імя Калініна; Осіпава Хрысціна Прохараўна — даярка, Аляксеенка Герасім Захаравіч — старшы конюх калгаса імя Сталіна; Малаткова Ксенія Усцінаўна — даярка, Шакураў Іван Агеевіч — конюх, Лосева Марыя Нічыпараўна — даярка калгаса «Чырвоны Усход»; Аношка Аляксандра Фамінічна — даярка калгаса «Рэвалюцыя»; Пашкевіч Архіп Іванавіч — конюх, Елістратава Кацярына Рыгораўна — цялятніца, Петрачэнка Міхаіл Восіпавіч — брыгадзір па льну калгаса імя Кірава; Разумкоў Аляксей Сяргеевіч — аўчар калгаса «Ленінскі»; Варэннікава Наталля Ільінічна — цялятніца калгаса «2-я пяцігодка»; Часнакоў Гаўрыла Пятровіч — старшы конюх, Рыжанкоў Яўхім Пятровіч — звеннявы, Васіленка Цімафей Максімавіч — загадчык пасекі, Самусенка Фёдар Сідаравіч — загадчык аўчафермы, Самусенка Якаў Давыдавіч — старшыня калгаса «Памяць Леніна»; Менташкоў Нічыпар Цімафеевіч, Пракоф'ева Аляксандра Цярэнцьеўна — аўчары калгаса «Бальшавік»; Ласянкоў Цімох Паўлавіч — конюх калгаса «Гігант»; Якушенка Сяргей Пятровіч — старшы конюх, Ганчароў Клімент Паўлавіч — рахункавод калгаса імя Крупскай; Рыжанкоў Віктар Майсеевіч — брыгадзір калгаса «Спартак»; Кіраёнак Пахом Пятровіч — загадчык пасекі калгаса «Сцяг працы»; Захарэнка Майсей Міронавіч — старшыня калгаса «Барэц»; Хурсін Афанасій Пятровіч, Кухарава Ульяна Яфімаўна, Балабкіна Кацярына Герасімаўна, Жукава Софья Іосіфаўна — трактарысты Прапойскай МТС; Кацерын Архіп Афанасьевіч, Цімафеева Еўдакія Андрэеўна — трактарысты Жалезінскай МТС; Караленка Пётр Парфенавіч — сакратар РК ЛКСМБ; Маслакоў Аляксей Іванавіч — участковы заатэхнік; Кустоў Цімафей Маркавіч — землеўпарадчык; Пятроў Конан Пятровіч — аграном РайЗА; Лапчкоў Лявон Данілавіч — ветфельчар Гіжэнскага сельсавета.

*П.Е.Сафронаў.*

## Вернутыя імёны

Шмат часу жылі савецкія людзі ва ўмовах дэспатызму і ігнаравання законнасці, масавых рэпрэсій, калі чорнае крыло страху навісала над чалавекам з моманту яго нараджэння і да самой смерці. А апошняя магла прыйсці і несвоечасова, калі хтосьці незнарок праявіў вольнасць думкі ці яго ўчынкі здаліся антысавецкімі, антыпартыйнымі. Западозрыць у гэтым любую асобу было няцяжка. А потым у катавальнях НКУС з чалавека выбівалі патрэбныя прызнанні і станавіўся ён шпіёнам, здраднікам, ворагам народа... Адтуль яго шлях быў калі не прама да «сценкі», то доўгім і цяжкім праз шматлікія турмы і лагеры. І ніхто не мог прадказаць, дзе і як ён скончыцца.

Разам з мільёнамі савецкіх людзей зведалі на сабе праявы тагачаснай рэчаіснасці і многія сотні жыхароў Слаў-

гарадчыны: калгаснікі, сяляне-аднаасобнікі, прадстаўнікі інтэлігенцыі, партыйныя і савецкія кіраўнікі. Трапілі ў гэты спіс пракурор раёна М.А.Дарашкевіч і нават начальнік НКУС М.І.Лейкін. У чым абвінавачваўся першы з іх — чытач даведаецца крыху пазней. А вось за якую правіннасць «загрымеў» у ГУЛАГ другі — можна толькі здагадвацца: ці то не дастараўся, ці перастараўся на сваёй цяжкай пасадзе. Але ж, калі ўлічыць тое, што ён як і шмат іншых афіцыйна рэабілітаваны, то яго таксама можна лічыць ахвярай палітычных рэпрэсій, панаваўшых у краіне ў 20—80-я гады.

На жаль, у кнізе «Памяць» названы не ўсе неабгрунтавана рэпрэсіраваныя. Аднак пошукавая работа працягваецца. Прыйдзе час, калі ўсім незаконна пацярпелым грамадзянам будуць вернуты іх добрыя імёны. Безумоўна, час наклаў свой адбітак і на гэту справу. Адсутнічаюць дакладныя звесткі на кожную ахвяру. З тых матэрыялаў, якія былі ў распараджэнні стваральнікаў кнігі, іншы раз немагчыма ўдакладніць, дзе чалавек нарадзіўся ці працаваў да арышту. У сувязі з гэтым зроблена асобная частка гэтага спісу — Прапойскі раён, у якую мог трапіць жыхар любой вёскі ці Слаўгарада, калі няма дакладных даных аб гэтым у адпаведных матэрыялах.

## Грамадзяне Слаўгарадскага раёна, якія падвергліся палітычным рэпрэсіям і пазней былі рэабілітаваныя

### БАХАНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

### ВЁСКА БАХАНЬ

**БУБНОЎ Дзяніс Якаўлевіч,** н. у 1882. Рэпрэсіраваны 10.5.1930. Рэабілітаваны 20.9.1989.

**БУБНОЎ Ігнат Канстанцінавіч,** н. у 1905. Рэпрэсіраваны 10.5.1930. Рэабілітаваны 20.9.1989.

**БУБНОЎ Канстанцін Мікалаевіч,** н. у 1874, калгаснік. Рэпрэсіраваны 15.10.1937. Рэабілітаваны 5.10.1989.

**БУБНОЎ Палікарп Якаўлевіч,** н. у 1900. Рэпрэсіраваны 10.5.1930. Рэабілітаваны 20.9.1989.

**БУБНОЎ Парфен Мікалаевіч,** н. у 1907. Рэпрэсіраваны 10.5.1930. Рэабілітаваны 20.9.1989.

**БУБНОЎ Фёдар Мікалаевіч,** н. у 1888. Рэпрэсіраваны 10.5.1930. Рэабілітаваны 20.9.1989.

**БУБНОЎ Цімафей Мінавіч,** н. у 1908. Рэпрэсіраваны 10.5.1930. Рэабілітаваны 20.9.1989.

**БУБНОЎ Ягор Канстанцінавіч,** н. у 1897, калгаснік. Рэпрэсіраваны 25.9.1937. Рэабілітаваны 16.1.1989.

**ВАРАНЦОЎ Несцер Фаміч,** н. у 1905. Рэпрэсіраваны 10.5.1930. Рэабілітаваны 20.9.1989.

**ГАЛУШКАЎ Іван Захаравіч,** н. у 1906. Рэпрэсіраваны 10.5.1930. Рэабілітаваны 20.9.1989.

**ГАЛУШКАЎ Сямён Давыдавіч,** н. у 1910. Рэпрэсіраваны 10.5.1930. Рэабілітаваны 10.9.1989.

**ГЛУШАКОЎ Ісак Васільевіч,** н. у 1878. Рэпрэсіраваны 22.11.1937. Рэабілітаваны 16.1.1989.

**ІГНАЦЬЕЎ Пётр Сямёнавіч,** н. у 1909. Рэпрэсіраваны 10.5.1930. Рэабілітаваны 20.9.1989.

**КАВАЛЁЎ Міхаіл Восіпавіч,** н. у 1894. Рэпрэсіраваны 10.5.1930. Рэабілітаваны 20.9.1989.

**КУБАРАЎ Пётр Фядотавіч,** н. у 1899. Рэпрэсіраваны 10.5.1930. Рэабілітаваны 20.9.1989.

**КУБАРАЎ Фёдар Сямёнавіч,** н. у 1876. Рэпрэсіраваны 2.9.1937. Рэабілітаваны 17.4.1962.

**КУХАРАЎ Лаўрэнцій Пятровіч,** н. у 1886. Рэпрэсіраваны 10.5.1930. Рэабілітаваны 20.9.1989.

**ЛУТАЎ Павел Антонавіч,** н. у 1886 на хутары Горкі Прапойскага р-на. Рэпрэсіраваны 15.10.1937. Рэабілітаваны 5.10.1989.

**МАЖАНКОЎ Максім Ізотавіч,** н. у 1891. Рэпрэсіраваны 10.5.1930. Рэабілітаваны 20.9.1989.

**МАЖАНКОЎ Якаў Дзмітрыевіч,** н. у 1807. Рэпрэсіраваны 10.5.1930. Рэабілітаваны 20.9.1989.

**ПАПКОЎ Ціт Касьянавіч,** н. у 1872. Рэпрэсіраваны 10.5.1930. Рэабілітаваны 22.9.1989.

**ПАПКОЎ Цярэнцій Цітавіч,** н. у 1910. Рэпрэсіраваны 10.5.1930. Рэабілітаваны 22.9.1989.

**РАДЗЬКОЎ Мяфёд Сідаравіч,** н. у 1900. Рэпрэсіраваны 10.5.1930. Рэабілітаваны 22.9.1989.

**РЫХЦІКАЎ Іларыён Архіпавіч,** н. у 1897. Рэпрэсіраваны 10.5.1930. Рэабілітаваны 22.9.1989.

**РЫХЦІКАЎ Ягор Пятровіч,** н. у 1896. Рэпрэсіраваны 10.5.1930. Рэабілітаваны 22.9.1989.

**ТУРКОЎ Мікіта Антонавіч,** н. у 1899. Рэпрэсіраваны 10.5.1930. Рэабілітаваны 22.9.1989.

**УГНАЧОЎ Анікей Паўлавіч,** н. у 1901. Рэпрэсіраваны 10.5.1930. Рэабілітаваны 22.9.1989.

**УГНАЧОЎ Пётр Нічыпаравіч,** н. у 1891. Рэпрэсіраваны 10.5.1930. Рэабілітаваны 22.9.1989.

**ФІЛІПКОВА Домна Сямёнаўна,** н. у 1883. Рэпрэсіравана 10.5.1930. Рэабілітавана 22.9.1989.

**ШАПАВАЛАЎ Фёдар Фаміч,** н. у 1907. Рэпрэсіраваны 10.5.1930. Рэабілітаваны 22.9.1989.

### ВЁСКА ВЯЛІКАЯ ЗІМНІЦА

**ЗАПЕЧАНКА Матрона Панкратаўна,** н. у 1914. Рэпрэсіравана ў 1929. Рэабілітавана 12.3.1993.

**ЛУКАШКОЎ Панкрат Фёдаравіч.** Рэпрэсіраваны ў 1929. Рэабілітаваны 12.3.1993.

**ЯГОРАЎ Максім Паўлавіч,** н. у 1890, калгаснік калгаса імя Чкалава. Рэпрэсіраваны 30.12.1944. Рэабілітаваны 17.8.1965.

### ПАСЁЛАК БОРКІ

**ЗАХАРЭНКА Васіль Анісімавіч,** н. у 1903. Рэпрэсіраваны 10.5.1930. Рэабілітаваны 20.9.1989.

**ЗАХАРЭНКА Максім Логінавіч,** н. у 1900. Рэпрэсіраваны 10.5.1930. Рэабілітаваны 20.9.1989.

### ВЁСКА ДОБРЫ ДУБ

**САСУНОЎ Максім Васільевіч,** н. у 1905. Рэпрэсіраваны 10.5.1930. Рэабілітаваны 22.9.1989.

**ТАРАНАЎ Пётр Сямёнавіч,** н. у 1904. Рэпрэсіраваны 10.5.1930. Рэабілітаваны 22.9.1989.

### ВЁСКА МАЛАЯ ЗІМНІЦА

**ЛУК'ЯНАЎ Емяльян Калінавіч,** рэпрэсіраваны ў 1933. Рэабілітаваны 22.3.1993.

**ШАБУСАЎ Нічыпар Лазаравіч,** н. у 1860, пражыў у в. Курганне. Рэпрэсіраваны 22.9.1939. Рэабілітаваны 10.2.1962.

### ВЁСКА СМАЛІГАЎ

**КОЎГАНАЎ Раман Мікітавіч,** н. у 1902, калгаснік. Рэпрэсіраваны 1.9.1937. Рэабілітаваны 17.7.1959.

**КОЎГАНАЎ Уладзімір Мікітавіч,** н. у 1900, калгаснік. Рэпрэсіраваны 3.9.1937. Рэабілітаваны 17.7.1959.

## ВАСЬКАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

### ВЁСКА БАРСУКОЎКА

**КАМАНДЗЕНКА Мікалай Фядотавіч,** н. у 1887. Яго жонка і трое дзяцей рэпрэсіраваны ў 1932. Рэабілітаваны ў 1989.

**КАМАНДЗЕНКА Мітрафан Фядотавіч,** н. у 1884. Рэпрэсіраваны 15.4.1932. Рэабілітаваны 30.8.1989.

**ШЛЯХЦІН Іван Міхайлавіч,** н. у 1893, калгаснік калгаса «Варашылава». Расстраляны 2.11.1938. Рэабілітаваны 16.1.1989.

### ВЁСКА БЯЗУЕВІЧЫ

**АГЕЕНКА Аляксей Іванавіч,** н. у 1866. Рэпрэсіраваны ў 1929. Рэабілітаваны 12.2.1993.

**АГЕЕЎ-АГЕЕНКА Сяргей Іванавіч,** н. у 1902, ваеннаслужачы. Рэпрэсіраваны 13.1.1935. Рэабілітаваны 23.9.1958.

**ВАВІЛАЎ Ягор Агеевіч,** н. у 1911 у в. Цераховўка Прапойскага р-на. Рэпрэсіраваны 29.9.1938. Рэабілітаваны 21.6.1967.

### ВЁСКА ВАСЬКАВІЧЫ

**ГУТАРАЎ Цімафей Ільіч,** н. у 1895, калгаснік. Рэпрэсіраваны 5.9.1937. Рэабілітаваны 7.7.1961.

**ДЗМІТРАЧЭНКА Іван Рыгоравіч,** н. у 1891, калгаснік. Рэпрэсіраваны 18.9.1937. Рэабілітаваны 7.6.1989.

**ЕРАШЭНКА Апанас Сяргеевіч,** н. у 1891. Рэпрэсіраваны 23.9.1932. Рэабілітаваны 20.4.1959.

**МАЖЭЙ Мікалай Ісідаравіч,** н. у 1908. Рэпрэсіраваны 5.9.1937. Рэабілітаваны 30.10.1937.

**МАЖЭЙ Сяргей Сідаравіч,** н. у 1889. Рэпрэсіраваны 14.5.1933. Рэабілітаваны 31.10.1989.

**МАЦІШАЎ Іван Аляксеевіч,** н. у 1884 на хутары Аляксееўка, калгаснік. Рэпрэсіраваны 5.9.1937. Рэабілітаваны 20.11.1989.

**МІШУРОЎ Мітрафан Архіпавіч,** н. у 1899. Рэпрэсіраваны 14.5.1933. Рэабілітаваны 31.10.1989.

**ПРАДАЛЯТЧАНКА Міхей Антонавіч,** н. у 1891, калгаснік. Рэпрэсіраваны 23.9.1932. Рэабілітаваны 20.4.1959.

**ПЯТРОЎСКІ Панцялей Макаравіч,** н. у 1837 у в. Папоўка. Рэпрэсіраваны 31.12.1937. Рэабілітаваны 13.11.1989.

**РАДЧАНКА Прохар Апанасавіч,** н. у 1884. Рэпрэсіраваны 31.10.1937. Рэабілітаваны 13.11.1989.

### ВЁСКА ГАЙШЫН

**ВІКТАРАЎ Сяргей Іванавіч,** н. у 1885, калгаснік. Рэпрэсіраваны 4.9.1937, памёр у лагеры ў 1942. Рэабілітаваны 2.2.1963.

**ДАРАФЕЕЎ Іван Фёдаравіч,** н. у 1882, калгаснік. Расстраляны 30.9.1937. Рэабілітаваны 21.4.1989.

**ДАРАФЕЕЎ Мікалай Фёдаравіч,** н. у 1910. Рэпрэсіраваны 14.5.1933. Рэабілітаваны 31.10.1989.

**ДУБОВІКАЎ Пётр Міхайлавіч,** н. у 1887. Рэпрэсіраваны 11.5.1932. Рэабілітаваны 31.8.1989.

**ЕРАМЕЕНКА Лаўрэнцій Сцяфанавіч,** н. у 1870, калгаснік. Рэпрэсіраваны 4.9.1937. Рэабілітаваны 2.2.1963.

**ЕЎМЯНКОЎ Іван Ціханавіч,** н. у 1899, калгаснік. Рэпрэсіраваны 9.6.1938. Рэабілітаваны 29.9.1989.

**КРАСКОЎСКІ Аляксей Іванавіч,** н. у 1906. Рэпрэсіраваны 2.11.1938. Рэабілітаваны 28.9.1989.

**ЛАРЧАНКА Лука Барысавіч,** н. у 1891. Рэпрэсіраваны 12.12.1943. Рэабілітаваны 4.1.1944.

**МАЙСЕЕНКАЎ Іларыён Якаўлевіч,** н. у 1891. Рэпрэсіраваны 17.12.1943. Рэабілітаваны 4.1.1944.

**МАЦВЕЕНКА Мікалай Апанасавіч,** н. у 1906, калгаснік. Рэпрэсіраваны 4.9.1937. Рэабілітаваны 2.2.1963.

**НАЗАРАНКА Сяргей Конанавіч,** н. у 1898, аднойчы на сходзе калгаснікаў у 1938 г. сказаў: «Я ніякай улады не прызнаю». Праз два дні прыехалі і забралі. Больш аб яго лёсе нічога невядома.

**ФЁДАРАЎ Якім Аўрамавіч,** н. у 1894. Рэпрэсіраваны 28.2.1938. Рэабілітаваны 17.10.1982.

**ЯЎСТАФ'ЕЎ Іван Раманавіч,** н. у 1904, капітан 16-га авіяпалка. Рэпрэсіраваны 29.9.1942. Рэабілітаваны 15.11.1942.

### ВЁСКА ГАНЧАРОЎКА

**ЕРАШЭНКА Раман Ціханавіч,** н. у 1889 у в. Васькавічы, актыўны ўдзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, да арышту працаваў у калгасе «Барэц». Рэпрэсіраваны 23.9.1932. Рэабілітаваны 20.4.1989.

### ВЁСКА ЛЮДКОЎ

**КАМАНДЗЕНКА Іван Кузьміч,** н. у 1913, калгаснік. Рэпрэсіраваны 9.6.1933. Рэабілітаваны 29.9.1989.

**КАМАНДЗЕНКА Кузьма Ісакавіч,** н. у 1890, калгаснік. Рэпрэсіраваны 9.6.1933. Рэабілітаваны 29.9.1989.

**МАРЧАНКА Пётр Георгіевіч,** н. у 1905, брыгадзір калгаса. Рэпрэсіраваны 4.9.1937. Рэабілітаваны 24.9.1960.

**МАРЧАНКА Сямён Церахавіч,** н. у 1908, калгаснік. Рэпрэсіраваны 9.6.1933. Рэабілітаваны 29.9.1989.

**МАРЧАНКА Цярэнцій Ананьевіч,** н. у 1872, калгаснік. Рэпрэсіраваны 9.6.1933. Рэабілітаваны 29.9.1989.

**МАРЧАНКА Ягор Міхайлавіч,** н. у 1903, калгаснік. Рэпрэсіраваны 9.6.1933. Рэабілітаваны 29.9.1989.

**ШУБАДЗЁРАЎ Сцяпан Фядотавіч,** н. у 1883. Рэпрэсіраваны 14.10.1930. Рэабілітаваны 12.9.1989.

### ВЁСКА ПАПОЎКА

**ВАШЧЫЛА Фрол Піменавіч,** н. у 1877, калгаснік. Рэпрэсіраваны 6.8.1937. Рэабілітаваны 20.4.1989.

**КАПЛІНСКІ Захар Васільевіч,** н. у 1896. Рэпрэсіраваны 3.9.1937. Рэабілітаваны 26.12.1939.

**ЦВЯРДОЎСКІ Андрэй Пятровіч,** н. у 1881, калгаснік. Рэпрэсіраваны 23.9.1932. Рэабілітаваны 20.4.1959.

### ПАСЁЛАК ПРАСВЕТ

**МІШУРОЎ Марк Архіпавіч,** н. у 1895. Рэпрэсіраваны 11.7.1941. Рэабілітаваны 4.12.1964.

Ад рэдактара-складальніка: калі я прачытаў прозвішча Марка Архіпавіча, успомніў артыкул, нгадрукаваны за яго подпісам у раённай газеце «Калгасны шлях». У бібліятэцы адшукаў гэты нумар раёнкі (№ 26, 1937 г.) і не без хвалявання прачытаў такія радкі:

«Кепскае жыццё было ў нас раней. Памятаю, у час белапольскай акупацыі ў вёску прыйшлі палякі. Сабралі ўсіх на сход і патрабавалі, каб ім далі аўса для коней, хлеба, яек, сала... Цэлую ноч белапалякі шарылі па хатах. Прыйшлі і да мяне. Жыў я бедна, у хаце нічога не было, хоць шаром пакаці. Афіцэр з лаянкай загадаў зараз жа даць авёс. Я стаў прасіць іхняй літасці, і замест слова «паночкі» вырвалася з вуснаў «таварышы». За гэта слова мяне так прыбілі, што я не мог падняцца на ногі цэлы тыдзень.

А зараз слова «таварыш» самае блізкае і роднае. Ніхто за яго не агрэе бізуном».

Ведаць бы М.А., што гэтыя самыя таварышы праз якія-небудзь чатыры гады за незнарок сказаныя словы наогул пазбавяць яго жыцця.

**НЕПЛАШОЎ Сямён Барысавіч,** н. у 1895, калгаснік. Рэпрэсіраваны 25.3.1933. Рэабілітаваны 10.10.1989.

### ВЁСКА РУДНЯ

**НАВУМЕНКА Андрэй Еўдакімавіч,** н. у 1881. Рэпрэсіраваны 31.10.1937. Рэабілітаваны 16.1.1989.

**СЛЯПЦОЎ Ціт Цітавіч,** н. у 1877. Рэпрэсіраваны 18.9.1937. Рэабілітаваны 6.6.1989.

**ТАРАСЕНКА Яўмен Марцінавіч,** н. у 1888. Рэпрэсіраваны 9.3.1930. Рэабілітаваны 30.6.1989.

### ВЁСКА УРЭЧЧА

**АСТАПАЎ Іларыён Сяргеевіч,** н. у 1914, калгаснік. Рэпрэсіраваны 2.12.1937. Рэабілітаваны 27.3.1938.

**ГАНЧАРОЎ Іван Ягоравіч,** н. у 1893. Рэпрэсіраваны 21.3.1933. Рэабілітаваны 16.1.1989.

**ГАНЧАРОЎ Цярэнцій Цімафеевіч,** н. у 1904, брыгадзір калгаса. Расстраляны ў 1937. Рэабілітаваны 1.11.1974.

**ДЫКАЛАЎ Усцін Іванавіч,** н. у 1872. Рэпрэсіраваны 21.3.1933. Рэабілітаваны 16.1.1989.

**ЖАРЫКАЎ Антон Васільевіч,** н. у 1894. Рэпрэсіраваны 21.11.1937. Рэабілітаваны 16.1.1989.

**ЗМІТРАЧКОЎ Павел Пятровіч,** н. у 1895. Рэпрэсіраваны 23.5.1933. Рэабілітаваны 26.9.1989.

**КАМАНДЗЕНКА Мікалай Ісакавіч,** н. у 1910. Рэпрэсіраваны 9.6.1933. Рэабілітаваны 29.9.1989.

**КАРПЕНКА Герасім Данілавіч.** Арыштаваны 14.1.1938, расстраляны 1.4.1938. Рэабілітаваны 29.7.1966.

**КЛЮЕЎ Васіль Іванавіч.** Рэпрэсіраваны ў 1930. Рэабілітаваны 22.3.1993.

**КЛЮЕЎ Васіль Фядотавіч,** н. у 1911. Рэпрэсіраваны 21.3.1933. Рэабілітаваны 16.1.1989.

**КЛЮЕЎ Іван Платонавіч,** н. у 1882. Рэпрэсіраваны 23.9.1932. Рэабілітаваны 20.4.1959.

**КЛЮЕЎ Іван Цярэнцьевіч,** н. у 1902. Рэпрэсіраваны 21.3.1933. Рэабілітаваны 16.1.1989.

**КЛЮЕЎ Міхаіл Фядосавіч,** н. у 1903. Рэпрэсіраваны 21.3.1933. Рэабілітаваны 16.1.1989.

**КЛЮЕЎ Фядос Цярэнцьевіч,** н. у 1887. Рэпрэсіраваны 21.3.1933. Рэабілітаваны 16.1.1989.

**КУРАЧКІН Дзмітрый Захаравіч,** н. у 1884, брыгадзір калгаса. Расстраляны 1.4.1938. Рэабілітаваны 16.1.1966.

**МАЁРАЎ Калін Мікалаевіч,** н. у 1903. Рэпрэсіраваны 21.3.1933. Рэабілітаваны 16.1.1989.

**ПАСЯЛЕНЦАЎ Іван Сцяпанавіч,** н. у 1887, калгаснік калгаса імя Леніна. Рэпрэсіраваны 21.3.1932. Рэабілітаваны 16.1.1989.

**ПАСЯЛЕНЦАЎ Фёдар Іванавіч,** н. у 1911, калгаснік калгаса імя Леніна. Асуджаны 21.3.1933 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 16.1.1989.

**ПАЎЛОЎСКІ Сяргей Канстанцінавіч,** н. у 1911,

калгаснік. Рэпрэсіраваны 6.8.1937. Рэабілітаваны 30.3.1962.

**РАЗУМАЎ Фока Андрэевіч,** н. у 1904. Расстраляны 1.4.1938. Рэабілітаваны 29.7.1966.

**СУВОРАЎ Ілья Іванавіч,** н. у 1910, калгаснік калгаса імя Леніна. Рэпрэсіраваны 21.3.1933. Рэабілітаваны 16.1.1989.

**ЦЯРЭШЧАНКА Хрызон Юр'евіч,** калгаснік калгаса «XVII партз'езд». Рэпрэсіраваны ў 1933. Рэабілітаваны пасмяротна ў 1958.

**ЯНЧАНКА Ілья Ягоравіч,** н. у 1886, калгаснік калгаса «Свабода». Арыштаваны 18.9.1937. Расстраляны 11.10.1937. Рэабілітаваны 16.1.1989.

### ВЁСКА ЦЕРАХОЎКА

**АКУЛЕНКА Адам Іванавіч,** н. у 1890. Рэпрэсіраваны 5.4.1933. Рэабілітаваны 16.1.1984.

**АЎЧЫННІКАЎ Сцяпан Сямёнавіч,** н. у 1873, калгаснік. Рэпрэсіраваны 4.9.1937. Рэабілітаваны 16.1.1989.

**ІГНАЦЕНКА Васіль Сцяфанавіч,** н. у 1905, калгаснік. Рэпрэсіраваны 4.9.1937. Рэабілітаваны 5.9.1964.

**ЛАМАЧЭНКА Мікалай Аляксеевіч,** н. у 1891, калгаснік. Рэпрэсіраваны 4.9.1937. Рэабілітаваны 5.9.1964.

**МАЙСЕЕНКА Іван Іпалітавіч,** н. у 1894, расстраляны 28.9.1937. Рэабілітаваны 16.1.1989.

**МАЙСЕЕНКА Фёдар Іпалітавіч,** н. у 1900. Расстраляны 28.9.1937. Рэабілітаваны 16.1.1989.

**МЯДЗВЕДЗЕЎ Кандрат Лукіч,** н. у 1892. Рэпрэсіраваны 4.9.1937. Рэабілітаваны 5.9.1964.

**СІДАРЭНКА Аркадзь Еўдакімавіч,** н. у 1922, ваеннаслужачы. Рэпрэсіраваны 10.3.1943. Рэабілітаваны 27.3.1967.

### ВЁСКА ШАЛАМЫ

**БАРАШКОВА Ганна Уладзіміраўна,** н. у 1893. Рэпрэсіравана 14.5.1933. Рэабілітавана 31.10.1989.

**БАРАШКОЎ Мікіта Міхеевіч,** н. у 1890. Рэпрэсіраваны 14.5.1933. Рэабілітаваны 31.10.1989.

**ВАЛЧКОЎ Аўхім Іванавіч.** Рэпрэсіраваны ў 1931. Рэабілітаваны 28.9.1993.

## Адказ упраўлення КДБ па Магілёўскай вобласці на запытанне дачкі рэпрэсіраванага А.І.Валчкова ад 28.7.1993 г.

Могилевская область, г. Славгород, ул. Пономарева, д. 7, Фомченко А.Е.

Уважаемая Аксинья Ефимовна!

Ваше заявление о возмещении стоимости имущества, изъятого в связи с арестом Вашего отца, нами проверено и направлено для рассмотрения в Комиссию при Могилевском областном Совете народных депутатов по оказанию содействия в обеспечении прав жертв политических репресий 20 – 80 годов и увековечении их памяти. Высылаем Вам также сохранившуюся в архивных материалах фотографию Вашего отца.

Приложение: фотография на 2 листах.

Начальник подразделения УКГБ Н.И.Скоробогатов

**ГАРБУЗОВА Ульяна Уладзіміраўна,** н. у 1896. Рэпрэсіравана 14.5.1933. Рэабілітавана 31.10.1989.

**ГУТАРАЎ Дзмітрый Карпавіч,** н. у 1902. Рэпрэсіраваны 18.8.1937. Рэабілітаваны 26.5.1989.

**ГУТАРАЎ Мікіта Дзмітрыевіч,** н. у 1907. Рэпрэсіраваны 6.8.1937. Рэабілітаваны 26.5.1989.

**ГУТАРАЎ Пётр Захаравіч,** н. у 1895. Рэпрэсіраваны 14.5.1933. Рэабілітаваны 31.10.1989.

**ГУТАРАЎ Сяргей Міхайлавіч,** н. у 1903, намеснік старшыні калгаса «XVII партз'езд». Расстраляны 13.10.1938. Рэабілітаваны 25.4.1962.

**ЖАЛЕЗНЯКОВА Кацярына Міхайлаўна,** н. у 1888. Рэпрэсіравана 20.6.1938. Рэабілітавана 26.6.1966.

**ЖАЛЕЗНЯКОЎ Іван Антонавіч,** н. у 1905. Рэпрэсіраваны 2.12.1937. Рэабілітаваны 31.8.1989.

**ЖАЛЕЗНЯКОЎ Фама Аляксандравіч,** н. у 1873. Рэпрэсіраваны 14.5.1933. Рэабілітаваны 31.10.1989.

**ЖУРАЎКІН Сяргей Андрэевіч,** н. у 1888. Рэпрэсіраваны 14.5.1933. Рэабілітаваны 31.10.1989.

**ІЛЬЮШЧАНКА Павел Трыфанавіч,** н. у 1909. Рэпрэсіраваны 14.5.1933. Рэабілітаваны 31.10.1989.

**ІСАЕЎ Сцяпан Аляксеевіч,** н. у 1899 у в. Окра Чэрыкаўскага р-на. Рэпрэсіраваны 14.5.1933. Рэабілітаваны 31.10.1989.

**КАЗАКОЎ Сяргей Цітавіч,** н. у 1877. Рэпрэсіраваны 17.7.1937. Рэабілітаваны пасмяротна 26.6.1989.

**КРАЎЦОЎ Сямён Арцёмавіч,** н. у 1888. Рэпрэсіраваны 14.5.1933. Рэабілітаваны 31.10.1989.

**КРУГЛІКАЎ Дзмітрый Пятровіч,** н. у 1899. Рэпрэсіраваны 14.5.1933. Рэабілітаваны 31.10.1989.

**ЛАБЗЯНКОВА Марыя Сямёнаўна,** н. у 1908. Рэпрэсіравана 11.1.1938. Рэабілітавана 26.7.1966.

**ЛАБЗЯНКОЎ Кірыла Макаравіч,** н. у 1871. Рэпрэсіраваны 30.4.1937. Рэабілітаваны 17.8.1990.

**ЛАБЗЯНКОЎ Савелій Кірылавіч,** н. у 1904. Рэпрэсіраваны 14.5.1933. Рэабілітаваны 31.10.1989.

**МЕЛЬНІКАЎ Ягор Аксёнавіч,** н. у 1888. Рэпрэсіраваны 23.9.1932. Рэабілітаваны 20.4.1959.

### ЦЯЖКА БЫЦЬ СЫНАМ ВОРАГА НАРОДА

## З успамінаў жыхара г. Магілёва У.Я.Мельнікава

Здаецца, усё было добра ў жыцці нашай сям'і. Бацька займаў адказную пасаду ў раёне, маці настаўнічала і ганарылася, што менавіта яе, Еўдакію Архіпаўну, заўсёды называюць у ліку лепшых педагогаў. Мы з сястрой Зояй вучыліся ў школе. Нас усюды паважалі, у нас было шмат сяброў, не адчувалі мы і матэрыяльнай нястачы. І вось настаў той чорны дзень, калі ўсё раптам змянілася і лёс павярнуўся да нас самым цёмным сваім бокам.

Аднойчы не вярнуўся дадому бацька. Праз некаторы час апынулася без працы і маці, ад нас пачалі адхіствацца сябры, змянілася вакол нас атмасфера і ў школе. Напрыклад, мне, гледзячы на піянераў, вельмі хацелася надзець чырвоны гальштук, а я чуў у адказ: «Табе нельга». Чаму нельга? Гэта я зразумеў пазней, падрастаючы, калі ўсё часцей чуў у свой адрас: «Сын ворага народа» і адпаведна ўсё больш усведамляў, што азначае ў асабістым жыцці гэта вельмі цяжкае, а галоўнае — неабгрунтаванае кляймо. Я быў упэўнены, што не мог мой бацька, удзельнік Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі, здрадзіць Радзіме, якой ён ганарыўся, якой добрасумленна служыў. Але ж хто з гэтым тады лічыўся, каму была справа да нашых пакут, аб якіх нават зараз нельга ўспамінаць без пякучага болю.

Пазбавіцца б ад гэтага кляйма! З такой марай уваходзіў я ў жыццё. І вось, як здавалася мне, зручны момант надышоў.

Восенню 1943-га, адразу пасля вызвалення вёскі ад акупантаў, мяне прызвалі ў Чырвоную Армію. Калі пры гэтым спыталі пра бацьку, я адказаў, што ён памёр. І ўсё зноўку пайшло добра. Верагодна, таму што я да вайны скончыў 9 класаў, мяне накіравалі не на фронт, а ў 58-ы армейскі запасны полк вучыцца на сяржанта. Вучыўся я там добра, ды і з камандзірам мне пашанцавала. Камандзір батальёна маёр Чудзін чамусьці вельмі паважаў мяне. Але хутка яго прызначылі на вышэйшую пасаду. Надыходзіў час развітання. Аднойчы маёр прапанаваў мне: «Таварыш Мельнікаў, ёсць магчымасць стаць табе ваенным медыкам: да нас у полк прыехаў прадстаўнік вучылішча лейтэнант Бараноўскі, калі хочаш, ідзі да яго і афармляй дакументы. Я з вялікай радасцю згадзіўся. І хутка стаў курсантам 2-га Ленінградскага ваенна-медыцынскага вучылішча, якое знаходзілася ў г. Молатаве (цяпер г. Перм). Прайшоў месяц ці два, і мяне запрасілі ў кабінет, на дзверы якога з жахам паглядваў кожны курсант, калі даводзілася праходзіць міма. Са смуткам і заміраннем сэрца пераступіў я парог гэтага кабінета. За сталом сядзеў афіцэр, які пасля некалькіх дзяжурных фраз запытаў: «Вось вы тут у аўтабіяграфіі запісалі, што Ваш бацька памёр. Давайце ўдакладнім: дзе і калі ён памёр?» Перад афіцэрам ляжала афіцыйнае пісьмо са Слаўгарада. І я ўсё зразумеў. У мяне перахапіла дыханне, і я нічога не мог адказаць на зададзенае пытанне. Ды, відаць, і адказ тут быў непатрэбны.

А яшчэ праз некалькі дзён мяне выклікаў у капцёрку старшына і загадаў здымаць курсанцкую форму. Здавалася, разам з ёй я здымаў і сваю асабістую скуру, станавіўся зноў сынам ворага народа.

Ці трэба казаць, з якім хваляваннем я чытаў матэрыялы XX з'езда партыі аб кульце асобы Сталіна. Адразу ж у Маскву накіраваў пісьмо з доказам таго, што мой бацька стаў ахвярай менавіта гэтага культу. Праз некалькі тыдняў к нам дамоў з Мінска завітаў капітан — супрацоўнік КДБ. Размова з ім была добрая, даверлівая. Прывёз ён з сабой ліст, на падставе якога так страшна змяніўся лёс усёй нашай сям'і. Да болю, да слёз было цяжка даведацца, што напісалі гэты ліст трое шаламаўцаў і адзін бацькаў супрацоўнік, у тым ліку быў і наш родзіч, якога я потым лічыў ледзь не за бацьку. Як выцякала з гэтай бруднай паперы, галоўная правіннасць бацькі была ў тым, што ён меў чын штабс-капітана царскай арміі. «Што ж мне сказаць цяпер гэтым людзям, калі іх можна так назваць?» — сарвалася ў мяне з языка. «А яны ўсё, што заслугоўвалі, пачулі ад мяне», — адказаў капітан.

Як ад роднага бацькі, атрымаў я тады ад таго капітана (на жаль, не ведаю прозвішча) часцінку цяпла, дабрыні і чалавечнасці. Пасля яго ад'езду ў Мінск не прымусілі сябе доўга чакаць і паперы аб поўнай рэабілітацыі бацькі. Шкада, што была яна пасмяротнай.

*Запісаў П.С.Ерашэнка.*

**НІКАЛАЕНКА Фёдар Раманавіч,** н. у 1906, ляснік. Рэпрэсіраваны 21.10.1948. Рэабілітаваны 11.12.1954.

**НІКІЦЕНКА Сяргей Сямёнавіч,** н. у 1903. Рэпрэсіраваны 25.12.1932, расстраляны. Рэабілітаваны 16.1.1989.

**РОНДАЛЕЎ Архіп Сямёнавіч,** н. у 1875. Расстраляны 28.9.1937. Рэабілітаваны 26.6.1989.

**СЦЕПАНЕНКА Пётр Уладзіміравіч,** н. у 1885. Рэпрэсіраваны 14.5.1933. Рэабілітаваны 31.10.1989.

**СЦЕПАНЕНКА Уладзімір Фёдаравіч,** н. у 1859. Рэпрэсіраваны 6.8.1937. Рэабілітаваны 22.5.1959.

**ШЫКАЎ Павел Тарасавіч,** н. у 1907 у в. Хоцішча. Расстраляны 28.3.1933. Рэабілітаваны 5.8.1960.

**ЯКАВЕНКА Цімафей Сяргеевіч,** н. у 1886 у в. Васькавічы Прапойскага р-на. Рэпрэсіраваны 6.8.1937. Рэабілітаваны 22.5.1959.

**ЯШКІН Міхаіл Паўлавіч,** н. у 1891. Рэпрэсіраваны 5.9.1937. Рэабілітаваны 22.5.1959.

## ГІЖЭНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

### ВЁСКА АЛЯКСАНДРАЎКА

**КАЧАНАЎ Іван Маркавіч,** н. у 1874, калгаснік. Расстраляны 15.10.1937. Рэабілітаваны 20.11.1989.

**КЛІМЯНКОЎ Іван Фролавіч,** н. у 1901, калгаснік. У 1933 «тройкай» АДПУ па БССР высланы на Поўнач. Рэабілітаваны ў 1962.

### ВЁСКА БЯРОЗАЎКА

**АНІШЧАНКА Ігнат Лявонавіч,** н. у 1873. Рэпрэсіраваны 26.3.1933. Рэабілітаваны 9.11.1989.

**АФАНАСЬЕЎ Панцялей Кірылавіч,** н. у 1878. Рэпрэсіраваны 26.3.1933. Рэабілітаваны 9.11.1989.

**ВОРАНАВА Марыя Пятроўна,** н. у 1905. Рэпрэсіравана ў 1932. Рэабілітавана 19.5.1993.

**ВОРАНАВА Таццяна Лазараўна,** н. у 1926. Рэпрэсіравана ў 1932. Рэабілітавана 19.5.1993.

**ВОРАНАЎ Адам Лазаравіч,** н. у 1922. Рэпрэсіраваны ў 1932. Рэабілітаваны 19.5.1993.

**ГАРЭЛІКАВА Кацярына Іванаўна,** н. у 1876, калгасніца. Рэпрэсіравана 10.11.1932. Рэабілітавана 16.1.1989.

**КУЛЯШОЎ Рыгор Рыгоравіч,** н. у 1885. Рэпрэсіраваны 10.11.1932. Рэабілітаваны 16.1.1989.

**ЛЫСІКАЎ Захар Сяргеевіч,** н. у 1886. Рэпрэсіраваны 5.11.1937. Рэабілітаваны 16.1.1989.

**ВЁСКА ГІЖЭНКА**

**БЯСПАЛАЎ Гаўрыла Васільевіч,** н. у 1886 у в. Дзяніскавічы, настаўнік. Рэпрэсіраваны 25.3.1933. Рэабілітаваны 16.1.1989.

**ЗЯЦЬКОВА Алена Андрэеўна,** н. у 1916 у м. Прапойск, настаўніца Гіжэнкаўскай НСШ. Рэпрэсіравана 17.2.1937. Рэабілітавана 14.3.1937.

**ЛАЎРЫНЕНКАВА Матрона Аўрамаўна,** н. у 1892, калгасніца. Рэпрэсіравана 2.12.1937. Рэабілітавана 21.11.1989.

**САВОСЦІН Аўрам Міхайлавіч,** н. у 1857. Расстраляны 28.1.1938. Рэабілітаваны 21.11.1989.

**ВЁСКА ДАШКАЎКА**

**ГРУДЗІНА Аляксандр Васільевіч,** брыгадзір калгаса «Ленінскі шлях». Расстраляны 6.8.1937. Рэабілітаваны 9.8.1988.

**ЕЛЕНСКІ Адам Мікалаевіч,** н. у 1902, калгаснік. Расстраляны 10.1.1938. Рэабілітаваны 25.12.1973.

**ЕЛЕНСКІ Антон Вікенцьевіч,** н. у 1901, калгаснік. Расстраляны 19.2.1938. Рэабілітаваны 24.12.1957.

**ЕЛЕНСКІ Міхаіл Цімафеевіч,** н. у 1884, калгаснік. Расстраляны 19.2.1938. Рэабілітаваны 16.1.1989.

**КАРЫТКА Аляксандр Аляксандравіч,** н. у 1903, калгасны каваль. Рэпрэсіраваны 6.9.1937. Рэабілітаваны 11.9.1959.

**ПАНФІЛОВІЧ Іван Феліксавіч,** н. у 1896, калгаснік калгаса «Ленінскі шлях». Расстраляны 19.3.1938. Рэабілітаваны 16.1.1989.

**ПАНФІЛОВІЧ Франц Феліксавіч,** н. у 1894, селянін-аднаасобнік. У 1933 асуджаны на 5 гадоў. Рэабілітаваны ў 1962.

**ПУЦЯТА Віталь Паўлавіч,** н. у 1885. Рэпрэсіраваны 25.2.1934. Рэабілітаваны 11.9.1989.

**ПУЦЯТА Уладзімір Паўлавіч,** н. у 1892. Расстраляны 10.3.1938. Рэабілітаваны 16.1.1989.

**ВЁСКА ЗАБАЛАЦЦЕ**

**ІВАНОЎ Адам Іванавіч,** н. у 1895, калгаснік. У 1932 асуджаны на 10 гадоў. Рэабілітаваны ў 1963.

**БУДАЕЎ Дзмітрый Фаміч,** н. у 1897. Рэпрэсіраваны 9.5.1935. Рэабілітаваны 22.9.1989.

**ВЁСКА ЗАГЛІННАЕ**

**ВАСІЛЬКОЎ Павел Емяльянавіч,** н. у 1890. Рэпрэсіраваны 18.9.1937. Рэабілітаваны 25.5.1989.

**ГРЫШКІН Васіль Карнеевіч,** н. у 1886. Рэпрэсіраваны 9.4.1932. Рэабілітаваны 12.9.1989.

**ЗЯТКІН Давыд Патапавіч,** н. у 1897, калгаснік. Рэпрэсіраваны 17.7.1937. Рэабілітаваны 16.1.1989.

**КУЗЬМЯНКОЎ Арцём Іванавіч,** н. у 1890. Рэпрэсіраваны 18.9.1937, памёр у лагеры 8.1.1942. Рэабілітаваны 6.6.1942.

**ВЁСКА ЛЮБАНЫ**

**ДЗЮБАК Рыгор Максімавіч,** н. у 1870. Рэпрэсіраваны 6.9.1937. Рэабілітаваны 26.4.1989.

**ЖУРАЎКОЎ Тарас Пятровіч,** н. у 1870, калгаснік. Рэпрэсіраваны 6.9.1937. Рэабілітаваны 26.4.1989.

**ЛЯПЁШКІН Аляксандр Восіпавіч,** н. у 1907 у Мінску, старшыня калгаса «Бальшавік». Рэпрэсіраваны 12.7.1938. Рэабілітаваны 7.2.1939.

**МАЛЯРОВА Ніна Аўрамаўна,** н. у 1920, акушэрка. Рэпрэсіравана 29.4.1945. Рэабілітавана 24.4.1946.

**ВЁСКА ЛЯЦЯГІ**

**ВАСІЛЕНКА Іван Мікітавіч,** н. у 1883 у в. Борчынічы. Рэпрэсіраваны 10.11.1932. Рэабілітаваны 16.1.1989.

**ДЗЯТЛАЎ Павел Захаравіч,** н. у 1893. Рэпрэсіраваны 10.11.1932. Рэабілітаваны 16.1.1989.

**ЕМЯЛЬЯНАЎ Канстанцін Пятровіч,** н. у 1895, калгаснік. Рэпрэсіраваны 10.11.1938. Рэабілітаваны 16.1.1989.

**КАВАЛЁВА Матрона Максімаўна,** н. у 1883, калгасніца. Рэпрэсіравана 10.11.1932. Рэабілітавана 16.1.1989.

**КАВАЛЁЎ Аляксандр Пятровіч,** н. у 1908. Рэпрэсіраваны 26.3.1933. Рэабілітаваны 16.4.1993.

**КАВАЛЁЎ Андрэй Савельевіч.** Рэпрэсіраваны ў 1930. Рэабілітаваны 16.4.1993.

**КАВАЛЁЎ Емяльян Лявонавіч,** н. у 1884. Рэпрэсіраваны 10.11.1932. Рэабілітаваны 16.1.1989.

**КАВАЛЁЎ Трафім Лявонавіч,** н. у 1883, калгаснік. Рэпрэсіраваны 6.9.1937. Рэабілітаваны 26.10.1937.

**КАРНЕЕЎ Арцём Васільевіч.** Рэпрэсіраваны ў 1931. Рэабілітаваны 24.7.1993.

**КУЛЯШОЎ Рыгор Рыгоравіч,** н. у 1884, калгаснік. Рэпрэсіраваны 8.9.1937. Рэабілітаваны 20.6.1989.

**НОВІКАЎ Васіль Іванавіч,** н. у 1910. Рэпрэсіраваны 10.11.1932. Рэабілітаваны 16.1.1989.

**НОВІКАЎ Іван Давыдавіч,** н. у 1884. Рэпрэсіраваны 11.11.1932. Рэабілітаваны 16.1.1989.

**ПАВЕТКІН Рыгор Васільевіч,** н. у 1900, калгаснік калгаса «Чырвоны ўдарнік». Рэпрэсіраваны 10.11.1932. Рэабілітаваны 16.1.1989.

**САЗОНАЎ Васіль Іванавіч,** н. у 1874. Рэпрэсіраваны 26.3.1933. Рэабілітаваны 9.11.1989.

**САЗОНАЎ Карп Фядосавіч,** н. у 1885. Рэпрэсіраваны 10.11.1932. Рэабілітаваны 16.1.1989.

**САЗОНАЎ Пракоп Фядосавіч,** н. у 1891. Рэпрэсіраваны 10.11.1932. Рэабілітаваны 16.1.1989.

**САЗОНАЎ Фама Фядосавіч,** н. у 1888. Рэпрэсіраваны 10.11.1932. Рэабілітаваны 16.1.1989.

### ВЁСКА РУДНЯ

**БАРСУКОЎ Франц Аляксандравіч,** н. у 1905. Расстраляны 22.11.1937. Рэабілітаваны 25.12.1973.

**ГРАМЫКА Рыгор Канстанцінавіч,** н. у 1874 у в. Грамыкі Веткаўскага р-на Гомельскай вобл., калгаснік. Рэпрэсіраваны 31.10.1937. Рэабілітаваны 16.1.1989.

**ГУКАВА Варвара Рыгораўна,** н. у 1906. Рэпрэсіравана ў 1930. Рэабілітавана 26.1.1993.

**ГУКАВА Еўдакія Кузьмінічна,** н. у 1867. Рэпрэсіравана ў 1930. Рэабілітавана 26.1.1993.

**ГУКАВА Кацярына Мікалаеўна,** н. у 1928. Рэпрэсіравана ў 1930. Рэабілітавана 26.1.1993.

**ГУКАВА Марыя Іванаўна,** н. у 1919. Рэпрэсіравана ў 1930. Рэабілітавана 26.1.1993.

**ГУКАЎ Іван Сямёнавіч,** н. у 1867. Рэпрэсіраваны ў 1930. Рэабілітаваны 26.1.1993.

**ГУКАЎ Ігнат Іванавіч,** н. у 1912. Рэпрэсіраваны ў 1930. Рэабілітаваны 26.1.1993.

**ГУКАЎ Макар Іванавіч,** н. у 1914. Рэпрэсіраваны ў 1930. Рэабілітаваны 26.1.1993.

**ГУКАЎ Мікалай Іванавіч,** н. у 1906. Рэпрэсіраваны ў 1930. Рэабілітаваны 26.1.1993.

**ГУКАЎ Ягор Іванавіч,** н. у 1909. Рэпрэсіраваны ў 1930. Рэабілітаваны 26.1.1993.

**ГУТКОВА Таццяна Фёдараўна,** н. у 1916. Рэпрэсіравана ў 1930. Рэабілітавана 26.1.1993.

**ГУТКОЎ Фёдар Мікалаевіч,** н. у 1924. Рэпрэсіраваны ў 1930. Рэабілітаваны 26.1.1993.

**ДРАБЫШЭЎСКІ Мікалай Ільіч,** н. у 1884. Расстраляны 30.9.1937. Рэабілітаваны 16.1.1989.

**ПАЛТАРАЦКІ Лука Макаравіч,** н. у 1893. Рэпрэсіраваны 19.3.1933. Рэабілітаваны 16.11.1989.

**ПАЛТАРАЦКІ Марк Макаравіч,** н. у 1882 у в. Свяцілавічы, цясляр. Рэпрэсіраваны 6.8.1937. Рэабілітаваны 20.10.1956.

**ПСЕЎКІН Рыгор Фёдаравіч,** н. у 1897 у в. Сняжкова Гомельскай вобл. Рэпрэсіраваны 20.3.1933. Рэабілітаваны 16.1.1989.

### ВЁСКА ТРАСЛІЎКА

**ІВАНОЎСКІ Адам Пятровіч,** н. у 1900, калгаснік. Расстраляны 14.1.1938. Рэабілітаваны 15.9.1958.

**ІВАНОЎСКІ Іван Пятровіч,** н. у 1891, калгаснік. Расстраляны 14.1.1938. Рэабілітаваны 17.9.1955.

**ІВАНОЎСКІ Міхаіл Пятровіч,** н. у 1893, калгаснік. Расстраляны 14.3.1938. Рэабілітаваны 17.9.1958.

**ІВАНОЎСКІ Уладзімір Пятровіч,** н. у 1904, старшыня калгаса. Расстраляны 17.3.1938. Рэабілітаваны 17.9.1958.

**МАЛАТКОЎ Фёдар Рыгоравіч,** н. у 1881, працаваў на смалакурным заводзе ў г. Чэрыкаў. Рэпрэсіраваны 10.10.1932. Рэабілітаваны 22.6.1989.

### ВЁСКА УСОХІ

**ЦІТОЎ Герасім Ісаевіч,** н. у 1897. Рэпрэсіраваны 26.4.1933. Рэабілітаваны 16.1.1989.

**ЦІТОЎ Міхаіл Нічыпаравіч,** н. у 1902, калгаснік калгаса «Спартак». Рэпрэсіраваны 26.4.1933. Рэабілітаваны 16.1.1989.

### ВЁСКА ХОДАРАЎ

**СВІРЫДАЎ Сяргей Іванавіч,** н. у 1874, калгаснік. Рэпрэсіраваны ў 1932. Рэабілітаваны ў 1962.

### ВЁСКА ЦЕЛЯШЫ

**КАВАЛЁВА Матруна Церахаўна.** Рэпрэсіравана ў 1930. Рэабілітавана 12.1.1994.

**ОСІПАЎ Мікалай Іванавіч,** н. у 1902, чырвонаармеец. Расстраляны 9.9.1941. Рэабілітаваны 22.11.1982.

**САВАСЦЬЯНАЎ Мірон Кірэевіч,** н. у 1875. Рэпрэсіраваны 19.6.1932. Рэабілітаваны 10.8.1989.

**СТАРАВОЙТАЎ Даніла Маркавіч,** н. у 1877. Рэпрэсіраваны 15.4.1932, памёр у турме 12.6.1938. Рэабілітаваны 31.8.1989.

## КАМЕНКАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

### ВЁСКА БЛАГАДАЦЬ

**ХЛЫСТОЎ Малах Несцеравіч,** н. у 1886. Рэпрэсіраваны 6.8.1937. Рэабілітаваны 20.7.1989.

### ВЁСКА ДУБНА

**ДАМАРОСЛАЎ Юрый Фёдаравіч,** н. у 1892, калгаснік. Рэпрэсіраваны 31.10.1937. Рэабілітаваны 9.11.1989.

**МІРОНАЎ Сямён Сафронавіч,** н. у 1876. Рэпрэсіраваны 18.9.1937. Рэабілітаваны 6.6.1989.

**ХЛЫСТОЎ Аляксей Трыфанавіч,** н. у 1870, калгаснік. Рэпрэсіраваны 5.11.1937. Рэабілітаваны 20.11.1989.

### ВЁСКА КАЗАКОЎКА

**ГАРАДЗЕЦКІ Міхаіл Васільевіч,** н. у 1882. Рэпрэсіраваны 23.4.1933. Рэабілітаваны 29.9.1989.

### ВЁСКА КАМЕНКА

**ДВАРАНКІН Мяфёд Сямёнавіч,** н. у 1877. Расстраляны 19.9.1937. Рэабілітаваны 17.11.1989.

**НІКАЛАЕНКА Азар Майсеевіч,** н. у 1881 у в. Новая Каменка. Рэпрэсіраваны 31.10.1937. Рэабілітаваны 10.10.1989.

**НІКАЛАЕНКА Емяльян Міронавіч,** н. у 1899. Рэпрэсіраваны 13.9.1937. Рэабілітаваны 6.10.1956.

**НІКАЛАЕНКА Пракоп Міронавіч,** н. у 1887, калгаснік. З кастрычніка 1943 па кастрычнік 1944 у Чырвонай Арміі, радавы. Рэпрэсіраваны 23.12.1944. Рэабілітаваны 19.10.1990.

**ПАБОРЦАЎ Тарас Сцяпанавіч,** н. у 1878. Расстраляны 1.10.1937.

**СУГАЧКОЎ Філімон Парфенавіч,** н. у 1881. Рэпрэсіраваны 26.9.1937. Рэабілітаваны 3.10.1989.

**ЦАРАЎ Кірыла Ерамеевіч,** н. у 1887. Расстраляны 10.10.1937.

**ЮРЧАНКА Рыгор Панкратавіч,** н. у 1883, калгаснік. Рэпрэсіраваны 11.1.1938. Расстраляны 1.4.1938. Рэабілітаваны 19.9.1989.

**ЮРЧАНКА Рыгор Цімафеевіч,** н. у 1883. Расстраляны 1.4.1938.

### ВЁСКА КЛІНЫ

**АНЦІПЕНКА Іван Фролавіч,** н. у 1896. Рэпрэсіраваны 18.7.1937. Рэабілітаваны 12.5.1989.

## КУЛЬШЫЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

### ВЁСКА ДУБРОЎКА

**ШУБАДЗЁРАЎ Васіль Аляксандравіч,** н. у 1896. Расстраляны 3.4.1933. Рэабілітаваны 16.1.1989.

### ВЁСКА ЖАРОЛЫ

**ПАДСЫПАННІКАВА Фёкла Антонаўна,** н. у 1882, манашка. Рэпрэсіравана 2.12.1937. Рэабілітавана 16.1.1989.

### ВЁСКА ЗАПАЛЯННЕ

**АЛЯКСЕЙЧЫКАВА Алена Трафімаўна.** Рэпрэсіравана ў 1931. Рэабілітавана 2.6.1992.

**КАЛГАНАВА Ксенія Рыгораўна.** Рэпрэсіравана ў 1931. Рэабілітавана 2.6.1992.

**КАЛГАНАЎ Валянцін Трафімавіч.** Рэпрэсіраваны ў 1931. Рэабілітаваны 2.6.1992.

**КАЛГАНАЎ Трафім Апанасавіч.** Рэпрэсіраваны ў 1931. Рэабілітаваны 2.6.1992.

### ВЁСКА КУЛІКОЎКА

**МАРОЗАЎ Віктар Рыгоравіч,** н. у 1925 у в. Боркі Чэрыкаўскага р-на. Рэпрэсіраваны 24.6.1949. Рэабілітаваны 2.12.1960.

**ШАНЯЎСКІ Эварыст Фердзінандавіч,** н. у 1882. Рэпрэсіраваны 7.9.1937, расстраляны 27.9.1937. Рэабілітаваны 5.10.1989.

### ВЁСКА КУЛЬШЫЧЫ

**АСТАПЕНКА Захар Аляксеевіч,** н. у 1881. Рэпрэсіраваны 31.10.1937. Рэабілітаваны 29.9.1989.

**БАРСУКОЎ Ісак Іванавіч,** н. у 1902, калгаснік. Рэпрэсіраваны 29.6.1933. Рэабілітаваны 16.1.1989.

**ДАВЫДАЎ Міхаіл Макаравіч,** н. у 1885, калгаснік. Арыштаваны 18.9.1937, расстраляны 11.10.1937. Рэабілітаваны 16.1.1989.

**ЕЎДАКІМАЎ Міхаіл Сяргеевіч,** н. у 1889. Рэпрэсіраваны ў 1933. Рэабілітаваны 16.1.1989.

**ЖУКАЎ Карп Панфілавіч,** н. у 1893. Рэпрэсіраваны 29.6.1933. Рэабілітаваны 16.1.1989.

**КАЗЛОЎ Цярэнцій Пахомавіч.** Рэпрэсіраваны 30.1.1933. Рэабілітаваны 25.5.1933.

**КАРЖОЎ Касьян Іванавіч,** н. у 1896. Рэпрэсіраваны 29.6.1933. Рэабілітаваны 16.1.1989.

**КЛІМАЎ Аўхім Андрэевіч,** н. у 1902. Рэпрэсіраваны 25.11.1944. Рэабілітаваны 31.10.1956.

**КЛІМАЎ Сцяфан Нікадзімавіч,** н. у 1877, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 27.12.1929. Рэабілітаваны 6.3.1930.

**КОНТАЎТ Альберт Аляксандравіч,** н. у 1862. Расстраляны 22.2.1930. Рэабілітаваны 14.6.1989.

**КОНТАЎТ Станіслаў Альбертавіч,** н. у 1895. Расстраляны 11.10.1937. Рэабілітаваны 14.6.1989.

**КУДЛАЕЎ Якаў Арцёмавіч,** н. у 1888. Рэпрэсіраваны ў 1932. Рэабілітаваны 12.11.1933.

**КУРАНЦОЎ Міхаіл Яўменавіч,** н. у 1888. Рэпрэсіраваны 24.6.1933. Рэабілітаваны 16.1.1989.

**ЛЫСЯНКОЎ Піліп Мартынавіч,** н. у 1873. Рэпрэсіраваны 11.5.1932. Рэабілітаваны 30.8.1989.

**МАКСІМАЎ Фёдар Сцяпанавіч,** н. у 1871. Рэпрэсіраваны 28.1.1933. Рэабілітаваны 16.1.1989.

**МАРОЗАЎ Герасім Варфаламеевіч,** н. у 1865. Расстраляны 22.2.1930. Рэабілітаваны 10.2.1962.

**МАРОЗАЎ Еўдакім Герасімавіч,** н. у 1902, калгаснік. Рэпрэсіраваны 29.6.1933. Рэабілітаваны 16.1.1989.

**ПІСАРАЎ Міхаіл Харытонавіч,** н. у 1905, калгаснік, Рэпрэсіраваны 29.6.1933. Рэабілітаваны 16.1.1989.

**СЕРБАЎ Андрэй Іванавіч,** н. у 1878. Рэпрэсіраваны 29.11.1937. Рэабілітаваны 31.8.1989.

**СЕРБАЎ Іван Аляксандравіч,** н. у 1891, калгаснік. Рэпрэсіраваны 29.6.1933. Рэабілітаваны 16.1.1989.

**СЕРБАЎ Фёдар Аляксандравіч,** н. у 1905. Рэпрэсіраваны 29.6.1932. Рэабілітаваны 16.1.1989.

**СЛАДЗІКАЎ Дэмітрый Еўдакімавіч,** н. у 1878. Расстраляны 22.10.1937. Рэабілітаваны 30.9.1989.

**ХІЛЬКЕВІЧ Арцём Захаравіч,** н. у 1888. Рэпрэсіраваны 29.6.1933. Рэабілітаваны 16.1.1989.

**ХІЛЬКЕВІЧ Захар Несцеравіч,** н. у 1865. Расстраляны 22.10.1937. Рэабілітаваны 16.1.1989.

**ХІЛЬКЕВІЧ Карп Захаравіч,** н. у 1907. Рэпрэсіраваны 29.4.1934. Рэабілітаваны 16.1.1989.

**ШАБЛОЎСКІ Міхаіл Васільевіч,** н. у 1909. Расстраляны 3.12.1937.

**ШАНЯЎСКІ Эверэст Фердзінандавіч,** н. у 1882. Расстраляны 28.9.1937.

**ЯКУШЭНКА Сяргей Міхайлавіч,** н. у 1888 у в. Папараткі, старшыня калгаса «Камунар». Расстраляны 2.4.1938. Рэабілітаваны 13.1.1962.

### ПАСЁЛАК КУРГАННЕ

**ШАБУСАЎ Іларыён Нічыпаравіч,** н. у 1901. Рэпрэсіраваны 2.3.1930. Рэабілітаваны 10.2.1962.

### ВЁСКА ПРЫВОЛЛЕ

**МАЦЮШАЎ Мікалай Іванавіч.** Рэпрэсіраваны ў 1930. Рэабілітаваны 30.4.1993.

### ВЁСКА ПЧЭЛЬНЯ

**СОКАЛАЎ Фёдар Фаміч,** н. у 1874. Расстраляны 22.10.1937. Рэабілітаваны 30.9.1989.

### ВЁСКА РАБІНАЎКА

**АНІШЧАНКА Аўхім Аляксеевіч,** н. у 1899, калгаснік. Рэпрэсіраваны 4.9.1937. Рэабілітаваны 14.11.1964.

**АРЛОЎ Захар Паўлавіч,** н. у 1890, калгаснік. Рэпрэсіраваны 30.12.1932. Рэабілітаваны 5.9.1964.

**АРЛОЎ Кліменцій Міхайлавіч,** н. у 1911. Рэпрэсіраваны 28.11.1937. Рэабілітаваны 8.6.1965.

**БОРЫКАЎ Напрэй Восіпавіч,** н. у 1899, калгаснік. Рэпрэсіраваны 30.12.1932. Рэабілітаваны 5.9.1954.

**БОРЫКАЎ Сямён Цітавіч,** н. у 1888. Расстраляны 29.9.1937. Рэабілітаваны 3.10.1983.

**ВАРАНЦОВА Анастасія Ануфрыеўна,** н. у 1921, калгасніца. Рэпрэсіравана ў 1944. Рэабілітавана ў 1946.

**ГЕРАШЧАНКА Пётр Міхайлавіч,** н. у 1883, калгаснік. Рэпрэсіраваны 30.12.1932. Рэабілітаваны 5.9.1954.

**ГРЫНЕВІЧ Міхаіл Пятровіч,** н. у 1872, калгаснік. Рэпрэсіраваны 30.12.1932. Рэабілітаваны 5.9.1964.

**ГРЫНЕВІЧ Ягор Пятровіч,** н. у 1887. Рэпрэсіраваны 30.12.1932. Рэабілітаваны 5.9.1964.

**ІВАНЬКОЎ Ігнат Іванавіч,** н. у 1898, калгаснік. Рэпрэсіраваны 30.12.1932. Рэабілітаваны 5.9.1964.

**МАРЧАНКА Андрэй Яўсеевіч,** н. у 1910, калгаснік. Рэпрэсіраваны 30.12.1932. Рэабілітаваны 5.9.1964.

**МАРЧАНКА Апанас Яўсеевіч,** н. у 1896. Рэпрэсіраваны 30.12.1932. Рэабілітаваны 5.9.1964.

**НІКІЦЕНКА Кірэй Фядосавіч,** н. у 1892, калгаснік. Рэпрэсіраваны 30.12.1932. Рэабілітаваны 5.9.1964.

**НІКІЦЕНКА Максім Валянцінавіч,** н. у 1895. Рэпрэсіраваны 18.9.1937. Рэабілітаваны 22.9.1989.

**НІКІЦЕНКА Піліп Рыгоравіч,** н. у 1908, калгаснік. Рэпрэсіраваны 30.12.1932. Рэабілітаваны 5.9.1964.

